Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 18 студзеня 1985 г. № 3 (3257) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.



Сяброўкі.

Удзельніцы мастацкай самадзейнасці калгаса імя Леніна Нясвіжскага раёна Тамара Ломская і Руслана Бейня.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

ВЫСОКІ ДАВЕР

У рэспубліцы працягваецца вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў.

Хлебаробы калгаса «Шлях да камунізму» Столінскага раёна вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Столінскай выбарчай акрузе міністра культуры БССР Юрыя Міхайлавіча Міхневіча.

Сход калектыву Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты вышэйшага органа дзяржаўнай улады рэспублікі па Мазырскай—Заходняй выбарчай акрузе віцэ-прэзідэнта АН БССР Івана Якаўлевіча Навуменку.

Народны пісьменнік Беларусі Васіль Уладзіміравіч Быкаў на агульным сходзе працаўнікоў калгаса «Новае жыццё» Жыткавіцкага раёна названы кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета рэспублікі па Тураўскай выбарчай акрузе.

Калектыў мінскай кандытарскай фабрыкі «Камунарка» назваў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Ванееўскай выбарчай акрузе народнага мастака СССР Міхаіла Андрэевіча Савіцкага.

Старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР Ігар Міхайлавіч Лучанок вылучан калектывам мінскай гарадской паліклінікі № 22 кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Галадзедаўскай выбарчай акрузе.

ПІСЬМЫ У. І. ЛЕНІНА ДА РОДНЫХ

Сярод эпісталярнай спадчыны У. І. Леніна асаблівае месца належыць яго пісьмам да родных. Яны складаюць апошні, завяршальны том Поўнага збору твораў правадыра, у які ўваходзіць каля 300 дакументаў. Для выдання «Пісьмы Уладзіміра Ільіча Леніна да родных», якое выйшла ў свет, адабраны толькі некаторыя, але вельмі характэрныя пісьмы да блізкіх, напісаныя са ссылкі і эміграцыі (1897—1916 гады).

Гэта не толькі часцінка біяграфіі правадыра сацыялістычнай рэвалюцыі, кіраўніка першай у свеце дзяржавы рабочых і сялян, але і часцінка гісторыі нашай партыі. 65 пісем У. І. Леніна, якія ўвайшлі ў кнігу, з выключнай сілай раскрываюць шматгранны вобраз самага чалавечнага чалавека, змяшчаюць водгукі на ўсе вострыя, актуальныя пытанні тагачаснага палітычнага жыцця і барацьбы.

Пісьмы Уладзіміра Ільіча Леніна да родных выйшлі ў Выдавецтве палітычнай літаратуры трэцім выданнем.

ТАСС.

СТАРОНКІ БАЯВОГА ЛЕТАПІСУ

Прэм'ера дакументальнага фільма «Застава маладосці» адбылася 14 студзеня ў сталічным кінатэатры імя Массавета. Новая карціна, створаная на студыі «Казахфільм», расказвае аб слаўным шляху чырванасцяжнага пагранатрада, які стаіць на варце паўднёва-ўсходніх рубяжоў нашай краіны.

Шматлікія дакументы, фатаграфіі, кінакадры знаёмяць гледачоў з 60-гадовай гісторыяй атрада, які з'яўляецца правафланговым сацыялістычнага спаборніцтва войск Чырванасцяжнай Усходняй пагранічнай акругі. Тут прайшлі школу мужнасці і палітычнай сталасці многія тысячы абаронцаў Радзімы.

Наследнікі баявой славы старэйшых пакаленняў ганарацца тым, што ў атрадзе ў пачатку 30-х гадоў служыў таварыш К. У. Чарненка, які прыбыў сюды ў ліку пятнаццаці тысяч добраахвотнікаў камсамольскага прызыву. На граніцы Канстанцін Усцінавіч быў прынят у рады Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, выбіраўся сакратаром партыйнай арганізацыі атрада. З таго часу партыйная работа стала сэнсам і прызваннем усяго яго жыцця.

Аб гадах сумеснай службы з таварышам К. У. Чарненкам, аб тым, якім вялікім аўтарытэтам і павагай карыстаўся ён у пагранічнікаў, расказваюць з экрана старшыня калгаса «40 гадоў Кастрычніка» М. М. Галавацкі, старшы інспектар паляўніцтва Г. А. Конеў, іншыя ветэраны, якія служылі на заставе.

Слаўныя традыцыі воінаў 30-х гадоў захоўвае і прымнажае сённяшняе пакаленне маладых пагранічнікаў. Яны бязмежна адданыя справе партыі, сацыялістычнай Айчыне, справе сваіх бацькоў і дзядоў.

ДВУХТЫСЯЧНАЕ ВЫСТУПЛЕННЕ

Перад навучэнцамі Валожынскага сельскага прафесійна-тэхнічнага вучылішча № 58 меліяратараў нядаўна выступіла агітацыйна-мастацкая брыгада абласнога таварыства кнігалюбаў. Адказны сакратар гэтага таварыства Н. Балукова прачытала даклад на тэму: «Паэзія гадоў Вялікай Айчыннай вайны», а потым адбыўся канцэрт.

Для слухачоў ён быў звычайны, якіх у вучылішчы арганізоўваецца шмат, а вось для ўдзельнікаў агітбрыгады юбілейны — двухтысячны: столькі выступленняў зроблена з дня арганізацыі таварыства кнігалюбаў.

З агітбрыгадай неаднаразова выязджалі пісьменнікі Н. Гілевіч, М. Герчык, М. Кругавых, У. Паўлаў і іншыя.

Толькі летась агітбрыгада выступіла перад працаўнікамі Міншчыны 170 разоў, на кожным канцэрце прысутнічала не менш чым 250 чалавек.

Такія агітацыйна-мастацкія брыгады створаны і ў некаторых раёнах Міншчыны.

У. АНТОНАЎ.

З ВЯЛІКІМ ПОСПЕХАМ

Пад дэвізам «Вайна раніць кожнага ў самае сэрца» з вялікім поспехам праходзіць у Заходнім Берліне сумесная выстаўка майстроў выяўленчага мастацтва з Савецкай Беларусі і Заходняга Берліна. У памяшканні шонебергскай ратушы дэманструюцца 160 работ 34 савецкіх і 43 заходнеберлінскіх мастакоў і графікаў.

Асноўная тэма гэтай экспазіцыі, арганізаванай напярэдадні 40-й гадавіны Перамогі над гітлераўскай Германіяй і вызвалення народаў ад фашысцкага іга, — страсны заклік да барацьбы за мір, супраць пагрозы новай вайны.

АБ'ЯДНАЛА ЗАХАПЛЕННЕ

Да 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне праходзіць агляд мастацкай самадзейнасці працоўных г. Мінска — у рамках Усесаюзнага агляду. Адкрылі яго ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Кастрычніцкага раёна сталіцы. Песні і танцы, аркестравыя нумары і вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі гучалі са сцэны Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў імя Ільіча.

Першае месца і званне лаўрэата атрымалі студыя пантамімы, цыркавая студыя і чытальнік Валерый Кашчэеў (усе — з Палаца культуры чыгуначнікаў).

Другое месца занялі: ансамбль народнай песні, вакальны ансамбль пад кіраўніцтвам У. Лішанскага і дзіцячы танцавальны калектыў (усе таксама з Палаца культуры чыгуначнікаў).

Трэцяе месца прысуджана хору народнай песні завода «Транзістар», танцавальнаму калектыву і вакальнаму ансамблю пад кіраўніцтвам У. Шаўчэнкі (ВА «Інтэграл»), вакальна-інструментальнаму ансамблю Мінскага аб'яднанага авіяатрада.

Заахвочвальных узнагарод удастоены: вакальны дуэт Н. Шумчанка і Н. Шкор (ВА «Інтэграл»), дзіцячы духавы аркестр (Палац культуры чыгуначнікаў) і сямейны ансамбль Чухновых.

М. ВАСІЛЕЎСКАЯ.

ГЭТА ПРАДБАЧЫЎ ЛЕНІН

Ужо некалькі месяцаў група творчага аб'яднання «Летапіс» студыі «Беларусьфільм» на чале з рэжысёрам Ю. Цвятковым працуе над гісторыка-рэвалюцыйным дакументальным фільмам пад умоўнай назвай «Без гэтага мы не маглі б перамагчы» (аўтары сцэнарыя У. Мехаў і Ю. Цвяткоў).

Беларускія кінематаграфісты за гэты час пабылі ў многіх кутках краіны — у Прыбалтыцы, на Гродзеншчыне, у Маскве, Кіеве, Ленінградзе, Петразаводску, іншых сталічных, абласных і раённых цэнтрах, дзе здымалі на стужку музейныя экспанаты, архіўныя дакументы, з дапамогай якіх у фільме адновяцца падзеі далёкіх дакастрычніцкіх дзён.

Глядач пазнаёміцца не толькі з матэрыяламі, узятымі аўтарамі з розных архіўных крыніц, з буйнейшых дзяржаўных бібліятэк, але і сустрэнецца з выдатнымі баявымі паплечнікамі У. І. Леніна — Фрунзе, Антонавым-Аўсеенкам, Крыленкам, пачуе расказ яго дачкі Марыны Мікалаеўны пра тое, як яе бацька, былы прапаршчык рускай арміі, па даручэнні У. І. Леніна ўзначаліў узброеныя сілы маладой Рэспублікі Саветаў.

Лістоўкі, адозвы, артыкулы і прамовы Уладзіміра Ільіча Леніна аказалі вялікае ўздзеянне на мільёны салдат, сотні афіцэраў былой царскай арміі, якія не толькі прынялі ідэі Вялікага Кастрычніка, але і абаранялі яго заваёвы на франтах грамадзянскай, а потым і Вялікай Айчыннай войн. Прыгадаем хоць бы легендарнага Карбышава...

Такім чынам, у цэнтры фільма будзе расказ пра стратэгію і тактыку ленінскай партыі ў цяжкі перыяд падрыхтоўкі рэвалюцыйных мас да штурму асноў буржуазнага ладу і перамогі дыктатуры пралетарыяту, устанаўлення ўлады рабочых і сялян.

Пра тыя далёкія па часе, але заўжды блізкія сэрцу нам і нашым нашчадкам падзеі раскажуць з экрана іх удзельнікі, як, напрыклад, ветэран рэвалюцыйнага руху на Беларусі Аляксандр Іванавіч Касценка — кіраўнік бальшавіцкай арганізацыі ў Рэчыцы.

А. МАЦКЕВІЧ.

НАШЫ ГОСЦІ

Аматары тэатральнага мастацтва знаёмы з майстэрствам калектыву Дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў Рыжскага тэатра рускай драмы—трупа выступала на сталічнай сцэне пяць гадоў назад і пакінула прыемнае ўражанне. І вось новая сустрэча з вядомым калектывам.

У аўторак у памяшканні акруговага Дома афіцэраў пачаліся чарговыя гастролі рыжан. Адкрыліся яны спектаклем па вядомай п'есе А. Астроўскага «На кожнага мудраца даволі прастаты».

У гастрольнай афішы яшчэ чатыры работы рыжан. Мінчане і госці беларускай сталіцы маюць магчымасць пазнаёміцца са спектаклямі «Рэквіем па манахіні» У. Фолкнера і А. Камю, «Успамін» А. Арбузава, «Тэатр часоў Нерона і Сенекі» Э. Радзінскага і «Гульня ў джын» Д. Кобурна.

Гастролі прадоўжацца да 29 студзеня.

П. ШУЛЯК.

Сцэна са спектакля «На кожнага мудраца даволі прастаты».
Фота Ул. КРУКА.

ВЕЧАРЫ, СУСТРЭЧЫ

Прэм'ера канцэртнай праграмы, якую паказала лаўрэат рэспубліканскіх конкурсаў, салістка Беларускай дзяржаўнай філармоніі Г. Заяводзіна, адбылася ў Доме работнікаў мастацтваў. Новая работа выканаўцы прысвечана 40-годдзю Вялікай Перамогі і створана па творах савецкіх кампазітараў і беларускіх народных песнях. У яе ўключаны таксама ўрыўкі з вершаў.

Г. АНТОНЕНКА.

●

Міхалай Матукоўскі быў госцем клуба «У коле сяброў». У Доме работнікаў мастацтваў ён расказаў аб сваёй паездцы ў складзе дэлегацыі тэатральных работнікаў краіны ў Злучаныя Штаты Амерыкі і Англію.

П. ГАРДЗІЕНКА.

●

Чарговымі гасцямі вечара «Сустрэчы ля раяля» ў рэспубліканскім Доме работнікаў мастацтваў былі народная артыстка БССР Н. Гайда і лаўрэаты Усесаюзнага конкурсу М. Марэцкі і В. Жывалеўскі, якія выканалі рускія рамансы, а таксама творы беларускіх кампазітараў, замежную класіку.

Г. ЖДАНЮК.

ПАЕЗДКА ПА НЕЧАРНАЗЕМ'І

У складзе агітпоезда ЦК ВЛКСМ «Ленінскі камсамол» ансамбль народных інструментаў «Эстафета» Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага выязджаў у Горкаўскую вобласць, дзе даў для працаўнікоў Нечарназем'я шэраг канцэртаў. Раней студэнты выступалі на будоўлях Сібіры, у Эстоніі, перад маракамі Поўначы.

А. ПЕТРАШЭВІЧ.

ПРАЦУЕ НАТХНЁНА

За высокія паказчыкі, дасягнутыя ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве ў 1984 годзе, Дзяржкіно СССР і ЦК прафсаюза работнікаў культуры сярод іншых узнагародзілі Ганаровай граматай кінамеханіка вёскі Буда Дубровенскага раёна А. Зетчанку.

Вось ужо дваццаць гадоў ён працуе ў роднай вёсцы, з'яўляецца актыўным прапагандыстам кінамастацтва. А. Зетчанка — ударнік камуністычнай працы. Ён удастоены ганаровых знакаў «Ударнік дзесятай пяцігодкі» і «Ударнік адзінаццатай пяцігодкі».

Цяпер сельскі кінамеханік працуе ўжо ў лік кастрычніка сёлетняга года.

І. КОГАН.

ПОСПЕХ БУДУЧЫХ СПЕВАКОЎ

У Рызе прайшоў міжрэспубліканскі конкурс вакалістаў, на якім паспяхова выступілі студэнты Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага.

І. Шупенічу прысуджана другое месца. Трэцяе месца заняла Н. Бярэзіна. Дыплом атрымала Н. Залатарова. Н. Бандарэнка ўзнагароджана граматай за выступленне ў другім туры і атрымала прыз за выкананне народнай песні.

У поспеху будучых спевакоў немалая заслуга іх педагогаў Л. Івашкова, К. Драздовай і В. Раговіч.

Г. ДУШКІН.

УРОК ПРАВЁЎ ПІСЬМЕННІК

Вядомы беларускі празаік Ян Скрыган правёў урок роднага слова ў Мінскім педагагічным вучылішчы № 2, у час якога гаварыў аб развіцці беларускай літаратуры, расказаў аб сваёй творчай працы, адказаў на шматлікія пытанні будучых педагогаў.

І. КАЗЛОЎСКІ.

ВЫСТАЎКІ

У адной з выставачных залаў Бабруйска адкрыта выстаўка работ ленінградскага мастака Абрама Рабкіна. Чаму менавіта ў гэтым горадзе вырашыў жывапісец паказаць свае работы? Растлумачыць гэта проста. У Бабруйску мастак нарадзіўся, з Бабруйскам, з Беларуссю моцна звязана яго творчасць.

Бабруйчане з цікавасцю пазнаёміліся з выстаўкай свайго земляка. Мастаку ёсць што сказаць аб сваім горадзе, аб сваім унутраным свеце. Яго свет — чалавечны і добры. А дабрыня і чалавечнасць — заўсёды патрэбны людзям, заўсёды сучасныя.

Л. КОВАЛЬ.

А. Рабкін. Беларуская сям'я.

●

У Віцебскай гарадской выставачнай зале працуе абласная выстаўка народных і самадзейных майстроў разьбярства, прысвечаная 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Амаль 25 аўтараў прадставілі 320 работ. Разам з маладымі прынялі ўдзел старэйшыя майстры С. Шаўроў з Оршы, А. Міхеенка з Полацка, Г. Асіпкова з Чашніцкага раёна. У выстаўцы прымаюць удзел і студэнты мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута.

М. НІЧЫПАРАЎ.

●

XV мінская гарадская выстаўка «Прырода і фантазія» дэманструецца ў Доме народнай творчасці.

Больш за 450 мастацкіх экспанатаў — лясную скульптуру, кампазіцыі з прыродных матэрыялаў, біжутэрыю, работы фларыстаў — прадставілі на суд гледачоў каля 70 самадзейных мастакоў і ўмельцаў беларускай сталіцы.

В. АСТРЫНСКІ.

СЛОВА ПРА ГЕНАДЗЯ ЦІТОВІЧА

«Творчая дзейнасць народнага артыста Савецкага Саюза, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі рэспублікі Генадзя Іванавіча Цітовіча з'яўляецца адной з самых яркіх старонак фальклорна-музычнага жыцця Беларусі». Так пачынае сваю брашуру «Генадзь Цітовіч», выпушчаную выдавецтвам «Беларусь», Д. Жураўлёў.

Аўтар прасочвае яркае, шматграннае жыццё Генадзя Іванавіча, звязанае з прапагандай беларускай народнай песні. Выданне ілюстравана шматлікімі здымкамі, якія ўзнаўляюць асобныя моманты біяграфіі чалавека, імя якога добра вядома не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі.

Е. ДРОМІН.

У БІБЛІЯТЭЦЫ «ПАЭЗІЯ НАРОДАЎ СВЕТУ»

Страсны гуманізм, услаўленне прыгажосці чалавека, апяванне чысціні яго пачуццяў і шчырасці, непаўторнасці ўзаемаадносін — гэтыя вызначальныя якасці паэзіі выдатнай чылійскай паэтэсы Габрыэлы Містраль садзейнічаюць таму, што творы яе аднолькава блізкія і зразумелыя ва ўсіх кутках свету. Асаблівай папулярнасцю яны карыстаюцца ў іспанамоўных краінах. І гэта — не выпадкова. У 1945 годзе Г. Містраль першай сярод пісьменнікаў Лацінскай Амерыкі была ўдастоена Нобелеўскай прэміі.

Цяпер вершы Г. Містраль загучалі па-беларуску дзякуючы лаўрэату Дзяржаўнай прэміі БССР і прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Рыгору Барадуліну, які пераклаў творы яе, напісаныя ў розныя гады. Па кніжцы «Ветраліст», што папоўніла серыю «Паэзія народаў свету», якую выпускае выдавецтва «Мастацкая літаратура», можна атрымаць поўнае ўяўленне аб творчасці гэтай самабытнай паэтэсы, яркай індывідуальнасці яе таленту.

Укладанне зборніка, заўвагі, рэдакцыя перакладаў Карласа Шэрмана. Ён жа напісаў да кніжкі прадмову, у якой вызначае месца Г. Містраль у сусветнай паэзіі.

М. ВАРАНЦОЎ.

ЗМЕШЧАНА У «СОВЕТСКОМ БАЛЕТЕ»

У чарговым, шостым нумары часопіса «Советский балет» за мінулы год пад рубрыкай «Галерэя маладых талентаў» змешчаны артыкул доктара мастацтвазнаўства, прафесара Юліі Чурко, прысвечаны творчасці маладых салістак Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР — лаўрэата V Усесаюзнага конкурсу артыстаў балета Інэсы Душкевіч, Натэлы Дадзішкіліяні, Таццяны Шаметавец, Марыны Мельнікавай. У ім аналізуюцца партыі, якія выканалі артысткі за апошнія тэатральныя сезоны, вызначаюцца рысы творчай індывідуальнасці кожнай з іх.

У ліку тых, хто адказвае на анкету часопіса «Канцэртная харэаграфія», — галоўны балетмайстар Вялікага тэатра Беларускай ССР В. Елізар'еў.

У нумары надрукавана таксама рэцэнзія «З любоўю да балета» В. Канстанцінавай на кнігу Ю. Чурко «Белорусский балетный театр», якая выйшла ў 1983 годзе ў выдавецтве «Беларусь».

Т. ПЕТРЫК.

СПЯВАЮЦЬ ХЛОПЧЫКІ

Далёка за межамі рэспублікі вядомы справы славутага калгаса «Савецкая Беларусь» Камянецкага раёна, якім кіруе Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны работнік культуры БССР У. Бядуля. У мясцовым Палацы культуры плённа працуюць народны харавы калектыў, агітбрыгада «Раснянка», духавы аркестр, інструментальны ансамбль, дзіцячы тэатр, піянерскі хор. Перад хлебаробамі выступалі многія вядомыя калектывы і выканаўцы краіны.

У дні правядзення Усесаюзнага агляду самадзейнай мастацкай творчасці працоўных, прысвечанага 40-годдзю Вялікай Перамогі, перад хлебаробамі дэбютаваў новы самадзейны калектыў — хор хлопчыкаў. Яго арганізатар і мастацкі кіраўнік — выпускніца Мінскага інстытута культуры Таццяна Бандарэвіч.

М. МІКОЛЬСКІ.

ЛАД ЖЫЦЦЯ САВЕЦКІ

АТРЫМАЙЦЕ КЛЮЧЫ АД КВАТЭРЫ...

Пад Новы год пазванілі знаёмыя: павіншуйце нас, атрымалі кватэру! Двухпакаёвую, палепшанай планіроўкі.

У якім раёне? Не раён, а райскі куток. Паміж вуліцамі Сурганава і Горкага. Памятаеце, дзе жылі нашы сябры ў сваім драўляным дамку?

Яскрава бачу гэтую ўскраіну Мінска, драўляную Цнянку. Помню кіславаты пах тарфянога дыму, які разносіўся па вуліцах, калі палілі ў печах — пасля вайны не хапала дроў і палілі торфам. Помню калдобіны на вулачках і завулках, па іх проста нельга было ездзіць нам, дзецям, на веласіпедах — колы загразалі ў пясчаных «дзюнах». Помню спакуслівыя гронкі спелых вішань, якія звісалі амаль над кожным плотам. Помню брамы з шыльдамі: «Асцярожна, злы сабака»...

Ці дзіва, — скажа чытач, — гэтакае можа ўспомніць кожны, каму, як гаворыцца, «за трыццаць». Правільна. І ўсё ж нават прыкметы часу падаюцца фактамі ўласнай біяграфіі, калі афарбаваны сваім, перажытым.

Раён, пра які ішла размова, існаваў у такім самым выглядзе зусім да нядаўняга часу: гадоў сем назад архітэктары перакроілі яго на сваіх кульманах, а ўжо сёння іх задумку можна ўбачыць ажыццёўленай.

Мікрараён-85 вырас у цэнтры абжытага масіву. Размешчаны паміж дзвюма буйнымі сталічнымі магістралямі і адначасова побач з адкрытай прасторай — паркавым масівам, які быў за горадам і называўся Балотнай станцыяй, ён і сапраўды займае надзвычай зручнае і выгаднае месца.

— А для архітэктараў, — расказвае аўтар аб'ёмна-планіровачнага рашэння праекта Л. Кляцунова, — гэта было даволі адказнае заданне. Невялікія памеры раёна, месцазнаходжанне яго вымагалі забудовы кампактнай, з элементамі «сталічнасці». Акрамя таго, нам патрэбна было вылучыць сэнсавы цэнтр раёна, нейкі вузел прывязкі інтарэсаў жыхароў. Ім стаў спартыўны комплекс са стадыёнам, з наборам гімнастычнага абсталявання і будынак ЖЭСа з пакоямі для розных заняткаў. Заўважу, што Мінск адным з першых гарадоў у Саюзе паказаў прыклад у арганізацыі дзіцячых спартыўна-аздараўленчых комплексаў па месцы жыхарства.

— Забудова раёна, — працягвае Людміла Сяргееўна, — ажыццяўлялася дамамі тыпавых серый. Пры індустрыяльным домабудаўніцтве інакш і быць не можа. Аднак пазбягаць шэрасці, аднатыпнасці мы імкнуліся за кошт колеру і размяшчэння аб'ёмаў. Так, на фоне светлых дзевяціпавярховых дамоў — паўкруг шаснаццаціпавярховага, аблiцаваны яркай пліткай. «Высоткі» ствараюць пэўныя структурныя акцэнты.

У Мінску ў апошні час паявілася нямала раёнаў, забудаваных дамамі гэтых самых серый, з гэткімі ж ярка аблiцаванымі панелямі. Узяць хоць бы «Зялёны Луг-6», «Захад» і іншыя. Але ў раёне, пра які мы расказваем, прыцягваюць увагу не высотныя гмахі, што ўтвараюць карэ, а цэнтр, у якім, як у чашы, размясціліся двухпавярховыя будынкі прывабнай канструкцыі і цікавыя па афарбоўцы. Тут адразу тры дзіцячыя садзікі, а паміж імі — светла-охрысты будынак з высокім ганкам.

Збоку ля дзвярэй заўважаю шыльду: «Школа юных тэхнікаў». Побач — план работы школы на ўвесь год. У плане — работа розных гурткоў, выстаўкі, конкурсы, паходы, экскурсіі, пасяджэнні клубаў па інтарэсах.

У гэтым самым доме размясціўся і ЖЭС. Начальнік яго В. Дамашэвіч расказаў, што школа юных тэхнікаў — дзецішча Савецкага райвыканкома, а вось гурткі — свае, жэсаўскія. У штаце — і педагогі, і трэнеры. Працуюць гурткі разьбярства па дрэве, вязання, мастацкага слова, барацьбы, фігурнага катання, фотагурток.

Віктар Станіслававіч прапануе паглядзець гімнастычную залу (увечары тут займаюцца аэробікай дарослыя), пакоі для заняткаў іншых гурткоў. У гуртку вязання — сапраўдная выстаўка: макрамэ, лялькі, зробленыя з нітак і дзіцячай фантазіі, розныя сурвэткі. Толькі сёння на абодвух паверхах ціха: дзеці паехалі на экскурсію ў Талін.

Ды сам будынак ЖЭСа нагадвае хутчэй Дом культуры, чым адміністрацыйную ўстанову — роспісы на сценах, аблiцоўка дрэзам. Аказваецца, роспіс — дыпломныя работы студэнтаў мастацкага вучылішча (вось як трэба спалучаць прыемнае з карысным).

— У сваёй рабоце арыентуемся на грамадскасць, — гаворыць Віктар Станіслававіч. — Першыя нашы памочнікі — дамавыя саветы. У іх уваходзяць самыя актыўныя людзі, для якіх сваё і наша — паняцці не процілеглыя. У кожным пад'ездзе ёсць наш упаўнаважаны па ахове парадку. І яшчэ. У кожным доме ёсць мужчыны, якія ў вольны час ахвотна бяруцца за гэблік ці шкларэз. Вось з такіх людзей фарміруем грамадскія рамонтныя брыгады. Аддалі ім асобнае памяшканне — займайся любімай справай, колькі душа просіць...



Падумалася: вельмі гэта разумна — вось так аб'ядноўваць людзей. Тут вам і фізікі, і лірыкі, і шафёр, і слесар. Кантынгент жыхароў вельмі разнастайны. Тут атрымалі кватэры людзі з розных раёнаў: і тыя, чые дамы пайшлі пад знос, і тыя, хто чакалі сваёй чаргі ў гарсавеце, і тыя, хто менавіта ў гэтым раёне жадаў атрымаць кааператыўную кватэру. Дык аднаму занятак у такой брыгадзе патрэбен для размінкі пасля работы за пісьмовым сталом, другому — для кампаніі, а ўсім — каб наладзіць кантакты з суседзямі, бо якраз іх так не хапае ў новых мікрараёнах.

І што цікава — людзі не саромеюцца тут «чарнавой работы». Я бачыла спіс жадаючых стаць дворнікамі. А ўлетку, расказаў Дамашэвіч, няма адбою ад жанчын, якія ахвотна корпаюцца ў зямлі на нашым агульным двары — толькі спраўляйся, пастаўляй расаду ды саджанцы.

Новы раён будуецца. Праз год-два тут будзе жыць дванаццаць тысяч чалавек. У іх будзе свой універсам, прамтаварны магазін, магазін букіністычнай кнігі, кінатэатр на дзве залы. Усе выгоды. Важна, каб прыжыліся і тыя парасткі, якія жывяць не толькі наш побыт, але і душу, каб не страчваліся духоўныя запатрабаванні. Каб сучаснымі былі не толькі дамы і кватэры, але і людзі, што насяляюць іх.

Пакідаючы будынак ЖЭСа ўвечары, калі загарэлася лямпачка над уваходам у агітпункт, што паявіўся ў новым раёне, побач з дзвярамі я заўважыла аб'яву, якой не было яшчэ ўчора: «Ключы ад кватэры атрымайце ў інжынера...» І на душы стала люба. Я па-добраму пазайздросціла людзям, да якіх звярталіся, якім наканавана пачаць новае жыццё ў новым, прыгожым раёне нашага роднага Мінска.

Р. БАКУНОВІЧ.

ПРЭМ'ЕРЫ

Арнхольм — народны артыст БССР М. Яроменка, Балета — Т. Пузіноўская, Эліда — народная артыстка БССР Л. Давідовіч.
Фота Ул. КРУКА.

Як мы паведамлялі ўжо, у канцы мінулага года ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы пачала працаваць малая сцэна. Адбылася і першая прэм'ера — пастаўлены спектакль па драме Генрыка Ібсена «Жанчына з мора» (пераклад С. Законнікава). Пастаноўка рэжысёра М. Пінігіна, сцэнаграфія А. Шкаевай, мастак па касцюмах Н. Рудзіна, музычнае афармленне Т. Саберайскай.

У ролях заняты народныя артысты БССР Л. Давідовіч і М. Яроменка, заслужаныя артысты рэспублікі Г. Талкачова, В. Філатаў і іншыя.

●

Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача імя 50-годдзя камсамола Беларусі паказаў спектакль, створаны паводле твораў Аляксандра Грына,— феерыю «Асоль». У цэнтры падзей — героі славутых грынаўскіх «Пунсовых ветразяў». П'есу напісаў В. Лукша, паставіў спектакль галоўны рэжысёр тэатра У. Каткевіч, аўтар сцэнаграфіі — мастак Л. Герлаван, музыкі — І. Лучанок і С. Бельцюкоў, балетмайстар В. Гаявая.

На здымку: сцэна са спектакля. Капітан Грэй (лаўрэат прэміі ЛКСМ Беларусі артыст С. Журавель) сярод матросаў.
Фота Ул. КРУКА.

ШЧАСЛІВЫ ЛЁС СПЕКТАКЛЯ

Шмат віншаванняў атрымліваецца ў гэтыя дні заслужаны артыст БССР Сяргей Іванавіч Еўдашэнка. Спектакль «Няроўны шлюб» Б. Рацара і У. Канстанцінава, рэжысёрам-пастаноўшчыкам якога ён з'яўляецца, паказаны на сцэне Брэсцкага абласнога драматычнага тэатра імя ЛКСМБ 700 раз. Аўтар пастаноўкі з'яўляецца таксама і выканаўцам адной з галоўных роляў.

Удзячнымі гледачамі гэтай вясёлай і павучальнай гісторыі былі больш чым 300 тысяч гледачоў абласнога цэнтра, гарадоў і сёлаў Украіны, гаспадарак Пінскага, Столінскага, Лунінецкага, Пружанскага і іншых раёнаў Брэстчыны, куды тэатр штогод выязджае на «малыя гастролі». Нямала прафесійнага майстэрства, творчай фантазіі ўклалі ў ролі заслужаныя артысты БССР Н. Ганчарэнка, Г. Качаткова, К. Перапяліца, артыст А. Беражны і іншыя.

М. КАЗЛОВІЧ.

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

ЗВАРОТНЫ АДРАС— «ПАЛЯВАЯ ПОШТА...»

З хваляваннем і чаканнем чагосьці незвычайнага бярэш у рукі гэтыя пажоўклыя ад часу «трохкутнікі». Зваротны адрас на іх пазначаны двума словамі і некалькімі лічбамі: «Палявая пошта...»

Хто ён, той чалавек, які напісаў радкі, што прымушаюць і сёння, праз гэтулькі год, часцей біцца сэрца? Што сталася з ім? Пісьмо ж датавана чэрвенем сорак другога. Успомніце, якое яно было, тое лета, той чэрвень на фронце. І якую ж мужнасць, сілу духу, спакой і веру ў Перамогу трэба было мець, каб напісаць тады сваім блізкім:

«Жывём у бліндажы. Нас 15 чалавек. Вельмі часта ўспамінаем родных, вас успамінаем. Якое прыгожае жыццё будзе ва ўсіх пасля вайны. Як людзі будуць шанаваць адзін аднаго! І мы ўсе спадзяёмся дажыць да да гэтых светлых дзён: і камбат Мельнікаў, і мае баявыя таварышы: Пятунін, Паўлаў, Золатаў, Траўкін, Куцепаў. І я таксама...»

Такое пісьмо даслаў з фронта палітрук Н. Адзінцоў. Я ніколі не ведаў яго, а пра пісьмы бацькі расказваў мне аднойчы яго сын. І яшчэ ён расказаў пра тое, што пісьмы франтавіка ў сям'і берагуць, часта перачытваюць іх. Неяк ужо ўнучка сына палітрука папрасіла: «Пачытай спадчыну». Прачытаў ёй дзед пісьмы свайго бацькі.

Так, пісьмы гэтыя сапраўды каштоўная спадчына, якую пакінулі франтавікі сваім дзецям, унукам. У іх — вялікі духоўны зарад. І колькі б мы іх ні чыталі, заўсёды знойдзецца штосьці новае.

Вядома, гэтыя пісьмы былі адрасаваны канкрэтным людзям, але за асабістым тут нязменна стаіць агульнае, бо ў гады вайны лёс кожнага сумленнага чалавека зліўся з лёсам Радзімы. Была б краіна жывая. А ўсё астатняе прыйдзе, здабудзецца, збудзецца.

Вялікая маральная сіла франтавых пісьмаў. Яны памагаюць убачыць характары бацькоў, дзядоў. Як не ўспомніць словы двойчы Героя Савецкага Саюза генерала арміі П. І. Батава: «Той, хто навучыўся глядзець смерці ў твар — не лжэ, і таму кожны радок франтавога «трохкутніка»—шчыры. Нам і нашым нашчадкам гэтыя радкі, нярэдка абарваныя куляй, многае адкрываюць у псіхалогіі старэйшых пакаленняў».

Жыхарка Слуцка Алена Аляксееўна Ціхамірава паказала мне альбом — цэлы альбом! — франтавых пісем мужа — Сяргея Міхайлавіча Якаўлева, які працаваў да сваёй смерці на мясцовым маслясырзаводзе. Першыя датаваны пачаткам 1942 года, апошняе— майскае, сорак пятага, відаць, самае лаканічнае: «Наш Чырвоны сцяг над Берлінам!» Каб напісаць гэтыя некалькі слоў, сапёр Якаўлеў ішоў тры доўгія гады ад Сталінграда да Берліна.

Вось радкі з яго пісьма, напісанага пасля перамогі пад Сталінградам: «Пад Сталінградам я быў да самага канца бітвы. Папала ворагу так, што ён і цяпер не можа апамятацца. Цяжка, ды і шмат трэба пісаць, каб вы мелі ўяўленне аб Сталінградскай бітве. Будзем разам — раскажу...»

Яшчэ адно пісьмо — прыйшло яно пасля працяглага перапынку. Франтавік паведамляе, што служыць ён «з добрымі хлопцамі, інжынерамі: двое з Краснадара і адзін з Украіны. Так што за два гады мы сталі роднымі братамі».

Правільна кажуць, што самыя высокія пачуцці праяўляюцца ў вельмі простых рэчах, у звычайных з'явах. Удумаемся ў словы: «сталі роднымі братамі». Так, сталі роднымі братамі рускі, украінец, беларус... Іх дружба, дружба сыноў розных народаў, памагала біць ворага, перамагаць яго.

Яшчэ некалькі радкоў з пісьма Сяргея Міхайлавіча Якаўлева: «Цяпер ёсць магчымасць пісаць часцей. У нас былі гарачыя баі. Фашысты перайшлі да абароны. Не ідзе ў іх цяпер. Гэта не мінулы год. Наш салдат навучыўся ваяваць, так што будзь спакойная...».

Франтавое жыццё дарыла воіну і радасці, і ён спяшаўся падзяліцца імі з блізкімі. У жніўні 1943 года С. Якаўлеў сустрэўся на фронце з братам Мікалаем. Ён паведамляе жонцы пра гэтую сустрэчу, пра тое, што Мікалай стаў кандыдатам у члены партыі, а пра сябе, што хутка будзе членам партыі. «У кандыдаты ўступіў у жніўні 1942 года пад Сталінградам, калі там вырашаўся лёс Расіі. Я тады вырашыў, калі загіну, то камуністам».

Давялося мне пазнаёміцца з дзённікам афіцэра-танкіста Уладзіміра Васільевіча Чаркашына. Ён пачаў рабіць запісы ў першы дзень вайны. Вось некалькі запісаў, зробленых у перыяд баёў за вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

14 чэрвеня 1944 года. «Гарачы сонечны дзень. Настрой — бадзёры. Мы ўсе ў чаканні важных падзей. У другой палове дня прыехаў камандуючы арміі генерал-лейтэнант А. Гарбатаў, павіншаваў нас з гадавінай часці. Наш камандзір генерал В. Жолудзеў запэўніў Ваенны савет у тым, што ўсе задачы будуць выкананы».

22 чэрвеня. «Выйшлі да воднага рубяжа. Вось і пераправа. Вось гэта будзе справа! Стала ясна, пра якую гарачую работу гаварыў генерал Гарбатаў. Пачалі пераправу. Ужо дзесяткі танкаў і самаходак на тым беразе. Артагонь ворага не спыняецца. Танк механікавадзіцеля Патапава ішоў па мосце. Не паспеў ён прайсці да сярэдзіны, як у мост трапіў снарад. Здавалася, што Патапаў не правядзе танк па мосце. Але ён даў назад, потым ірвануў машыну наперад. «Т-34» пераскочыў разрыў моста і памчаў да берага, дзе ішоў гарачы бой».

29 чэрвеня. «Вызвалілі вёску Брадзец пад Клічавам. Радасці жыхароў няма межаў. Шмат гора прынёс ім вораг».

2 ліпеня. «Мы ля самага Мінска. Рыхтуемся да штурму».

3 ліпеня. «Танкі ідуць наперадзе, пракладваючы шлях пяхоце. Гараць дамы. Цяжка рухацца танкам. Колькі бяды прынеслі фашысты сталіцы Беларусі».

Без даты. «Нашы войскі адціскаюць ворага на захад. Мы праследуем іх.

Падыходзім да заходняй граніцы Радзімы. Радасць — вялікая, але азмрочана цяжкай стратай — загінуў наш генерал Жолудзеў. Танкісты адпомсцяць ворагу за гібель камандзіра...».

Час усё далей і далей аддаляе нас ад тых вогненных гадоў. Радзеюць рады франтавікоў. Але час не ўладарыць над подзвігам — ён вечны. Пісьмы франтавыя даюць магчымасць маладым убачыць, як ішлі іх бацькі і дзяды да Перамогі.

Добра, што пісьмы, дзённікі захоўваюцца ў сем'ях. Думаецца, што сёння гэтыя пісьмы ўжо належаць не толькі тым, каму яны пісаліся, адрасаваліся. Яны патрэбны ўсім нам.

У апошнія гады краязнаўцы, чырвоныя следапыты многае зрабілі, каб увасобіць у справы дэвіз «Ніхто не забыты, нішто не забыта!». Сапраўды, вялізная работа! І людзі кажуць дзякуй летапісцам народнага Подзвігу за ўсё зробленае імі. Колькі новых імёнаў з'явілася ў баявым летапісе Славы, колькі дарагіх імёнаў вернуты родным, блізкім воінаў.

Здарылася так, што ў ходзе вялікай пошукавай работы да апошняга часу месцамі па-за ўвагай следапытаў і краязнаўцаў заставаліся пісьмы, дзённікі франтавікоў. І добра, што гэты прабел пачаў запаўняцца цяпер у сувязі з падрыхтоўкай да 40-годдзя Перамогі. Спашлюся на вопыт краязнаўцаў Слуцкага раёна.

Ужо пэўны час на старонках газеты «Шлях Ільіча» публікуюцца пісьмы франтавікоў. Значную актыўнасць ў пошуку гэтых пісьмаў праяўляюць члены Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, у прыватнасці, сакратар раённай арганізацыі Л. Ілюкевіч. Вось два пісьмы, якія адшуканы імі ў хатнім архіве Праскоўі Мікалаеўны Дубовік:

«28 ліпеня 1944 года. Добры дзень, Праскоўя! Я жывы, здаровы, чаго і табе жадаю. Дасылаю табе другое пісьмо, у якім магу паведаміць, што сёння ўступаем у бой з немцамі. Хто ведае, што можа здарыцца... Не плач. Да пабачэння, дарагая жонка. Да пабачэння. Цалую цябе. Твой муж Міша. Да пабачэння».

Хутка прыйшло яшчэ адно пісьмо.

«Дарагая жонка! Прабач. Можа, я калі-небудзь цябе пакрыўдзіў... Даруй мне. Сёння я прашу прабачэння. Дарагая Праскоўя! Буду старацца паболей знішчыць немцаў. За гэта мне будзе ўдзячная Радзіма, а табе не будзе сорамна за мяне».

Пошук франтавых пісем, ведаю, вядзецца і ў іншых раёнах рэспублікі. Гэтак жа вядома, што ў некаторых абласцях краіны ўжо выдадзены пісьмы франтавікоў асобнымі зборнікамі.

Зборнік, вядома, добра, але якое вялікае выхаваўчае значэнне мела б, скажам, выстаўка фотакопій або арыгіналаў пісем, фотаздымкаў з сямейных альбомаў у краязнаўчым музеі або гарадской бібліятэцы.

Няхай да Спадчыны дакранецца кожны, няхай яшчэ і яшчэ раз адчуе, што перажыў наш народ у гады вайны, няхай убачыць, як пад кіраўніцтвам партыі наш народ ваяваў і працаваў дзеля Перамогі — нашай вялікай і нязгаснай Перамогі.

Р. ПАСТРОН.

ЦЯПЛО СЯБРОЎСКІХ СУСТРЭЧ

Народны хор ветэранаў вайны і працы Палаца культуры Белсаўпрофа падтрымлівае творчыя сувязі з 32 харавымі калектывамі Савецкага Саюза. Зусім нядаўна адбылася сустрэча нашага калектыву з мужчынскай харавой капэлай ветэранаў вайны Валкоўскага РДК Харкаўскай вобласці.

Валкоўшчына славіцца сваімі цудоўнымі людзьмі. Яна дала краіне адзінаццаць Герояў Савецкага Саюза і 21 Героя Сацыялістычнай Працы. Гордасцю раёна з'яўляецца мужчынская харавая капэла ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, створаная дзесяць гадоў назад. У 1977 годзе калектыў быў удзельнікам заключнага канцэрта выканаўцаў Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных Украіны. Ён атрымаў званне лаўрэата фестывалю, узнагароджаны Вялікім Залатым медалём.

Шмат гадоў харавой капэлай кіраваў заслужаны работнік культуры УССР А. Пціц, а зараз яе мастацкім кіраўніком і дырыжорам з'яўляецца прафесар Харкаўскага дзяржаўнага інстытута мастацтваў Ю. Кулік.

У рэпертуары нашых сяброў — песні аб Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайне, Камуністычнай партыі, Леніне, Савецкай Радзіме, арыі з опер, украінскія і рускія народныя песні.

Калектыў, у якім больш за 60 чалавек, выступаў у многіх гарадах нашай краіны, 40 удзельнікаў харавой капэлы са зброяй у руках абаранялі Маскву, Ленінград, Сталінград, вызвалялі Севастопаль, Мінск, штурмавалі Берлін.

У Мінску нашы ўкраінскія сябры далі два канцэрты: у Палацы культуры Белсаўпрофа для ветэранаў партыі, вайны і працы і ў Мінскім суворaўскім вучылішчы.

Госці падрыхтавалі для мінчан спецыяльную праграму, прысвечаную 40-годдзю Перамогі, у якую ўключылі ўсімі любімую намі песню І. Лучанка на словы М. Ясеня «Памяць сэрца». Асабліва моцна прагучала ў выкананні капэлы песня Д. Тухманава на словы В. Харытонава «Дзень Перамогі».

З візітам у адказ на Украіну выязджаў народны хор ветэранаў вайны і працы Палаца культуры Белсаўпрофа. Ён даў на Украіне два канцэрты. Першы — у Доме культуры горада Валкі, другі — у Харкаўскім вышэйшым ваенна-палітычным вучылішчы. Канцэрты прайшлі з поспехам. Асабліва цёпла слухачы сустрэлі песню «Слухайце хор ветэранаў», словы і музыка якой належаць удзельніку нашага хору А. Недарэзаву, і ўкраінскую «Песню пра Дняпро» М. Фрадкіна на словы Я. Далматоўскага. Саліраваў А. Недарэзаў.

Сустрэча з украінскімі калегамі надоўга застанецца ў нашай памяці.

І. РАЗАНАЎ,
старшыня савета народнага хору ветэранаў вайны і працы Палаца культуры Белсаўпрофа.

КРЫТЫКА БІБЛІЯГРАФІЯ

ТУТ гаворка пойдзе пераважна пра ўспрыманне беларускай крытыкай творчасці Вячаслава Адамчыка. Можа ўзнікнуць пытанне: чаму яго, а не чыёй іншай? Ды з той простай прычыны, што, на маю думку, адносіны крытыкі да гэтага празаіка адначасова з'яўляюцца паказчыкам яе стаўлення да іншых пісьменнікаў, якія пачалі ў сярэдзіне пяцідзесятых і добрага творчага разгону набралі ў гады шасцідзесятыя.

Дэбютаваў В. Адамчык вершамі, але потым пераключыўся на апавяданні. У 1958 годзе выйшла кніжачка «Свой чалавек», якую склалі ўсяго два творы. Яна і была нібы першай ластаўкай з маладога выраю беларускіх празаікаў — Уладзіміра Караткевіча, Івана Пташнікава, Барыса Сачанкі, Уладзіміра Дамашэвіча, Міхася Стральцова, Івана Чыгрынава, Анатоля Кудраўца, пра якіх крыху пазней шырока загаворыць беларуская крытыка.

Дык як жа яна сустрэла ўваход пачаткоўца ў літаратуру, ці здолела на аснове двух апавяданняў адкрыць будучага майстра?

Выхаду зборніка былі прысвечаны рэцэнзіі Алеся Яскевіча і Ванкарэма Нікіфаровіча.

«Здараецца так, — пісаў першы з іх, — сярод дзесяткаў маладых распазнаеш адзін голас. І спета нямнога — усяго дзветры песні, але ў гэтым яшчэ нядужым голасе чуецца маладая сіла, журчанне самога жыцця. З такім удзячным пачуццём чытаеш першую кніжку маладога празаіка В. Адамчыка «Свой чалавек».

Зборнік прааналізаваны ў асноўным з боку формы—іменна на гэтым пачала завастраць увагу крытыка ў той час. А. Яскевіч заўважае такія асаблівасці творчай манеры маладога аўтара, як увага да бытавой дэталі, удумлівасць і праўдзівасць у адлюстраванні рэчаіснасці, музычнасць у пабудове фразы і ўсяго твора, уменне за знешнім, будзённым убачыць сілу пачуцця, напружанасць эмоцый, «схапіць прадмет або героя ў дзеянні», дзеля чаго ў якасці асноўнага сродку характарыстыкі персанажаў ужываецца дзеяслоў і дыялог.

«Эпітэт, — зазначае крытык, выкарыстоўваецца толькі ў крайніх выпадках, калі трэба стварыць партрэт ці малюнак, або дзеяслоў да таго сцёрся, што не перадае жэста. Яго трэба ўдакладніць эпітэтам. І зусім не выпадкова, што малады аўтар эпітэт ужывае не да прадмета, як звычайна, а да дзеяння. (Сіўтук змоўк і цяжка засоп. Палюбіліся шчыра і моцна. Лёгка затупала, засмялася ад душы, лагодна, наспех стрэсла з хусткі мокры снег.)»

Гэтыя разважанні і назіранні цікавыя для нас не толькі самі па сабе, але і ў кантэксце ўсёй творчасці В. Адамчыка. Пісьменнік потым адыдзе ад вонкавага дынамізму да статычна-вобразнага, малюнкавага, багата насычанага эпітэтамі адлюстравання жыцця.

На фоне напісанага пазней першыя апавяданні выглядаюць нібы працэджаныя праз густое сіта, якое забрала ад іх шчодрыя падрабязнасці, эпітэты, параўнанні, дэталі. Аднак ужо і тады здольнасць да бытапісання выявілася досыць відавочна, ва ўсякім разе ў параўнанні з тым, як пісалі раней (а пісалі ў асноўным не «густа»), проза Адамчыка выглядала каларытнай. І таму, мабыць, прадбачачы яе будучыя празмернасці, А. Яскевіч засцерагаў ад небяспекі завязнуць у бытавізме, зазначаў, што аўтар здолеў пазбегнуць гэтага за кошт саграванння напісанага «сваім гарачым сэрцам». «Але, магчыма, — развіваў ён сваю думку, — і пасля гэтага яна (проза. — **Я. Л.**) засталася б прыземленай, калі б пісьменнік не адзеў твор у празрыстую адшліфаваную моўную форму».

Кніжка Адамчыка, нягледзячы на крытычныя заўвагі прыватнага характару, ацэнена крытыкам высока, як цікавая з'ява ў тагачасным літаратурным працэсе. Рэзка кантрастуе з тонам артыкула канцоўка, на-

Яўген ЛЕЦКА

...І ВА ЎСПРЫНЯЦЦІ КРЫТЫКІ

АРТЫКУЛ ДРУГІ

пісаная нібы іншай рукою. Калі да гэтага А. Яскевіч разглядаў творы знутры, з улікам законаў, паводле якіх яны пісаліся, то тут быццам засумняваўся ў правамернасці ўсяго сказанага і пачаў даваць аўтару рэкамендацыі, ажыццяўленне якіх нібыта і магло гарантаваць празаіку належны поспех у будучыні: «...толькі тады, калі мастак пройдзе па жыццю вядучымі шляхамі, пракрочыць па пярэднім краі яго, дзе не сціхаюць бітвы, дзе мільёны людзей працы рашаюць свой лёс, ён здолее на поўны голас праспяваць сваю песню».

Стыль і тэрміналогія канцоўкі яўна запазычаны з арсенала крытыкі часоў мінулых. Як бачым, пераход на новыя рубяжы не праходзіў гладка і лёгка, без супярэчнасцей і ў крытыцы. Крыху пазней, рэцэнзуючы кнігу артыкулаў Якава Герцовіча — аднаго з тых крытыкаў, якія найбольш марудна і неахвотна пераходзілі на новыя пазіцыі, унутрана супраціўляючыся гэтаму, — Якуб Усікаў напісаў: «Увогуле, у нашай крытыцы неяк занядбана праблема эстэтычнага ўздзеяння твораў на чытача: не раскрываецца тое, што іменна прыносіць нам эстэтычную асалоду, у чым тоіцца сакрэт красы, прыгажосці таго ці іншага вобраза, характару, чым вызначаецца прывабнасць і непаўторнасць індывідуальна-творчага аблічча пісьменніка, якія ідэйна-эстэтычныя праблемы яго хвалююць і г. д. Мы слаба яшчэ выхоўваем чытача эстэтычна. Гэты недахоп уласцівы і артыкулам Я. Герцовіча».

Да гонару маладога тады А. Яскевіча трэба сказаць, што ён якраз і быў адным з тых, хто добра адчуваў індывідуальную манеру аўтара і імкнуўся на прыкладзе яго творчасці выхоўваць чытача эстэтычна, гэта значыць вучыць разумець літаратуру, прывіваць да яе любоў.

Шмат цікавых назіранняў над першымі апавяданнямі было і ў рэцэнзіі В. Нікіфаровіча. Малады крытык адзначаў такую якасць апавяданняў, «як багацце моўнай палітры, валоданне рытмам, свежасць вобразнага мыслення, кампазіцыйная стройнасць, уменне тыпізаваць з'явы рэчаіснасці, з мноства фактаў і здарэнняў выбраць найбольш істотныя і характэрныя — менавіта гэта і паспрыяла таму, што апавяданне «Зоня» набыло ўсе рысы сапраўднага твора».

Крытык гаворыць аб своеасаблівай рамантычнасці характару Зоні, што ўвогуле з'яўляецца слушным, бо першае каханне амаль заўсёды заключае ў сабе моманты рамантычнасці і ўзнёсласці, але, думаецца, нацяжкай былі разважанні аб ідэалізацыі вобраза гэтай дзяўчыны, паколькі аўтар не толькі не апраўдвае, тым больш не ідэалізуе яе пасіўнасць, а якраз і асуджае падтэкстам твора.

Што датычыць апавядання «Свой чалавек», то яно разгледжана досыць крытычна: аўтара папракаюць за недастатковую псіхалагізацыю вобраза Язэпа, што прывяло да пэўнай выпадковасці рашэнняў, важных для яго жыццёвага лёсу. Адзначаецца кампазіцыйная рыхласць апавядання, неабавязковасць у ім некаторых эпізодаў, пейзажных замалёвак, скорагаворка і схематызм пры абмалёўцы вобраза калгаснага брыгадзіра Цімоха, усё тое, карацей кажучы, на што і сёння, з дыстанцыі часу, звяртае ўвагу наша крытыка. «У тых апавяданнях, што ўбачылі свет, — пісаў Генрых Далідовіч, — быў аўтар, які яшчэ меў небагата літаратурнага вопыту. Ен спрабаваў адразу ахапіць усё, што бачыў, што адчуваў. Ці не ад гэтага нават стыль апавяданняў быў няроўны — часамі малюнак межаваў са звычайным пераказам, а даследаванне сямтам падмянялася інфармацыйнасцю. Адчувалася і кампазіцыйнае неўпарадкаванне».

«Заканчваючы разгляд першай кнігі, — адзначаў Нікіфаровіч, — хачу далучыцца да думкі тых, хто раіў маладому пісьменніку больш звяртацца да сучаснай тэматыкі, да вобразаў сучаснікаў, равеснікаў».

Як бачым, пажаданні і гэтага крытыка блізкія па сваёй сутнасці да заключных установак А. Яскевіча. Трэба сказаць, што да голасу крытыкаў празаік прыслухаўся. Іншая справа, наколькі гэта паспрыяла больш эфектыўнаму выяўленню яго творчых магчымасцей...

Крытыка, такім чынам, не толькі не прагледзела з'яўлення маладога аўтара ў літаратуры, але і ў асноўным трапна ахарактарызавала асаблівасці яго ранніх апавяданняў, адзначаючы станоўчае і адмоўнае ў іх.

Паказальна, што рабоце з творчай моладдзю ў гэты час надаецца пільная ўвага з боку партыйнага кіраўніцтва рэспублікі. Вось як гэта пытанне асвятлялася ў прамове К. Т. Мазурава:

«Большасць з маладых — гэта добра падрыхтаваныя для літаратурнай працы, культурныя людзі. Значыцца, і ўзровень работы з імі трэба ўзняць.

...Работа з пачынаючымі і маладымі — справа творчая, яна патрабуе індывідуальнага падыходу і такту. Нельга шматлікімі камісіямі, пасяджэннямі і нарадамі замяніць жывую работу, калі трэба сесці з пачынаючым пісьменнікам за стол і разабраць разам з ім яго твор, паказаць недахопы, дапамагчы добрай парадай».

Слушныя і сёння актуальныя словы!

У гэтай спрыяльнай для развіцця літаратуры атмасферы маладая проза ўсё больш упэўнена набірала творчы разгон, завалодвала грамадскай увагай, знаходзілася ў актыўным ідэйна-эстэтычным пошуку, што заведчыла і наступная кніжка празаіка.

Калі «Свой чалавек» сведчыў аб прыходзе ў літаратуру здольнага празаіка, то «Млечны шлях» не толькі пацвердзіў гэта, але і паказаў, што аўтар не стаіць на месцы, не паўтарае, замацоўваючы, раней адкрытае, а знаходзіцца ў актыўным пошуку свежага жыццёвага матэрыялу, новых герояў, новых мастацкіх сродкаў асэнсавання рэчаіснасці. Хоць, праўда, і не ва ўсіх апавяданнях празаіка напаткала поўная ўдача.

Так у загалоўным для другога зборніка апавяданні «Млечны шлях», як і ў «Сваім чалавеку», аўтар размерна захапіўся вонкавай падзейнасцю, мастацкае раскрыццё характараў падмяніў пераказам таго, што рабілася героем і з героем. Асабліва паспешліва, эскізна асветлены цалінны перыяд Косцікавага жыцця. Пазней, разважаючы пра гэты твор, крытык Вячаслаў Івашчанка пісаў:

«Замест непаспешлівай, раздумлівай фразы, дакладных тонкіх мазкоў мы сустракаем у «Млечным шляху» графічна рэзкі малюнак, а часам звычайны канспект. Дзіўна і ў той жа час заканамерна, што пахі палявых траў, іх фарбы, харастко навакольнага свету прыроды тут мала цікавяць В. Адамчыка. І справа, мусіць, не ў тым, што, скажам, стэп не такі багаты на адценні, як лясы і лугі Беларусі, а ў тым, што гэтая зямля, гэты пейзаж не запалі глыбока ў сэрца мастака.

Машына «бегла ўжо каторую гадзіну па гарачай пустэльнай стэпавай дарозе, узнімаючы густое і цяжкае воблака шэрага пылу», стэп пах «сухім пясном і свежым іржышчам». Так піша чалавек, які глядзіць на гэты стэп збоку, а і ён жа варты любові і захаплення, і ў яго ж ёсць свае паэты».

Справа яшчэ, бадай, і ў парушэнні жанравых прынцыпаў твора: узяты за аснову факт выключэння з універсітэта настолькі аброс пабочнымі лініямі, што жанравыя рамкі апавядання размыліся і яно пачало перарастаць у аповесць. (Дарэчы, той самы В. Івашчанка ў творчым партрэце В. Адамчыка, урывак з якога цытаваўся, называе «Млечны шлях» не апавяданнем, а кароценькай аповесцю).

Недахопы мастацкай арганізацыі матэрыялу па законах жанравай формы яшчэ ў большай ступені ўласцівы апавяданню «На крыжавых дарогах».

Варта адзначыць, што тагачасная крытыка ўвогуле аб'ектыўна і правільна ацаніла гэтыя апавяданні, хоць і не была аднагалоснай пры вызначэнні іх вартасцей і пралікаў. Даўшы ў асноўным станоўчую ацэнку першаму з іх, Раман Сабаленка разам з тым зазначыў:

«Вядома, калі аналізаваць апавяданне «Млечны шлях» больш глыбока і па ўсіх кампанентах, дык аўтару яго можна кінуць папрок, што ён псіхалагічна не вельмі ўгрунтаваў узаемаадносіны Косці з Валяй, што пад канец апавяданне пайшло неяк на спад, скорагаворкай і наўрад ці правамерны вывад, што яна (г. зн. Валя) навечна ўвайшла ў яго мары».

Што датычыць «Крыжавых дарог», то гэты твор ацэнены крытычна:

«Хоць пісьменнік і прэтэндаваў на арыгінальнае вырашэнне тэмы, шукаў незвычайных паваротаў у лёсах людзей, падзеі ў апавяданні ўсё ж успрымаюцца як нешта нарачытае, загадзя зададзенае, а не аб'ектыўна жыццёвае».

З высновамі Р. Сабаленкі амаль поўнасцю супадаюць меркаванні Янкі Казекі, які піша:

«У параўнанні з названымі вышэй творамі крыху бяднейшымі па зместу здаюцца апавяданні «На крыжавых дарогах» і «Млечны шлях». Яны шмат трацяць ад таго, што аўтар часамі недастаткова матывуе ўчынкі герояў, месцамі збіваецца на просты пераказ падзеі, эпізоду. Хочацца таксама параіць маладому празаіку пазбаўляцца аднастайнасці ў кампазіцыйнай будове сваіх твораў. Уражанне пэўнай аднастайнасці застаецца пасля чытання кніжкі: большасць апавяданняў напісаны ад першай асобы».

Прагучалі і іншыя галасы. Так, годам пазней, падсумоўваючы ўсё напісанае празаікам, даючы рэкамендацыі, у якім кірунку яму рухацца далей, Іван Навуменка зазначаў: «Думаецца ўсё ж, што В. Адамчыку трэба больш пісаць пра сучаснікаў, пра людзей свайго пакалення. Удалую творчую заяўку ён ужо зрабіў, напісаўшы «Млечны шлях» — добрае апавяданне пра студэнтаў».

Нягледзячы на такія, самі па сабе добрыя, пажаданні, асэнсаванне бягучага дня менш за ўсё ўдавалася В. Адамчыку. Тут, бадай, больш было няўдач, чым сапраўдных мастацкіх знаходак. Але былі і яны.

Выхад на значную чалавеказнаўчую праблему адбываецца ў апавяданні «Ліповы цвет», таксама прысвечаным сучаснасці, інтымным узаемаадносінам персанажаў. Культура пачуццяў, паводзін, перажыванняў, духоўнасць, інтэлігентнасць не па дыплому, а па ўнутранай сутнасці характараў уласцівы Сяргею і Рэгіне — галоўным героям гэтага твора. Майстэрства псіхалагізму, глыбокага бачання чалавека выявілася тут, як ні ў якім іншым апавяданні зборніка.

Нягледзячы на складаныя, нават драматычныя перыпетыі, апавяданне ўспрымаецца гімнам маладосці, жыццю, чалавеку, радасці існавання, працавітасці, сіле.

Але і гэтае апавяданне было ацэнена ў крытыцы неадназначна. Сяргей Гусак аднёс яго да лепшых у кнізе, на першы план вылучыўшы майстэрства псіхалагічнага аналізу, падтэксту. Рэзка адмоўную ацэнку атрымаў твор у рэцэнзіі Т. Хадкевіча. «Праўда, — заключае пісьменнік свае разважанні, у цэлым станоўча ацаніўшы зборнік «Млечны шлях», — іншы раз, шукаючы вострую, псіхалагічна напружаную сітуацыю, і В. Адамчык здраджвае свайму густу, уменню выбіраць з жыццёвых назіранняў найбольш важнае, характэрнае. Так, на мой погляд, няўдалым па самой задуме, мэтанакіраванасці атрымалася апавяданне «Ліповы цвет»...

Ад апавядання патыхае даўняй збітай схемай, якую пісьменнік імкнуўся напоўніць сучасным матэрыялам. І думка аб тым, якім шляхам праверыць свае пачуцці, фальшывая ў дачыненні да нашага сённяшняга чалавека. «Ліповы цвет» — пошукі не ў тым кірунку, у якім развіваецца творчасць В. Адамчыка», — без усякіх сумненняў выносіць пісьменнік свой катэгарычны прысуд у дачыненні да маладога аўтара, які знаходзіўся тады ў пошуку сваёй дарогі ў літаратуры, выпрацоўваў свой стыль, свае прынцыпы пазнання жыцця і чалавека ў ім. Парадокс заключаецца ў тым, што Т. Хадкевіч, папракаючы празаіка за схематызм, сам у гэтым выпадку мысліў старымі, аджылымі схемамі і канонамі. «...мне здаецца, — выступаў супраць такога падыходу да літаратуры Р. Сабаленка, — што таварыш, які ўгледзеў у апавяданні нядобры падтэкст, проста не зразумеў апавядання, не ўдумаўся ў яго псіхалагічныя паглыбленні, не заўважыў, што малады пісьменнік браў тэму не ў лоб, а стараўся глыбей пранікнуць у чалавечую існасць характару. І ў гэтым мо адна з асноўных і добрых якасцей маладога пісьменніка».

Сталае майстэрства, імкненне да авалодвання сакрэтамі псіхалагізму бачым мы і ў «Срэбры на павуцінні», гэтым, паводле вызначэння І. Навуменкі, «здзіўляюча тонкім апавяданні».

Крытыка ў гэты час стала больш пільна прыглядацца да творчасці празаіка і яго равеснікаў, хоць пакуль што яна не змагла цэласна асэнсаваць вопыт пакалення, уклад маладых пісьменнікаў у тагачасны літаратурны працэс. Ды і самі маладыя, пры ўсёй адметнасці іх галасоў, на першы погляд не давалі нечага такога, што магло б адразу абудзіць цікавасць да іх і прыкаваць грамадскую ўвагу. У гэтым плане (калі мець на ўвазе ў першую чаргу жыццёвы матэрыял, актуальнасць і вастрыню праблематыкі, навізну ідэйна-мастацкага зместу) своеасабліва яркай з'явілася творчасць В. Быкава, які рашуча ўвайшоў у літаратуру, даючы новае асэнсаванне ваеннай тэмы, чалавека на вайне, разбіваючы прывычныя каноны і схемы. І гэтым самым прадстаўнік пакалення, што вынесла на сваіх плячах галоўны цяжар вайны, ад пачатку і да канца спазнала яе жорсткую сутнасць, прымусіў загаварыць пра сябе не толькі беларускую, але і ўсесаюзную крытыку.

З напісанага маладзейшымі пісьменнікамі найбольш спрэчак абудзіў раман І. Пташнікава «Чакай у далёкіх Грынях».

Абмеркаванню рамана было прысвечана спецыяльнае пасяджэнне секцыі прозы, на якім, дарэчы, выступаў і В. Адамчык. Ён лічыў «неапраўданым залішне частае ўжыванне ў творы кароткай, усечанай фразы». Аднак на падставе газетнай інфармацыі нельга на поўніцу выявіць больш шырокае стаўленне празаіка да творчасці ягонага паплечніка.

«Пошукі ці літаратурная бравада?», «Звычайнае і незвычайнае» — так называліся артыкулы Васіля Крышталя і Навума Перкіна, прысвечаныя крытычнаму разгляду названага рамана І. Пташнікава. Тое, што было ў іх справядліва і дзе аўтары беспадстаўна папракалі пісьменніка, ігнаруючы яго творчую індывідуальнасць, — няхай ва ўсім гэтым з далечыні часу аб'ектыўна і цвяроза разбяруцца даследчыкі пташнікаўскай прозы. Для нас важна цяпер адзначыць, што першым раманам малады аўтар здолеў у значнай меры прыкаваць увагу не толькі да сябе, але і да ўсяго пакалення.

Творчасць маладых пісьменнікаў паступова ўваходзіць у арбіту зацікаўленасці беларускай крытыкі; прыцягвае да сябе ўвагу не толькі рэспубліканскіх, але і агульнасаюзных перыядычных выданняў. Ці не першай ластаўкай тут быў артыкул І. Навуменкі ў «Дружбе народов». «Іван Пташнікаў, Барыс Сачанка, Вячаслаў Адамчык, Уладзімір Караткевіч, — без гэтых імёнаў, якія ўвайшлі ў літаратуру ў апошнія гады, будзе няпоўным нават беглы агляд беларускай прозы», — пісаў ужо досыць вядомы ў той час празаік і даследчык роднай літаратуры.

Важнай, актуальнай і на сённяшні дзень уяўляецца нам сама методыка падыходу да асэнсавання літаратурнага працэсу, дзе побач з маладымі аўтарамі працуюць прызнаныя майстры мастацкага слова, зробленае якімі можа быць добрым урокам для моладзі.

«Але, — робіць крытык істотнае ўдакладненне, — калі параўноўваць аб'ектыўна, то трэба параўноўваць не творчасць сталага пісьменніка з першымі крокамі пачаткоўца, а роўнае з роўным, г. зн. літаратурную маладосць тых, каго мы лічым сёння масцітымі, з першымі кнігамі цяперашніх маладых».

У артыкуле развіваецца думка аб сувязі новага пакалення з папярэднікамі — Якубам Коласам, Кузьмой Чорным, Міхасём Лыньковым, Янкам Брылём, якія выявілі ў сваёй творчасці пачуцці глыбокай любові да роднай зямлі. «У гэтым сэнсе, — заключае І. Навуменка, — маладая беларуская проза верная традыцыям, якія склаліся даўно і трывала. Яна ўзбагачае гэтыя традыцыі, развівае іх далей, падчас яшчэ больш відавочна, шматгранна адлюстроўвае багацце навакольнага жыцця».

І. Навуменка першы паспрабаваў ахарактарызаваць найбольш вызначальныя рысы творчасці маладых: «Гэта проза радуе майстэрствам мовы, тонкай псіхалагічнай культурай, абвостранай увагай да маральна-этычных праблем. І, бадай, менавіта са з'яўленнем маладых навелістаў у беларускую прозу прыходзіць майстэрства гарманічнай светацені, паўтонаў. У гэтай прозе шмат агульнага з ўсёй сучаснай савецкай літаратурай: перапляценне эпічнага з лірычным, пранікненне ў прозу паэзіі лірычнага «я», у якім нібы зліваецца вобраз апавядальніка з аб'ектам яго апавядання».

Вядома, не да ўсіх празаікаў цалкам дастасоўваюцца гэтыя вызначэнні. Больш чым да каго з названых у артыкуле аўтараў, характарыстыкі гэтыя прыдатны да прозы самога І. Навуменкі ды Міхася Стральцова — у той час адных з найбольш яркіх «лірыкаў» у маладой беларускай прозе. Навуменка, як вядома, належаў да франтавога пакалення пісьменнікаў, хоць матывамі і асабліва ўнутранай мастацкай сутнасцю сваёй прозы бліжэйшы быў да маладых з іх імкненнем да абнаўлення зместу і формы апавядання.

Сведчаннем таго, што творчасць новага пакалення беларускіх пісьменнікаў усё больш завалодвала ўвагай грамадскасці, апрача ўсяго іншага, можна лічыць выхад бібліяграфічнага даведніка «Маладыя пісьменнікі Беларусі». Прадмову да яго напісаў Віктар Каваленка. Гэта, па сутнасці, другая пасля артыкула І. Навуменкі ў «Дружбе народов» спроба цэласнага асэнсавання вопыту пакалення, яго ролі і месца ў тагачасным літаратурным працэсе. Хоць абодва крытыкі гавораць пра адну і тую з'яву, яны выяўляюць розны падыход да яе. У Навуменкі, як памятаем, было імкненне паглядзець на зробленае

(Заканчэнне на стар. 6—7).

Надрукавана ў «Полымі»

НЕВЫЧАРПАЛЬНАСЦЬ ХАРАКТАРУ

Раману «Сачыненне на вольную тэму» Анатоля Кудраўца папярэднічае эпіграф: «Нараджаемся мы простымі людзьмі, а паміраць нам трэба было б як багам». Прайшоўшы з канца ў канец жыццёвае поле, чалавек, відаць, і сапраўды набывае спакойную ясную мудрасць —тое, чым надзялілі людзі прыдуманых багоў. Гэтыя словы Дзюлы Йеша спатрэбіліся пісьменніку, думаецца, для таго, каб падкрэсліць асноўную праблему рамана: мудрасць чалавека на зямлі — быць чалавечным.

Пры ўсёй сваёй традыцыйнасці і вонкава нешырокім ахопе падзей — у цэнтры твора лёс аднаго чалавека — раман А. Кудраўца бачыцца падключаным да надзвычай актуальнай праблемы сучаснасці: што пераможа — чалавечнасць ці бесчалавечнасць? Праўда, форма гэтай падключанасці—праз народны характар і народнае разуменне жыцця — ужо выпрабавана папярэднікамі. Аднак, можа, якраз не лішнім бывае паўтарыць старую, вывераную многімі пакаленнямі ісціну тады, калі некаторыя пачынаюць на яе забывацца, безвынікова шукаючы нейкую іншую, якая нібыта больш адпавядае імкліваму нашаму часу. Тым больш, што паўтарае яе А. Кудравец сапраўды па-мастацку. Думаецца, тая акалічнасць, што пісьменнік не прапанаваў новай, арыгінальнай канцэпцыі ў поглядзе на сучаснага чалавека, не дае падстаў гаварыць пра пэўную другаснасць твора ў параўнанні, скажам, з аповесцю Васіля Быкава «Знак бяды», раманам Івана Пташнікава «Алімпіяда». Як некалі сказаў пра адзін «ваенны» твор Нічыпар Пашкевіч, гэта паўтарэнне, але такое паўтарэнне, якое можа быць адкрыццём. Хіба не дае герой А. Кудраўца адказ на пытанне як жыць, у што верыць, за што трымацца ў сучасным «закручаным» свеце? Дае. І што самае каштоўнае — не ў выглядзе голага, правільнага сцвярджэння, а ўсім сваім жыццём, сваім стаўленнем да рэчаіснасці.

А. Кудравец належыць да тых пісьменнікаў, якія ўмеюць вялікае бачыць у простым і складанасць вымяраць прастатой. Галоўны герой рамана звычайны вясковы працаўнік. Самы звычайны і лёс у гэтага чалавека: у сваім жыцці ён касіў, араў, майстраваў і будаваў, кахаў, гадаваў дзяцей... Калі чужынец прыйшоў на яго зямлю, Ігнат Сцяпанавіч Вапшчэткі ўзяў у рукі зброю і дайшоў аж да Германіі. Але чым лепш пазнаёш героя, тым больш уяўнай пачынае здавацца яго звычайнасць. За ёй адкрываюцца глыбіні чалавечай дабрыні, мудрасці, дасціпнасці.

Як ваяваў Вапшчэткі ў партызанах, а пасля на фронце — пра гэта пісьменнік амаль не гаворыць, ён быццам нават знарок імкнецца пазбягаць у творы ўсяго таго, што выбіваецца з натуральнай плыні жыцця. Падрабязная «ваенная» біяграфія героя ў рамане адсутнічае, але аўтар ясна дае зразумець, што змагаўся з ворагам Ігнат Сцяпанавіч так, як і жыў усе свае гады: не хаваўся за чужыя спіны, без нараканняў нёс нялёгкую жыццёвую ношку, бачыў не толькі сябе — людзей з іх горам і радасцю.

Вельмі рэдка вяртаецца ва ўспамінах-разважаннях да падзей вайны і сам герой, пра якога ў пачатку рамана аўтар заўважыў, што «гуляць у маўчанку ён ніколі не любіў і не любіць». Думаецца, гэта не выпадкова. А. Кудравец ідзе за праўдай народнага характару. Наш народ нічога не забыў — ні добрага, ні дрэннага, — што было ў вайну. Але балючая, цяжкая памяць жыве ў яго душы, і рэдка, асабліва ў мужчын, ажывае ў словах. Ці шмат мы, пасляваеннае пакаленне, уведалі ад сваіх бацькоў, ад сваякоў і суседзяў той жорсткай і непрыгожай праўды, якая адкрылася ім у ліхі час? І гэтак жа мала чулі пра асабісты ўклад кожнага з іх у перамогу над ворагам. Што замінала ім расказаць: нежаданне варушыць гарачы прысак мінулага, традыцыйная сціпласць (няхай лепш другія пра мяне скажуць), шкадаванне да нашых уражлівых дзіцячых душ, перакананасць, што жахамі нельга «лячыць» людзей нават ад абыякавасці і інфантыльнасці?

Шмат быліц пачуе ад свайго старэйшага сябра і сваяка Валера, адзін з герояў рамана, і амаль усе яны будуць пра мірны час і мірных людзей. Ніколі не раскажа таксама Ігнат Сцяпанавіч, як адтавала яго душа пасля жорсткасці, убачанай на вайне, як ён радаваўся, што адкрыў у сабе «ўсякія слёзныя перажыванні». Наноў народжаная ў душы дабрыня навяла героя на думку, што, аказваецца, «у ім самім назапашана столькі такога ўсякага». «Гэта было як адкрыццё, быццам ён доўгі час лічыў сябе смяртэльна хворым, а пасля сабраліся дактары і сказалі, што гэта няпраўда, што страшны дыягназ не пацвердзіўся. Ён падумаў пра тое, што такое, мусіць, павінна быць і ў кожным чалавеку. Тады чаму яго так мала відна? Чаму людзі так старанна закопваюць у сабе тое, чаго самі прагнуць?» Ігнат Сцяпанавіч ніколі не стараўся закрыць на ключ усё добрае, што было ў яго душы. Такім людзям намнога цяжэй жыць, бо яны адчуваюць сваю віну нават там, дзе яе няма: перад дзецьмі загінуўшага сябра, перад удавой, якая не дачакалася мужа з вайны...

Вобраз Ігната Сцяпанавіча Вапшчэткі выпісаны натуральна, нязмушана. Здаецца немагчымым гаварыць пра нейкую праверку, учыненую аўтарам герою. Само жыццё правярае яго на чалавечнасць, і цяжка вызначыць, калі пачалася праверка: у вайну, у гады калектывізацыі?.. А можа, кожны наш крок і кожны ўчынак з'яўляюцца экзаменам на чалавечнасць? Толькі часам яго бывае здаць лягчэй, часам цяжэй, а часам і зусім немагчыма? Герой А. Кудраўца праверку вытрымлівае заўсёды. Ён можа быць розным, як розным бывае чалавек у шматстайных жыццёвых сітуацыях, — мяккім, спагадлівым, душэўным, рэзкім, зацятым, нават жорсткім, але ніколі — бесчалавечным. Вось размова з жонкай, якая, думаючы, што Ігнат загінуў, прыняла за гаспадара параненага партызана.

— Можа, і мне паплакаць разам з табой? Пажаліцца на тое, як я пабурыў вашы планы. Павінен быў памерці, ды застаўся жывы. І мала што застаўся жывы, яшчэ і дамоў прыцёгся... Вапшчэткі, а які ён быў... мой намеснік?

— Намеснік? — Марыну як ударылі.

— Ну а як жа я яго мушу называць... Тым болей, што і імя ў яго маё...

Але пасля гэтых з'едлівых і не зусім справядлівых слоў у душы Ігната Сцяпанавіча варухнулася гарачым клубком жаласць да жонкі, ён раптам адчуў і сваю віну. «Ты, Марына, мяне не падганяй. У кожнай болькі свая пара, і трэба, каб усё перабалела», — скажа Ігнат Сцяпанавіч праз хвіліну. І гэта будзе ўсё роўна як дараванне, герой знойдзе ў сабе сілы пераадолець адчужанасць і крыўду. Праз колькі часу сітуацыя зменіцца: вінаватым стане сам Ігнат Сцяпанавіч. Але тое, што ён упадабаў суседку Паліну, ні ў якім разе не помста жонцы.

Любоўныя чатырохкутнікі і трохкутнікі з-за празмернай іх эксплуатацыі пісьменнікамі добра-такі набілі аскоміну, аднак пра гэта неяк забываешся, калі чытаеш раман «Сачыненне на вольную тэму». Бо вельмі пераканальна, тактоўна, з глыбокім разуменнем чалавечай псіхалогіі паказаў А. Кудравец узаемаадносіны герояў.

У сучаснай літаратуры стала ледзь не традыцыяй, што героі нароўні з жонкай маюць пасію, але вельмі часта гэтая складаная жыццёвая сітуацыя падаецца спрошчана і павярхоўна, ператвараецца ў нейкі амаль абавязковы элемент сюжэта. Маральны грашок, якім надзяляюць аўтары сваіх дзелавых, сучасных, разумных, справядлівых, кругом станоўчых герояў, адыгрывае ролю процівагі, каб не страцілі героі канчаткова «праўдзівасці» і «жыццёвасці», не ператварыліся ў «ідэальных».

Як паказвае А. Кудравец, пачуццё, якое нечакана і разам з тым зусім непазбежна ўзнікла ў Ігната Сцяпанавіча і Па-

А. Кудравец. Сачыненне на вольную тэму. Раман. «Полымя», 1984, № 11.

...І ВА ЎСПРЫНЯЦЦІ КРЫТЫКІ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 4—5).

маладымі ў цеснай сувязі з папярэднім нацыянальным вопытам, з беларускай мастацкай традыцыяй. Каваленка робіць акцэнт на наватарстве твораў маладых — на тым, чым яны, на думку крытыка, перш за ўсё цікавыя і неабходныя літаратуры і грамадству: «Ад маладых людзей чакаюць нечага новага. Вось чаму прыход у літаратуру маладога пакалення пісьменнікаў ажыўляе, звычайна, думкі пра наватарства. Маладосць — гэта пошук». І. Навуменка таксама гаварыў пра тое новае, што ўносілі маладыя празаікі ў агульную плынь літаратуры, чула ўлоўліваў абнаўленне зместу, жанру і формы ў іх індывідуальным праяўленні, характарызуючы творчасць кожнага пісьменніка як аўтаномную з'яву, як цэласны мастацкі свет. Каваленка ж акцэнтуе ўвагу на агульным, што ёсць у творчасці маладых, як выніку грамадскіх змен, што адбыліся ў краіне.

Крытык, які ў гэты час актыўна выступаў супраць негатыўных тэндэнцый, што былі ўласцівы папярэдняму этапу, у дачыненні да творчасці маладых, думаецца, выдаў жаданае за рэальнае. Бо ў маладых усё ж пераважаў не сацыяльны, а маральна-этычны, агульначалавечы пафас, пра што, дарэчы, слушна пісаў у згаданым артыкуле І. Навуменка.

Пра тое, што ў маладой прозе на першым плане было вырашэнне маральна-этычных, агульначалавечых па сваёй сутнасці праблем, сведчыць і трэці зборнік В. Адамчыка «Міг бліскавіцы», прынамсі лепшыя з уключаных у яго твораў. Да іх ліку з поўнай падставай варта аднесці апавяданне «Песня».

Вяртаючыся да настойлівых рэкамендацый крытыкаў, іх пажаданняў В. Адамчыку засяродзіцца выключна на сучаснасці, бо нібыта толькі адна яна здольна гарантаваць празаіку поспех, здзяйсняць выхаваўчыя задачы і абуджаць цікавасць чытача, хацелася б адзначыць: не так істотна, які матэрыял кладзецца ў аснову творчасці, а важная асабістая далучанасць аўтара да жыцця, яго суперажыванне і хваляванне за лёс герояў.

Трэба сказаць, што да гэтага часу ў нашай крытыцы, у яе найбольш чулай да літаратуры частцы ўсталявалася правільнае і глыбокае разуменне праблемы сучаснасці мастацкага твора. Ва ўсякім разе ў артыкуле Рыгора Шкрабы «Пачуццё стылю», прысвечанага аналізу творчасці В. Адамчыка, няма нават слабых намёкаў на тое, што вартасць асобных твораў празаіка знаходзіцца ў непасрэднай залежнасці ад іх злабадзённасці — наадварот, у падтэксце гаворкі прысутнічае прыхаваная спрэчка з тэндэнцыяй пазаэстэтычнага разумення літаратуры, якое паступова ператваралася ў своеасаблівую крытычную анамалію. Вось як пра закранутую намі праблему пісаў Павел Дзюбайла ў артыкуле, датаваным 1962 г.:

«Цяпер ужо рэдка сустракаюцца людзі, якія разумеюць сучаснасць у літаратуры спрошчана, атаясамліваюць яе з сучаснай тэмай. Паняцце сучаснасці значна шырэйшае і глыбейшае. Пісаць па-сучаснаму — значыць пісаць на ўзроўні лепшых дасягненняў сённяшняй мастацкай літаратуры, пісаць для цяперашняга, эстэтычна чулага чытача, які ўжо не жадае і не можа прымаць паўпраўду, надакучлівую агульшчыну, халодную рыторыку, траскучую дэкларатыўнасць, фармалістычныя выкрутасы. Патрабаванне сучаснасці твора, — гэта і патрабаванне інтэлектуальна багатага героя».

Апавяданне «Урок арыфметыкі», як і «Песня», прысвечана дням мінулым. У цэнтры твора таксама характар падлетка, у душы якога празаік імкнецца адкрыць працэс абуджэння чагосьці новага. Але наколькі адрозніваюцца мастацкімі якасцямі, узроўнем мыслення гэтыя два творы!

Погляд збоку, на нашу думку, стаўся асноўнай прычынай пралікаў, прывёў да пэўнай імітацыі пачуццяў, што асабліва кідаецца ў вочы на фоне аповесці Я. Брыля «Сірочы хлеб».

Атмасфера ваеннага часу, нягледзячы на многія дакладна ўбачаныя рэаліі, адчуваецца ў псіхалогіі характараў слаба, амаль цалкам перакрываецца нейкім ненатуральным для сялянскага хлопчыка ў той час захапленнем ювелірнымі і касметычнымі ўпрыгожваннямі Чаславы Карлаўны, што, дарэчы, было трапна падлоўлена Рыгорам Бярозкіным.

«І пачынаецца ў апавяданні, — пісаў крытык у рэцэнзіі на трэці зборнік Адамчыка, — нешта неверагоднае па засіллі вонкавага, павярхоўнага «галантарэйна-шыкоўнага», і засмучае гэтая пісьменніцкая схільнасць да знешняга, тым больш што перад намі не гарадскі «кавалер», а вучань, вясковы хлопец, па сутнасці Тонік з апавядання «Салодкія яблыкі».

А колькі тут «мануфактуры» і ўсё на тым манекене, што носіць чалавечае імя — Часлава Карлаўна!»

Зусім супрацьлеглую думку і пра гэты вобраз, і пра апавяданне ў цэлым выказаў Міхась Ярош. У рэцэнзіі з характэрнай назвай «Праўда чалавечага сэрца» крытык, адзначыўшы, што «нам цяжка ўявіць аблічча гэтай, так апаэтызаванай дзіцячай фантазіяй настаўніцы. Цяжка хаця б таму, што мы не адчуваем яе душы, яе парываў, не пранікаем у свет яе думак», быццам спалохаўся сур'ёзнасці зробленых крытычных закідаў, якімі ў прынцыпе адмаўлялася духоўнасць, гэта значыць рэальнае мастацкае існаванне вобраза, паспяшаўся агаварыцца, што «гэта, пэўна, не вельмі і важна», бо апавяданне, маўляў, «мае зусім іншы творчы прыцэл». «Урок арыфметыкі»—гэта вельмі шчырая, даверлівая размова пра чысціню, хараство душы чалавека, у якой усё яшчэ ўперадзе, якому ўжо цесна ў няўтульнай будзённшчыне, якога цягне нязведанае, рамантычнае. Гэта размова вядзецца проста, без усялякай прэтэнзіі на знешнюю займальнасць, на эфект».

Трэба сказаць, што момант рамантычнага непрыняцця хлапчуком «грубай» рэальнасці трапна схоплены і празаікам, і крытыкам, бо для дзіцячага светаўспрымання сапраўды ўласціва імкненне ўвышыню, да нязведаных жыццёвых далягляда́ў, незадаволенасць існым, вольны палёт мары. Прыгадаем хоць бы горкаўскіх хлапчукоў (аповесць «Дзяцінства») з іх летуценнямі пра горад на Каме, матухне-рацэ, да якога не дастаць рукамі, не дайсці нагамі... У працытаваным намі абзацы Ярошавай рэцэнзіі мы не можам пагадзіцца з заключнымі радкамі пра тое, што ў апавяданні В. Адамчыка «размова вядзецца проста, без усялякай прэтэнзіі на знешнюю займальнасць, на эфект». Прастаты, шчырасці, натуральнасці інтанацыі, унутранага цяпла і душэўнансці—рысаў, глыбока арганічных лепшым творам Адамчыка, — якраз і бракуе апавяданню «Урок арыфметыкі».

Думаецца, што не так асабіста перажытае і душэўна блізкае аўтару, як надуманае, арыентаванае на гатовыя літаратурныя ўзоры, паказаў тут празаік, што і абумовіла неакрэсленасць думкі, у імя якой твор пісаўся. Назва апавядання—«Урок арыфметыкі»—не была шырокага гучання, як скажам, назва твора Валянціна Распуціна «Урок французскай», успрымаецца ў яе канкрэтным значэнні, бо ніякіх, ва ўсякім разе, колькі-небудзь значных жыццёвых, маральна-этычных урокаў герой, а разам з ім і мы, чытачы апавядання, не атрымалі.

Найбольш чулыя крытыкі заўважылі небяспеку для аўтара душэўнай абыякавасці і ў час прабілі трывогу: «Паглядзі-

ліны, гэта адначасова і шчасце, і драма. Шчасце, бо нібыта яркім сонцам яно асвяціла на нейкі момант іх існаванне, зрабіўшы навакольны свет нязвыкла прыгожым, абудзіла ў іх радасную прагу жыцця. Драма, бо адзін з іх не вольны, а радасць ад сустрэч не змяншае пакут сумлення, адчування вінаватасці перад людзьмі, перад жонкай і дзецьмі. У герояў А. Кудраўца пачуццё сапраўднае, а не надуманы «ажыўляж», дзе імітуюцца моцныя страсці і перажыванні, таму, пэўна, яны такія па-чалавечы прыгожыя і мудрыя ў сваіх учынках.

У спасціжэнні характару героя шматаспектным становіцца ў творы і само разуменне чалавечнасці. Дабрыню, спагадлівасць, чуласць, справядлівасць, сумленнасць, смеласць, мужнасць і шмат што іншае выяўляе пісьменнік у цэласнай, багатай, моцнай натуры Ігната Сцяпанавіча.

Паказваючы высокую маральнасць, духоўнасць, чалавечнасць свайго героя, А. Кудравец не адкрывае нешта невядомае. У літаратуры гэтыя якасці сталі бадай што «родавымі» для прадстаўнікоў старэйшага пакалення. І ўсё ж ёсць пэўныя адрозненні паміж Ігнатам Сцяпанавічам і, скажам, героямі аповесцей Алеся Жука «Халодная птушка», «Паляванне на апошняга жураўля», героямі апавяданняў Віктара Карамазава «Дзяльба кабанчыка», «Сямёнаўна», «Галапагосы», героямі многіх іншых твораў. Ігнат Сцяпанавіч не выклікае шкадавання: ён занадта моцны для гэтага, сапраўды, як той дуб, з якім яго параўноўвае пісьменнік. Такі паказ чалавека, не пераможанага ні НТР, ні часам, думаецца, вельмі пажаданы для нашай прозы, якая ўжо колькі дзесяцігоддзяў «са слязой» у голасе апавядае пра лёс старэйшага пакалення. Безумоўна, жаль, шкадаванне, калі яны ўзнікаюць пры чытанні твораў, — якраз патрэбныя «сантыменты» для нашага эмацыянальна глухаватага сучасніка. Але ж не адны ўдовы і ўдаўцы жывуць у вёсцы, не адны старыя інваліды, нехта ж і жыта сее, і каровы доіць, і ўнукаў няньчыць...

Праўда, шчымлівыя ноткі суму і смутку гучаць і ў рамане «Сачыненне на вольную тэму». Герой заўважае, напрыклад, не лепшыя змены, якія адбываюцца сёння з вёскай і яе людзьмі, і яны болем адгукаюцца ў яго сэрцы: «Сяла, якое ён ведаў— пасёлак ля пасёлка, хата ля хаты, — лічы што, не было. Сяло пабілася на хутары. Некалькі хат — потым разрыў, яшчэ некалькі хат — і зноў разрыў. Дзіўна было і сумна бачыць усё гэта Ігнату Сцяпанавічу. Здаецца, гэта ўчора было, як збіраліся яны ў пасёлкі, гуртаваліся, сцягваліся з хутароў. Столькі людзей. Будаваліся адзін перад адным, садзілі сады...». З горкай усмешкай успамінае Ігнат Сцяпанавіч старшынёўства Заборскага, яго імкненне ўсё сабраць «у адзін кулак»: і вёскі, і малыя пасёлкі, і гаспадарчыя пабудовы. Але няма ў рамане адчування безвыходнасці. Жыццё, няхай і з памылкамі, з цяжкасцямі, са стратамі, якіх можна было б і пазбегнуць, працягваецца. А ў гэтым жыцці, не кідаючыся ў паніку з-за яго недасканаласці, надзейна, сумленна, разумна робіць сваю справу —загадчыкам калгаснага млына, цесляром, касцом, земляробам — Ігнат Сцяпанавіч.

Паводле Кудраўца, чалавечнасць перамагае і павінна перамагчы. Так, перамогай Ігната Сцяпанавіча заканчваецца яго процiборства са Стасем Мастоўскім, які ў гады акупацыі пайшоў на службу да фашыстаў, а па вайне бадзяўся ў ваколіцах і рабаваў людзей. Сутыкненне герояў адбылося не з-за нейкіх асабістых антыпатый і стасункаў. Тут, як паказвае пісьменнік, сутыкнуліся два розныя погляды на жыццё, на сэнс чалавечага існавання. У час апошняй размовы з былым аднавяскоўцам, калі спрабаваў таго пераканаць здацца, Ігнат Сцяпанавіч гаворыць: «Некалі ты хацеў, каб людзі думалі, што ты смелы, а цяпер, акрамя як праз аўтамат, і слова сказаць не ўмееш. Я гэта, вапшчэткі, гавару для таго, каб ты помніў, што вайна на злосці дзержыцца, і ты дарэмна хочаш распаліць яе ва ўсіх за тое, што загнаў сябе ў такі тупік, калі трэба ці падняць рукі ўгору, ці зрабіць другое што якое смелае». Тут раскрываецца яшчэ адна рыса характару героя—неарганічнасць для яго нянавісці і злосці. Ігнат Сцяпанавіч высачыў бандытаў, бо не мог забыцца, як Мастоўскі расправіўся з яго таварышамі-партызанамі Вержбаловічам і Шалаём, не мог пагадзіцца з тым, што па-ранейшаму не ведаюць спакою ўдовы і сіроты. Але для героя сапраўды не зразумелае жаданне помсты і жаданне смерці іншага чалавека, нават «не свайго», якім стаў Мастоўскі.

— Вапшчэткі, ты і ўзапраўду забіў бы мяне?

— Трэба было.

— Хацеў бы я ведаць: а за што?

— За ўсё...

— «Усё» — гэта нішто. «Усяго» разам не бывае...

— Вы заўсёды хацелі маёй смерці...

Ігнат Сцяпанавіч запярэчыў:

— А гэта, вапшчэткі, няпраўда. Ты ведаеш гэта... Яна і цяпер нікому не трэба...

Спакойная сіла і ўпэўненасць, што гучалі ў голасе Ігната Сцяпанавіча, зусім вывелі з раўнавагі Мастоўскага. Ён не захацеў зрабіць апошні свой крок крокам да чалавечнасці. Аднак гэты крок зрабіў яго напарнік...

Праблему чалавечнасці А. Кудравец вырашае на сваім нацыянальным грунце, вырашае падкрэслена традыцыйна. Яго Ігнат Сцяпанавіч Вапшчэткі вельмі зямны, канкрэтны і зразумелы. Такі ж канкрэтны, знаёмы і блізкі свет, у якім існуе герой. Толькі ў самым канцы рамана пісьменнік, быццам успомніўшы модныя сёння заклікі глядзець на рэчаіснасць з вышыні, бо адтуль, маўляў, можна больш убачыць, сягнуў разам з безыменным і нябачным лётчыкам у неба, каб адтуль зірнуць на «шэра-белае ліпніцкае поле і Яворскі лес, і дарогу, што прамой лініяй рассякала лес на дзве часткі. Дарога вяла з Клубчы ў Ліпніцу, адтуль — у раён і ва ўвесь свет». Такое далучэнне Ліпніцы, у якой адбываюцца падзеі, да ўсяго свету здаецца трохі нечаканым. Вобраз Ігната Сцяпанавіча, якім мы бачым яго на апошняй старонцы рамана — са сваім ціхім вінаватым смехам (для Валеры, бо падбіў таго на няўдалае паляванне) і шчырай светлай радасцю за дзіка, за тое, што ён не паддаўся на чалавечыя хітрыкі, — думаецца, і без таго маштабны і значны.

Пяць гадоў назад, калі было надрукавана апавяданне А. Кудраўца «Ігнат Сцяпанавіч Вапшчэткі», Уладзімір Гніламёдаў у адным з артыкулаў пісаў: «Пісьменнік... напаткаў цікавы, значны, па-сапраўднаму народны характар, якога, відаць, магло б хапіць на раман, настолькі багаты і павучальны яго жыццёвы вопыт і вельмі трывалы і шматгранны духоўны запас». Аддамо належнае пранікліваści крытыка, бо сапраўды для гэтага героя жанравыя рамкі рамана аказаліся па мерцы, ён—цэнтральная фігура ў новым творы пісьменніка. Характарызуючы Ігната Сцяпанавіча, якім ён паўстае са старонак апавядання, У. Гніламёдаў зазначыў наступнае: «Як з'ява мастацтва — ён невычарпальны. І гэтую невычарпальнасць яму надае паўнакроўная сувязь з народным жыццём, павага да жыцця, да яго натуральных, разумных форм». Тое, што крытык убачыў тады ў патэнцыі (сам па сабе змест апавядання ўсё ж не даваў падстаў для такіх шырокіх высноў), якраз выявілася ў рамане.

Таіса ГРАМАДЧАНКА.

СТАРОНКІ Ў ЛЕТАПІС НЕЎМІРУЧАСЦІ

Значнасць здзейсненага тым ці іншым творцам яшчэ больш пазнаецца на адлегласці. Найлепшае пацвярджэнне таму—напісанае Іванам Паўлавічам Мележам, народным пісьменнікам Беларусі, лаўрэатам Ленінскай прэміі. Год за годам адмервае несупынны час з дня яго смерці і адначасова ўпісвае ўсё новыя старонкі ў летапіс неўміручасці аднаго з самых выдатных творцаў сучаснасці. Перавыдаюцца і перакладаюцца кнігі І. Мележа, усё новыя даследчыкі звяртаюцца да аналізу яго глыбіннай, па-сапраўднаму непаўторнай і народнай прозы.

І вось яшчэ адно сведчанне пашаны да таленавітага майстра слова — выдавецтва «Беларусь» толькі што выпусціла альбом «Сказ пра Івана Мележа». Аўтары—складальнік Алесь Адамовіч і вядомы фотамайстра Уладзімір Крук (выкарыстаны таксама здымкі з сямейнага архіва пісьменніка) вядуць рэпартаж аб жыцці і творчасці Івана Паўлавіча, расказваюць аб дарогах, па якіх ён прайшоў, знаёмяць з людзьмі, з кім давялося яму сустрэцца на гэтых сцяжынах.

Альбом скампанаваны як расказ пра жывога Мележа. Безумоўна, прысутнічаюць успаміны тых, хто яго добра ведаў. Вядома, аб многім, як і бывае ў падобных выпадках, гаворыцца ў мінулым часе. І ўсё ж адчуванне такое, што ён недзе поруч — чалавечны чалавек, прынцыповы грамадзянін, ідэйна перакананы камуніст, цудоўны пісьменнік. Гэтаму ў немалой ступені спрыяе тое, што ў альбоме няма ніводнага здымка, які б гаварыў сваімі скупымі фарбамі ці аб смерці Майстра ці аб увекавечанні яго памяці.

Усе здымкі — а іх увайшло ў альбом каля васьмідзесяці — расказваюць пра жывога Мележа. Старонка за старонкай перагортваецца летапіс яго жыцця і творчасці. І гэтаксама старонка за старонкай упісваюцца ў летапіс неўміручасці. Рэдкія імгненні, схопленыя фотаапаратам, з ваеннай і пасляваеннай пары, сустрэчы з землякамі і блізкімі людзьмі, але найбольш здымкаў адлюстроўваюць падзеі шасцідзесятых-сямідзесятых гадоў, калі найбольш плённа і ўсебакова развіваўся талент пісьменніка, калі ён уступіў у тую шчодрую пару сваёй творчай сталасці, якая засведчыла аб самабытнасці таленту, той ступені яго, якая здольна нацыянальную літаратуру паказаць усяму свету.

«Сказ пра Івана Мележа» — сказ і пра літаратуру, якую ён рухаў наперад, ствараючы кнігі, вартыя ўвагі ўсіх, хто любіць прыгожае пісьменства.

В. ЗАЯЦАЎ.

це, што выходзіць, калі пісьменнік ставіць перад сабою сур'ёзную даследчыцкую задачу, імкнецца разабрацца ў складанасці жыцця. Паглядзіце, што бывае, калі ён расказвае пра выпадак, з якога нічога не вынікае, які не прымушае чытача думаць».

«Я,—расшыфроўваў сваю думку Шкраба,—маю на ўвазе глыбокае, напісанае з сапраўдным веданнем жыцця апавяданне «Дзень ранняй восені» і павярхоўную замалёўку «Міг бліскавіцы».

«Міг бліскавіцы»,—пісаў таксама Ярош,—тут хоць у пэўнай ступені і загадкавы, рамантычны, аднак не такі ўжо і прывабны, бо бліскавіца не асвятліла душы героя так, каб па-сапраўднаму ўбачылі яе, зацікавіліся героем, задумаліся разам з ім над складанасцю жыцця...

Уяўны ці, калі можна так сказаць, апісальны псіхалагізм тут нярэдка замяняе сапраўдны аналіз пачуццяў»,—трапна заўважае крытык адносна апавяданняў «Міг бліскавіцы» і «Белы снег».

З той жа з'едлівасцю, што і «Урок арыфметыкі», прааналізаваны два апошнія апавяданні ў рэцэнзіі Р. Бярозкіна, які адзначаў надуманасць сюжэта, псіхалагічную непераканальнасць учынкаў герояў, бездухоўнасць іх пачуццяў.

Глыбінёй думкі, арыгінальнасцю мастацкай формы не вызначаецца і апавяданне «Пах летніх траў», у аснове якога расказ пра паездку аўтара ў родныя мясціны. «Ты будзеш дома» — такім сказам завяршаецца апавяданне. Ну і будзь сабе на здароўе!—адкажа чытач, бо ні да чаго іншага аўтар яго не падвёў.

Ці правільна мы робім, апелюючы да чытача? Нам апавяданне нічога не дало, а ў некага, магчыма, абудзіць штосьці дарагое і шчымлівае. З захапленнем, напрыклад, пісаў пра гэты твор Р. Шкраба, зазначаючы, «што пісьменнік верыць у магію мастацкага слова, верыць у здольнасць перажыванне аднаго чалавека зрабіць перажываннем многіх», што «такія творы выхоўваюць. Яны вучаць не праходзіць міма хараства прыроды і чалавечай душы».

Але ці не занадта «паддаўся» паважаны крытык і сам «магіі слова», ці не залішне захапіўся ўласнымі пачуццямі, абуджанымі згадкамі пра паездку ў родныя мясціны, ці не ўзялі верх эмацыянальныя адносіны над рацыянальнымі, без чаго наўрад ці магчымы аб'ектыўны крытычны аналіз твора?..

Як бачым, станаўленне празаіка адбывалася досыць няроўна. Адчувалася гэта не толькі ў першым і другім зборніках, але і ў трэцім. Вось што пісаў пра «Міг бліскавіцы», у пэўным сэнсе завастраючы праблему, Р. Бярозкін: «Гэта кніга здзіўляе сваімі кантрастамі: чытаеш адно апавяданне — усё вынашана, змястоўна і проста; чытаеш другое — усё выдумана, і бегла, і цьмяна...»

Крытык, гаворачы пра ўсё, мяркуем, перабраў меру: нават у больш слабых апавяданнях В. Адамчыка адчуваецца вопытная рука ўжо досыць сталага празаіка.

Больш памяркоўнымі ў ацэнцы трэцяй кнігі Адамчыка былі М. Ярош і Р. Шкраба. Паказальна, што апошні з іх творчасць маладога аўтара ставіць у цэнтр грунтоўнага памерамі і канцэпцыяй артыкула, усёй сваёй сутнасцю і пафасам скіраванага супраць артыкула Уладзіміра Карпава «Погляд назад». Шкраба пераканаўча паказвае, што не толькі ў такім маштабным творы, як «Людзі на балоце» Івана Мележа, але і ў «лакальных» апавяданнях яшчэ маладога празаіка глыбока арганічна адчуваецца пафас незваротных змен, непрымірымасць да аджылага і дагматычнага.

Творчасць В. Адамчыка, як і яго паплечнікаў — У. Караткевіча, І. Пташнікава, Б. Сачанкі, У. Дамашэвіча, М. Стральцова, І. Чыгрынава, А. Кудраўца,—у гэты час, у сярэдзіне шасцідзесятых гадоў, перастала ўжо ўспрымацца крытыкай як з'ява выключна маладой прозы, усё больш актыўна ўключалася ў агульны літаратурны працэс, выяўляла яго агульныя заканамернасці і тэндэнцыі, уносячы, разам з гэтым, штосьці істотна адметнае, своеасабліваe.

Як мы мелі мажлівасць пераканацца, крытыка вельмі зацікаўлена аднеслася да творчасці маладога пакалення беларускіх празаікаў. Тое ж, што часамі здараліся розначытанні адных і тых самых твораў, — з'ява зразумелая і ў пэўным сэнсе заканамерная: крытыкі жывыя людзі, не застрахаваныя ад памылак. І калі мы сёння ўдакладняем паасобныя ацэнкі, то гэта зусім не значыць, што менавіта нам тут належыць апошняе слова. Ад памылак, асабліва ў такой тонкай справе, як мастацкая творчасць, ніхто не застрахаваны. Адзінае, чаго нельга дазваляць, дык гэта свядомага фальшу, беспрынцыпнасці, падпарадкавання сваіх эмоцый пазалітаратурным меркаванням, выкарыстання сваёй прафесіі супраць аўтара, які табе нечым не дагадзіў.

Вось гэтай хваробы, якая вымагае гаворкі не толькі аб прафесійных здольнасцях крытыка, але і пра яго чалавечую добрасумленнасць, нават у творчасці аўтараў, што адчувалі на сабе прыкметны ўплыў дагматычных установак ранейшага часу, тады, у другое пасляваеннае дзесяцігоддзе, не заўважалася.

Між тым сёння хвароба гэтая пачынае праяўляцца ў дзейнасці паасобных літаратараў. Асабліва прыкметная яна ў агульным спакойным і ўраўнаважаным тоне гаворкі, што запанаваў апошнім часам у нашай крытыцы, якой у асноўным уласцівы вывераныя і дакладныя крытэрыі ў падыходзе да літаратурнага працэсу. Але не-не дый здараецца, што жанглiраванне фразамі выдаецца за найбольш важкае, найноўшае слова. Мы ці не парабіліся залішне раўнадушнымі і асцярожнымі, каб сказаць слова праўды пра таго ці іншага масцітага літаратара або яго маладзейшага наступніка і гэтым самым як бы заблытваем іх, а часам і падштурхоўваем ісці назад. Даволі часта ловіш сябе на думцы, што крытыка цікавіць творчасць альбо твор таго ці іншага пісьменніка ўсяго толькі як матэрыял для ілюстрацый да сваіх уласных канструкцый і тэорый. З гэтага пункту гледжання твор і нават творчасць анатаміруецца, ухваляецца або закрэсліваецца, адмаўляецца. Часам насуперак ранейшым вывадам самога крытыка—пасля таго, як у яго з'явілася новая «тэорыя». Але пра гэта мы ўжо казалі.

Таму ўзнікае правамернае пытанне: каму такая крытыка патрэбна? Задача крытыкі не ў тым, каб ствараць загадзя няправільнае ўяўленне пра літаратуру, а якраз у адваротным — дапамагаць чытачу разабрацца ў яе сапраўднай сутнасці, а пісьменніку—у самім сабе. Без узаемнага даверу дасягнуць гэтага проста немагчыма...

РЭПЕРТУАРНАЯ СТАРОНКА

НА ярка асветленай сцэне два вядучыя (пажадана юнак і дзяўчына).

1 вядучы: Беларусь-партызанка.

2 вядучы: 40-годдзю Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне прысвячаецца!

Як бы здалёк чуваць першыя музычныя сказы песні «Свяшчэнная вайна». Вядучыя ідуць са сцэны. Грымець выбухі, на імгненне святло гасне і ярка ўспыхвае.

2 вядучы:
Які ты расклала агонь,
вайна, —
Жывое усё губячы скрозь,
Белай-бялюткай бяроза была
і пачарнела ўся вось...
Такога агню не знала зямля,
стыхіі лютай такой.
Вёска гарыць сярод белага
дня,
Горад гарыць за ракой...

Гучыць мелодыя песні «Свяшчэнная вайна», дэманструюцца кінакадры або слайды аб вайне. У гэты час за сцэнай па мікрафоне 1 вядучы (мужчына) на фоне музыкі чытае словы Янкі Купалы: «Я ведаю, што будзе рабіць мой народ...» У занятых ворагам раёнах створацца партызанскія атрады — конныя і пешыя. Вока — за вока, зуб — за зуб адказнам мы фашыстам, не дадзім ім ні дня, ні спачынку...»

На словах «Я ведаю...» музыка гучыць цішэй, затым зусім знікае. На словах «створацца партызанскія атрады» пачынае гучаць ціха ў грамзапісу кантата А. Багатырова «Партызаны» на тэкст верша Я. Купалы «Беларускім партызанам». На гэтым музычным фоне 3, 4 і 5 чытальнікі працягваюць тэкст з артыкула Янкі Купалы, які гучаў за сцэнай (чытальнікі стаяць плячо ў плячо).

3 чытальнік: Паляцяць у паветра масты, склады і абозы.
Любяць у Беларусі прошаных гасцей і не любяць няпрошаных...

4 чытальнік: Пакуль будзе жыць хоць адзін беларус, не будзе на беларускай зямлі спакою фашысцкім захватчыкам, горкае будзе іх жыццё...

5 чытальнік: З кожнага дрэва, з кожнага яра будуць сачыць за ім зоркія партызанскія вочы...

Кантата А. Багатырова гучыць грамчэй. На сцэну выходзяць 1 вядучы, на фоне музыкі ён чытае некалькі строф верша Я. Купалы «Беларускім партызанам»:

1 вядучы:
Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны!
За няволю, за кайданы
Рэйхце гітлерцаў паганых,
Каб не ўскрэслі век яны.

(Чуюцца выбухі).

Клічу вас я на бяседу,
Хай вам шчасцем свецяць дні,
Выразайце людаеду,
Каб не стала іх і следу
На святой нашай зямлі...
Не давайце гадам сілы
Над сабою распасцерць,
Рыйце загадзя магілы,
Як шакал, кінуўся галодны,
На Беларусь, што леты, зімы
Жыла шчасліваю, свабодная...

Мой край расквечаных
прастораў
Сваім салдацкім топча ботам...
Ой, і адпомсціць за ўсё гора
Народ, за кроў, за сон пад
плотам!

Гучыць мелодыя песні «Свяшчэнная вайна».

1 вядучы (стаіць з правага боку сцэны):
Не шкадуйце, хлопцы, пораху,
Куль гарачых і гранатаў.
Усе, каму свабода дорага,
Вырывайце з жывых жылы,
Кроў за кроў, а смерць за
смерць!

(Музыка сціхае).

Партызаны паўтараюць апошні радок («Кроў за кроў, а смерць за смерць»). У грамзапісе гучыць прыпеў песні «Свяшчэнная вайна», усе выканаўцы спяваюць яго. Апошнія словы «Идет война народная» паўтарае 1 вядучы: «Ідзе вайна народная, свяшчэнная вайна!...»

Партызаны і іншыя ўдзельнікі размяшчаюцца на сцэне, як партызаны на прывале: адзін чысціць вінтоўку, другі прышывае гузік, дзяўчына папраўляе павязку на руцэ параненага, два партызаны гавораць памiж сабой, яшчэ адзін піша ліст, іншыя сядзяць ля ўяўнага кастра, усе ціха напяваюць мелодыю песні «Ой, бярозы ды сосны...» Адзін партызан чытае газету, здрывеецца ад яе на хвіліну:

Янка Купала. «Зноў будзем шчасце мець і волю».
Усе пачынаюць слухаць.

1 партызан:
Лютуе Гітлер ашалелы,
Яму ў Германіі зацесна,
Яму пад ногі дай свет цэлы,
Хай гіне ў муках свет
балесных...

На Беларусь, маю радзіму,
Узнімаецца на ворагаў, на
катаў!

(Музыка сціхае)

2 вядучы: Партызанскі рух шырыўся на Беларусі. Сакратар Мінскага падпольнага абкома партыі Герой Савецкага Саюза Васіль Іванавіч Казлоў піша ў сваіх успамінах (чытае тэкст з кнігі): Вядомай дырэктывай ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР ад 29 чэрвеня 1941 г. была намечана праграма дзейнасці партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый па разгортванні партызанскага руху. Створаныя партызанскія атрады дзейнічалі, прымалі ўсё новых людзей.

Ціха гучыць мелодыя песні «Ой, бярозы ды сосны».

1 і 2 вядучыя выходзяць, з'яўляецца 3 вядучы, становіцца з левага боку сцэны.

3 вядучы: У 1942 годзе ў партызанскую брыгаду прыйшло пяць родных братоў Жураўскіх з вёскі Янава Талачынскага раёна — Іван, Мікалай, Васіль, Аркадзь, Казімір. Спачатку партызанамі сталі Іван і Мікалай, а неўзабаве да партызан далучыліся яшчэ тры браты. (На сцэну выходзяць трое хлапцоў, два з іх зусім маладыя. Партызаны іх вітаюць. Без слоў хлопцы садзяцца, нешта як бы гаворадь).

Гучыць кантата А. Багатырова «Партызаны», пасля першых музычных фраз не адзін з партызанаў устае і чытае радкі верша А. Астрэйкі: «Беларусы-партызанка»:

Спее волі і шчасця прыход,
Што расце на франтах і
палянках.
Не зламаць, не сагнуць мой
народ,
Бо уся Беларусь — партызанка.

Пасля гэтых слоў усе партызаны ў адпаведнасці з музыкай кантаты спяваюць першую

Беларусь-партызанка

Інсцэніроўка паводле твораў дакументальнай і мастацкай літаратуры

Інсцэніроўка паводле твораў дакументальнай і мастацкай літаратуры

Музыка сціхае. Дзяўчыны застаюцца на сцэне.

Выходзіць наперад адзін з удзельнікаў інсцэніроўкі і прамінённа, нібы думае ўслых, чытае ўрывак з кнігі А. Бялевіча «Споведзь сэрца»:

«Кожнага чацвёртага не стае. Кожны чацвёрты беларус загінуў, згараў у пякельным агні вайны. Ні сонца, ні зорак не ўбачыць кожны чацвёрты... Людзі! Пакланіцеся, дарагія людзі, кожнаму чацвёртаму! Пакланіцеся той удаве, якая мужа не дачакалася! Пакланіцеся таму сыну, які ў лесе, у чыстым полі бацьку гукаў, не дагукаўся! Пакланіцеся воінам, партызанам, якія здабылі нашу перамогу!»

Адна з дзяўчат: «Пакланіцеся на неба сонцу, яное асвятлае, апраменьвае нашы шлях-дарогі ў будучыню!»

2 вядучы: У імя жыцця, у імя сонца, будучыні беражыце мір!

Гучыць песня «Бухенвальдскі набат».

1 вядучы:
...Стрэлкі барометра хістка
хістаюцца
І прыпыняюцца на
«неспакойна»...
Значыцца, войны не
выключаюцца,
Значыцца, некім ізноў
намячаюцца
Новыя войны.

2 вядучы:
Хто ж, адкажыце, у тым
вінаваты,
Што на зямлі так ільецца
багата
Слёз і крыві?

1 вядучы:
Покуль намеры, як стрэлкі,
хістаюцца,
Будзем жа, людзі, да лёсу
няўмольны!
Войны зіколі дабром не
канчаюцца —
Усе разам:
Спынім аж войны!

Гучыць музыка, заслона закрываецца.

У інсцэніроўцы «Беларусь-партызанка» выкарыстаны вершы Я. Купалы, М. Танка, А. Бялевіча, Н. Гілевіча, Е. Лось, А. Лойкі, А. Бачылы, А. Астрэйкі, А. Вярцінскага, А. Ушакова, а таксама матэрыялы кніг «У лясах Беларусі» (склад. А. Сямёнава), «Усенародная барацьба ў Беларусі» супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны» ў 3-х тамах і інш.

Інсцэніроўка «Беларусь-партызанка» можа быць падрыхтавана як мастацкая частка ўрачыстага ці літаратурнага вечара ў гонар Вялікай Перамогі. Яна можа стаць таксама асновай сцэнарыя цэлага вечара, у гэтым выпадку пажадана шырэй выкарыстаць мясцовы матэрыял аб партызанскай барацьбе, а вечар пачаць невялікім уступным словам пра подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, пра Перамогу.

Аўтар інсцэніроўкі
М. ЯФІМАВА.

ПАМЯЦЬ

Словы М. Танка. *Музыка Г. Вагнера.*



Дрэвы забылі пра буры і страты,
Раны свае загаіла зямля.
Толькі нічога забыць не змагла ты,
Памяць мая!

Скруткі калючага дроту—засекі,
Гул кананады, дарогі вайны,
А на пажарышчах—сосны-калекі
Ды курганы.

Нават і сёння, калі зноў на золку
Я запяваю з птушынай сям'ёй,—
Чую, іржавыя ныюць асколкі—
У песні маёй.

«ЛЫСЫ»

(НАРОДНЫ ТАНЕЦ)

Запіс—І. ХВОРАСТА.
Музычная апрацоўка—К. ПАПЛАЎСКАГА.



Танец запісаны ў вёсцы Кавалі Глоданскага сельсавета Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці ад Яўгеніі Аляксандраўны і Івана Лявонавіча Яновіцкіх. Музыка народная, запісана ад А. Камарова настаўнікам мясцовай школы А. Гоманам. Музычны памер — 2/4.

«Лысы» танцуецца неабмежаванай колькасцю пар. Гэты запіс падаецца на шасць пар.

АПІСАННЕ ТАНЦА

Перад пачаткам танца юнакі і дзяўчаты выходзяць парамі на сярэдзіну сцэны, становяцца ў круг тварам супраць ходу стрэлкі гадзіннika (мал. 1). Юнак абдымае правай рукой дзяўчыну за талію ззаду, левай рукой, выцягнутай уперад, трымае правую руку дзяўчыны. Левая рука дзяўчыны, сагнутая ў локці, ляжыць на правым плячы юнака (рукі — як на вальс).

У танцы дзве фігуры, якія паўтараюцца па чарзе адна за адной.

Выконваецца танец гарэзліва, весела.

1-я фігура — 16 тактаў.

Выконваецца музычнае суправаджэнне.

1—2-і такты:

Юнакі і дзяўчаты рухаюцца парамі па крузе супраць ходу стрэлкі гадзіннika, выконваючы рух № 1. Дзяўчына пачынае рух з правай нагі, юнак— з левай.

3—4-ы такты:

Юнакі і дзяўчаты парамі адступаюць спіной па крузе, па ходзе стрэлкі гадзіннika, выконваючы рух № 2. Дзяўчына пачынае з левай нагі, юнак — з правай (мал. 2).

5—8-ы такты:

Выканаўцы паўтараюць рухі, якія выконваліся на 1—4-ы такты.

9—14-ы такты:

Юнак правай рукой бярэ левую руку дзяўчыны (свабодныя рукі яны апускаюць уніз) і рухаюцца па крузе супроць ходу стрэлкі гадзіннika, выконваючы рух № 3.

15—16-ы такты:

Юнак паварочвае дзяўчыну пад правай рукой улева. У канцы 16-га такта яны злучаюць рукі — як на вальс.

2-я фігура — 16 тактаў.

Выконваецца музычнае суправаджэнне.

1—8-ы такты:

Юнакі і дзяўчаты паўтараюць рухі, якія выконваліся на 1—8-ы такты 1-й фігуры.

9—16-ы такты:

Танцоры і танцоркі рухаюцца парамі па крузе супроць ходу стрэлкі гадзіннika, выконваючы «польку з паваротам» (рух № 4), потым круцяцца па ходзе стрэлкі гадзіннika.

Пасля танец выконваецца спачатку.

АПІСАННЕ РУХАЎ

Рух № 1 — «шассэ ўперад». Выконваецца на адзін такт музыкі. Зыходная пастава — трэцяя пазіцыя ног. У юнака левая нага спераду, у дзяўчыны — правая. Рукі злучаны, як на вальс.

На лік «раз» — крок левай нагой уперад, злёгку прысядаючы на ёй. Злучаныя рукі апускіць да ўзроўню таліі, нахіляючы корпус злёгку ўперад.

На лік «два» падцягнуць правую нагу да левай у трэцюю пазіцыю ззаду. Корпус выпраміць, злучаныя рукі падняць да ўзроўню пляча. Дзяўчына гэты рух пачынае з правай нагі.

Рух № 2 — «кроні назад». Выконваецца на адзін такт музыкі. Зыходная пастава — трэцяя пазіцыя ног (правая нага ззаду).

На лік «раз» — крок правай нагой назад. На лік «два» падвесці левую нагу да правай у шостую пазіцыю ног.

Дзяўчына гэты рух пачынае з левай нагі.

Рух № 3 — «пераменны крок». Выконваецца на адзін такт музыкі. Зыходная пастава — трэцяя пазіцыя ног (левая нага спераду). Юнак правай рукой трымае левую руку дзяўчыны. На лік «раз» — левай крок левай нагой уперад, злёгку паварочваючы корпус улева. На лік «і» прыставіць правую нагу да левай у шостую пазіцыю ног, правую руку злёгку правесці ўперад. На лік «два» — крок левай нагой уперад. На лік «і» — паўза.

Дзяўчына гэты рух пачынае з правай нагі.

Рух № 4 — «полька з паваротам». Выконваецца на адзін такт музыкі. Зыходная пастава — трэцяя пазіцыя ног (левая нага спераду).

На лік «раз» — крок левай нагой уперад, злёгку паварочваючы корпус улева. На лік «і» — прыставіць правую нагу да левай у шостую пазіцыю ног, правую руку злёгку правесці ўперад. На лік «два» — крок правай нагой уперад. На лік «і» — паўза.

Дзяўчына гэты рух пачынае з правай нагі.

Далей рух пачынаецца з другой нагі з паваротам управа.

Дзяўчына гэты рух выконвае, пачынаючы з правай нагі.

На старонках «Советской культуры» і «Звязды», на апошнім з'ездзе кампазітараў Беларусі абмяркоўвалася летась работа Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра БССР. Гаворка вялася пра фарміраванне рэпертуару, пра сістэму папулярызацыі і прапаганды твораў беларускіх аўтараў, пра ўзровень выканання канцэртных праграм. Пра творчыя кантакты гэтага калектыву з кампазітарамі рэспублікі выказваліся і ўдзельнікі «круглага стала» ў Доме радыё (гл. публікацыю ў «ЛіМе» за 11.01.85 г.).

Цяпер мы друкуем нататкі, якія прапанаваў «ЛіМу» кандыдат філасофскіх навук Д. Яканюк. Спадзяёмся, што назіранні, назапашаныя аўтарам, сталым слухачом канцэртаў, ягоная думка пра творчае аблічча і праблемы калектыву, сфарміраваная на працягу некалькіх сезонаў, дадуць спажыву для прафесійнай гаворкі. Рэдакцыя чакае водгукаў на публікацыю.

ВЫСТУПАЕ СІМФАНІЧНЫ

Наш музычны кругагляд, наш духоўны свет быў бы бяднейшы, калі б разоў колькі ў сезон не наведвалі мы сімфанічныя канцэрты.

Чым стаў Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр БССР для дзяцей, якія штотыдзень наведваюць спецыяльныя абанементныя канцэрты з удзелам лектараў - музыказнаўцаў М. Казініка, А. Агаркавай, А. Парэцкага? Гэты «дзіцячы музычны універсітэт»—ці не самая грунтоўная частка работы аркестра ў апошнія сезоны!

А вячэрнія канцэрты для нас, дарослых?

Праўда, у гэтай частцы творчай дзейнасці аркестра ёсць, на жаль, «момант напружання». Ёсць праблемы. Тыя, хто рэгулярна бывае на сімфанічных вечарах, думаю, пагодзяцца з маёю высновай. Узровень выканаўчага майстэрства аднаго з нашых вядучых мастацкіх калектываў, відавочна, высокі. Ды прыкра, калі ў агульным так званым «кантэксце музычнага жыцця» Мінска трапляюцца канцэрты-«няўдачнікі». Канцэрты, праведзеныя ў філармоніі нашым сімфанічным аркестрам... Гэтыя няўдалыя вечары асабліва кантрастуюць з канцэртамі, калі той самы аркестр іграе хораша, натхнёна—так, як можа, як павінен іграць!

Аўтару гэтых радкоў прыгадваюцца ўражанні ад некаторых філарманічных вечароў мінулага сезона. Прынамсі, тых, калі аркестр іграў «у рабочым парадку», без уздыму. Калі здавалася, што музыкантаў, дырыжора не захапляў змест выконваемага твора, і ці не таму з'яўляліся асобныя элементарныя агрэхі: «не разам», «кіксы» ў духавых, грубаватае гучанне скрыпак, інтанацыйныя недакладнасці. Было такое і ў Міжнародны дзень музыкі, і ў час «Беларускай музычнай восені», і на вечары сучаснай сімфанічнай музыкі (гучалі творы А. Эшпая, Р. Ледзянёва, Б. Чайкоўскага), і на канцэрце, прымеркаваным да 150-годдзя А. Барадзіна...

Праграма «М. І. Глінка. Да 180-годдзя з дня нараджэння» ўключала таксама вядомую нам з дзяцінства музыку. Выкананне, у цэлым тэхнічнае (у струнных), не завабіла ні казачнай «зіхатлівасцю», ні тонкасцю густу. І зноў—«траскучыя» трамбоны. То раптам — несупадзенне інтанацыі ў струнных і духавых; запозненa ўступае інструмент, які праводзіць тэму... Агульнае ўражанне, як ні «змякчалі» яго цудоўныя салісты - вакалісты, удзельнікі канцэрта, было, даруйце, такое: «Адбацалі!» (Як я пасля даведаўся, было мала рэпетыцый, але пра гэта ж не скажаш у час канцэрта са сцэны!)

Разам з тым, помняцца і ўзрушальныя сустрэчы з музыкай. Гэта цудоўнае выкананне і Восьмай сімфоніі ў монапраграме «Людвіг ван Бетховен», і твораў, якія рэдка гучаць на канцэртнай эстрадзе (праграма «Ферэнц Ліст»), і манументальнай, Дзевятай, бетховенскай сімфоніі (з удзелам Ленінградскай акадэмічнай харавой капэлы імя М. Глінкі). Гэта і канцэрты фестывалю «Мінская вясна»...

Прыгадваецца і адкрыццё ўжо сёлетняга, 47-га філарманічнага сезона, калі па абодва бакі рампы панаваў адзіны, святочны настрой, калі адметнай падзеяй стала прэм'ера новага беларускага твора—Другой сімфоніі Д. Смольскага. Аркестр быў максімальна сабраны, адчувалася: дырыжор, артысты перажываюць адказнасць за музыку, за самое адкрыццё сезона — перад публікай, перад сабой. Калектыў нібыта зрабіў шматабяцальную заяўку на новае, па-творчы акрыленае жыццё ў новым сезоне.

Праз колькі часу Дзяржаўны сімфанічны ўдзельнічаў у канцэртах IX з'езда кампазітараў Беларусі. Дырыжоры, артысты аркестра сур'ёзна працавалі над увасабленнем новых партытур—пра гэта сведчыла выкананне. А вось выступленне калектыву з праграмай венгерскай музыкі напярэдадні новага года прымусіла слухачоў зноў засумняваццa ў стабільнасці яго творчай формы.

Зразумела, цяжка ўзнімаць канструкцыю новай інтэрпрэтацыі класікі на моцным фундаменце інтэрпрэтацый добра вядомых, бліскучых, зафіксаваных у грамзапісе, — дырыжорскіх, выканаўчых! Натуральна, адказнасць дырыжора, які бярэцца выканаць добра вядомы і любімы твор, падвойваецца, як падвойваецца і адмоўная рэакцыя залы, калі ў выкананні няма не толькі пошуку, навізны, але і раскрыцця тых інтэрпрэтатарскіх заваёў, якія нам ужо знаёмыя.

Менавіта ж у класічных творах, вядомых нам ці не «па нотах», правяраецца майстэрства аркестравага музіцыравання — у самым шырокім сэнсе. Менавіта ў класіцы мы чуем, ці дамагаюцца артысты адзінага тэмбру групы, адзінага эмацыянальнага ладу. Не адкрыю новага, калі ўдакладню: гэта трэба ўдасканальваць пастаянна. Дык, можа, Дзяржаўнаму акадэмічнаму сімфанічнаму аркестру БССР не хапае творчай захопленасці, тонкай і карпатлівай штодзённай работы над «тэкстам», каб стабільна трымацца на ўзроўні сучаснага аркестравага выканаўства, не адставаць ад мастацкай свядомасці дасведчаных слухачоў?

Калектыў нямала гастралюе, і часу на рэпетыцыі, бывае, бракуе. Значыць, час гэты варта выкарыстоўваць больш рацыянальна, інтэнсіўна.

Уявім сабе і ацэнім напружаную працу галоўнага дырыжора Ю. Яфімава ў час індывідуальнай падрыхтоўкі партытуры дома. Ды, вядома ж, ніводнае самае сур'ёзнае захапленне канцэптуальным планам, шырокае асэнсаванне музыкі дырыжорам немагчыма ўвасобіць без дэталёвай, узорнай, «тэхналагічнай» апрацоўкі музычнай тканіны непасрэдна на практыцы...

Чамусьці склалася ўражанне (і не толькі ў мяне — сцвярджаю гэта, бо неаднойчы гутарыў са сталымі наведвальнікамі сімфанічных вечароў, са спецыялістамі), што наш аркестр, бывае, і «шкадуе» сябе на канцэртах з удзелам штатных дырыжораў Ю. Яфімава і А. Энгельбрэхта. Чаму? Гэта складанае пытанне, адказ мае быць неадназначны.

Ёсць праблемы, абумоўленыя псіхалогіяй адносін дырыжора і калектыву. Гэта той самы складаны «прадмет», які не «праходзяць» у кансерваторыі ці ў аспірантуры, які асвойваецца кожным дырыжорам індывідуальна. І эрудзіраваны дырыжор, патрабавальны да сябе, павінен быць такім жа і да калег-аркестрантаў, таму што ён, урэшце, нясе галоўную, агульную адказнасць за якасць выканання, за аўтарытэт вялікага калектыву.

На жаль, канцэрты з удзелам нашых дырыжораў праходзяць часам на невысокім тэхнічным, мастацкім, эмацыянальным узроўні. Хіба гэта можа падабацца мінскай публіцы, аснашчанай дасканалымі грамзапісамі? Калі патрабавальны слухач у час канцэрта надта часта «спатыкаецца» аб розныя выканаўчыя неахайнасці, калі ён чуе «будзённае» выкананне — ці не зробіцца ён скептыкам у ацэнцы мастацкіх мажлівасцей аркестра?

Аднак нельга няўдалыя выступленні аркестра тлумачыць толькі малой патрабавальнас-

БАЧЫЦЬ, КАБ ПОМНІЛАСЯ...

У Віктара Дашука за плячамі больш як дваццаць гадоў работы ў кінематографе. Яму належыць больш як 60 фільмаў. Сярод іх стужкі «Мінута маўчання», «Даўным-даўно закончаны бой», «Юбілейная песня», «Нас вадзіла маладосць», «Адвазе смелых», «Трывожныя вышыні», «Першыя 30 год», «А зязюля кукавала...», «Паланез ля мінор», «Дзевяноста шостая восень», вядомая серыя фільмаў пра беларускія Хатыні: «Жанчына з забітай вёскі», «Суд памяці», «Жменя пяску», «Немы крык», «Апошняе слова»... У яго ёсць свая тэма, генеральная ў мастацтве: сучаснасць. Ён асэнсоўвае сучаснасць у суладдзі з мастакоўскім паглыбленнем у мінулае сваёй зямлі, свайго народа, які вытрымаў нечалавечыя выпрабаванні ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Спачатку ён намерваўся быць журналістам. І на студыю прыйшоў менавіта журналістам. Экран пераканаў яго ў тым, што пабачанае больш уражвае чалавека, чым прачытанае. Не, В. Дашук не прыніжае ролю і значэнне слова ў мастацтве, і яго цікавасць, напрыклад, да кнігі А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка, да працы журналісткі С. Алексіевіч—доказ пачцівага стаўлення да літаратурных старонак, асабліва да старонак дакументальнага жанру. Аднак візуальнае ўспрыманне свету і чалавека, спасціжэнне свету і чалавека «праз вочы», мабыць, асабліва прыцягальнае для пэўнага складу мастакоўскага тэмпераменту. «Пахадзіўшы» ў асістэнтах рэжысёра, папрацаваўшы над кіначасопісамі і над навукова-папулярнымі сюжэтамі, В. Дашук адчуў нейкую чароўна-дзівосную сілу мантажу кадраў. Калі верш — гэта лепшыя словы ў лепшым парадку, то фільм (у ідэале!)—гэта найлепшым чынам знятыя на стужку кадры, зманціраваныя ў найбольш выразнай і хвалюючай паслядоўнасці.

Цяпер падумаем над такой сітуацыяй. Крытыка і гледачы аднадушна гавораць, што В. Дашук — адметны мастак-дакументаліст. Адметнасць мы адчуваем па строгім адборы кадраў, па натуральнай плыні размовы экрана з намі, калі нават вельмі нечаканы мантаж выглядае як чаргаванне самых неабходных фрагментаў жыцця, прыроды, чалавечых аблічча, дэталей побыту. Гэты рэжысёр вельмі ашчадна ілюструе стужку гукамі (стрэлы, выбухі, гул матораў, марскі шторм, лясное зацішша, песня, дзіцячы голас) і музыкай. З чалавечым голасам ён абыходзіцца па-рознаму: у адных яго фільмах глядач, засяродзіўшы ўвагу на твары чалавека, слухае фактычна маналог на працягу ўсёй стужкі (так бывае ў стужках паводле кніг, звязаных з вайной), у іншых—зрэдку «падаюць» у залу асобныя сказы дыктара, голас якога ўспрымаецца як закадравы голас самога аўтара, В. Дашука. Яму ўласціва тонкае адчуванне храна-метражнай даўжыні ўсёй стужкі і яе асобных фрагментаў. Што яшчэ? Мабыць, нешта няўлоўнае ў падборы аператараў, якія «здагадваюцца», як «бачыць» вось гэты жыццёвы матэрыял рэжысёр, і здымаюць усё па-дашукоўску.

Я бывала на здымачнай пляцоўцы ў Дашука: бачыш «адкрытасць» творчага працэсу, адчуваеш усеагульнае захапленне працай. Здаецца, што ідуць зусім не здымкі, а разгортваецца жывая размова аднолькава зацікаўленых агульнай справай людзей.

І ў мантажны цэх В. Дашук прыходзіць не з пустымі рукамі. У яго заўсёды з сабой запісы ў блакноце. Дашук упэўнены, што мантаж—гэта «музыка кінематографа». Рытм кадраў дзейнічае як жэст прамоўцы, як эмацыянальны стан чалавека, што плача ці смяецца. Рэжысёр, манціруючы кадры, надаючы дзеянню адпаведны рытм, хоча бачыць на экране раней зняты кадр менавіта такім, якім той задуманы ў мантажным сказе. Наогул, ствараецца ўражанне, што рэжысёр нязменна абапіраецца на цвярозы і дакладны разлік, пастаянна аналізуе працэс і вынік працы. Ці не пагражае гэта мастаку акадэмічным холадам, які бывае вынікам строгага і разважліва разлічанага творчага працэсу? Пагражае. І гэта ведае В. Дашук. І ён натхненнем, нават апантанасцю сваёй як бы пераадольвае схему цвярозага разліку.

Самі фільмы гэтага рэжысёра—яркія і эмацыянальныя — дастаткова пераканальна сведчаць пра тое, што натхненне і разлік у В. Дашука дапаўняюць адно аднаго, што логіка дапамагае яму глыбей спасцігнуць музыку пачуццяў, лад эмоцый, якімі будзе захоплены потым глядач.

— У мастацтве адлюстроўваецца рэальны свет, гэта так, — кажа В. Дашук.—Але адлюстраванне яго своеасаблівае. У мастацтве атрымліваецца толькі тое, што мастак адчувае, што ён зразумеў праз хваляванні і нават пакуты. Штучна «будаваць» тут нельга. Глыбінёй на экране насычана толькі тое, што перажыта мастаком. А рацыянальна збудаванае распадаецца, як картачны домік... Кароль Лір у Шэкспіра гаворыць: «Я паранены да мазгоў». Так званы «творчы працэс», відаць, лепш за ўсё растлумачвае гэтая фраза...

Зразумела, гэта—пазіцыя актыўнага прыхільніка «аўтарскага» фільма, аўтар якога (сцэнарыст, рэжысёр ці аператар) перш за ўсё чалавек, якога сапраўды хвалюе тая ці іншая тэма, ідэя, праблема. Аўтар павінен у ёй сам дасканала разбірацца. Адна з самых неабходных якасцей аўтара—шырокая дасведчанасць у законах драматургіі наогул, у драматургіі кіно, у прыватнасці. Нярэдка рэжысёр выязджае на здымкі, маючы зададзеную ў сцэнарыі драматургію, ды жыццё герояў дакументальнага фільма абумоўліваецца непрадугледжанымі зменамі сітуацый, задач, умоў, сутыкненнямі з новымі і новымі характарамі. Драматургія дакументальнага фільма канкрэтна акрэсліваецца на здымачнай пляцоўцы. Таму В. Дашук лічыць, што аптымальны варыянт у дакументальным кіно—гэта рэжысёр і драматург-сцэнарыст у адной асобе.

Асаблівае месца ў творчасці В. Дашука займаюць цыклы «Жанчына з забітай вёскі», («Жменя пяску», «Немы крык», «Суд памяці») і «У вайны не жаночы твар». Гэта творы, што маюць рэпутацыю міжнародную.

— Я прыйшоў да гэтых карцін з пэўным вопытам рэжысуры,—успамінае В. Дашук. — І раптам аказалася, што ад многіх навыкаў мне трэба адмовіцца. Стоп-кадры, падвоеная экспазіцыя, экспрэсіўнае выяўленне аўтарскай індывідуальнасці — усё тут прыходзіла ў супярэчлівасць з драматычным матэрыялам... Мы адчувалі небяспеку: калі даць трагедыю спаленых вёсак «у чыстым выглядзе», узнікае пагроза натуралізму на грані паталогіі. Калі ж пазбягаць эмацыянальных узрываў, можна ўсё звесці да абыякавага хранікёрскага паказу...

«Жанчына з забітай вёскі» (аўтары сцэнарыя А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік)... У стужцы Вольга Андрэеўна Мініч з беларускай вёскі Хвойня расказвае пра вясну 1942 года. Гаворыць пра тое, як мітусілася яна ад адной палаючай вёскі да другой. Па лесе, акружаным карнікамі, цягнула акрываўленага мужа, ледзь жывога ўжо. Але не магла, не хацела кінуць паміраць аднаго. Кінакамера Юрыя Шалімава знойдзе сярод сямейных здымкаў на сцяне і ярка вылучыць партрэт маладога чалавека. Зразумееш, што гэта і ёсць яе муж, што і ёй быў тады 21 год. Гора сваё, свой жах, пакуты нясе Вольга Андрэеўна даўно, праз усё жыццё. А цяпер, перад намі, спавядаецца ўголас і стрымліваецца, каб не заплакаць... І плача...

Здымалася гэта зусім «звычайна»: чалавек гаварыў у сваім доме, перад кінакамерай, якая лавіла кожны жэст, ды герой пра яе не помніў, яму было не да яе. Таму і мы поўнасцю паглыбляемся ў жыццё, якое паўстае перад вачамі... Уся стужка — амаль маналог Вольгі Андрэеўны Мініч. Самнасам з гледачом. Дыктарскі каментарый вельмі лаканічны. Усяго паўтары сотні слоў...

У «Судзе памяці» мы ўбачым і пачуем многіх людзей, якія падзялілі лёс Вольгі Мініч: старшыню сельсавета Васіля Іванавіча Шчамялёва, аднаго з трыццаці жыхароў расстралянай вёскі Канашы, адзінага, якому ўдалося выратавацца. І

цю дырыжораў. Самі аркестранты «не бязгрэшныя». Яны ж у нейкім сэнсе выбраннікі: іх толькі 85 на рэспубліку! Значыць, кожны іх выхад на сцэну—зноў і зноў выпрабаванне прафесіяналізму, адказнасць перад слухачом і, калі хочаце, перад культурай. Хіба не гістарычныя тыя канцэрты, дзе ўпершыню выконваецца твор, упершыню публіка знаёміцца з гасцямі-дырыжорамі, салістамі? Калі ж гучыць класіка—адказнасць падвоеная: перад гісторыяй сённяшняй і мінулай.

З аркестрам адбываюцца пэўныя метамарфозы на канцэртах дырыжораў - гастралёраў. Мне давялося назіраць за рэпетыцыйнай работай нашых вядомых гасцей. Дырыжоры В. Гергіеў, Ф. Мансураў, Ю. Сіманаў, Й. Алекса, В. Дуброўскі, Э. Сяроў і іншыя, сустрэўшыся з калектывам, імкнуцца наладзіць кантакт з музыкантамі, заваяваць іх давер як да «першага сярод роўных». Дырыжор як бы пацвярджае сваё права быць лідэрам: знешняй і духоўнай абаяльнасцю, шырокай эрудыцыяй, прафесіяналізмам і, зразумела, талентам. І дасягае плёну супольнай працы ў сціслы рэпетыцыйны тэрмін.

Надараюцца выпадкі, калі і ад скептыка пачуеш: «Але ж можа іграць наш аркестр!» Дык чаму гэтае «можа» — ад выпадку да выпадку, чаму—не стабільнае?

Усякі сімфанічны аркестр — своеасаблівы крытэрый узроўню інструментальна-выканаўчай культуры. Сімфанічны аркестр высокіх мастацкіх вартасцей можа стымуляваць творчую думку кампазітараў, такім чынам спрыяючы руху музычнага жыцця. Такім хочацца бачыць і наш Дзяржаўны сімфанічны. Тым больш, што ў яго біяграфіі, як вядома, надараюцца «зорныя хвіліны». Напрыклад, адказныя гастролі ў Ленінградзе і Маскве. Надзвычай патрабавальная ленінградская публіка, выхаваная Я. Мравінскім, Ю. Цемірканавым, іншымі славутымі маэстра, стоячы апладзіравала Ю. Яфімаву і аркестру! А запісу музыкі балета Я. Глебава «Ціль Уленшпігель» у гэтым жа выкананні, які зрабіла Усесаюзнае радыё, пакуль няма роўных...

Думаю, не трэба тлумачыць, што клопат пра якасць прапаганды музычнага мастацтва — справа ідэалагічная. І тут не павінна быць кампрамісаў,—ні ў творчасці, ні ў складанні рэпертуарнай афішы, ні ў справе выхавання і пашырэння аўдыторыі слухачоў. Як мне вядома, у многіх гарадах краіны (Маскве, Ленінградзе, Свярдлоўску, Новасібірску і інш.) гадоў 5—10 вядуцца шырокія сацыялагічныя даследаванні і публікі філармоніі наогул, і наведвальнікаў асобных канцэртаў (сімфанічных, камерных, эстрадных), і публікі музычных тэатраў. А ў апошні час распаўсюджваецца плённы вопыт Цэнтра па вывучэнні, фарміраванні і прагназіраванні грамадскай думкі пры ЦК Кампартыі Грузіі (цэнтр займаецца і мастацкай культурай).

Напэўна, варта аналагічную работу весці і ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Канкрэтныя рэкамендацыі сацыёлагаў памаглі б эфектыўнаму фарміраванню рэпертуару і нашага сімфанічнага калектыву, складанню канцэртных праграм і, адпаведна, фарміраванню «філарманічных» інтарэсаў публікі, іх прагназіраванню. Думаю, спецыяльныя сацыялагічныя даследаванні дапамаглі б пазбегнуць і кантрастаў у дзейнасці Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР і замацаваць стабільную рэпутацыю аднаго з вядучых мастацкіх калектываў рэспублікі.

Данат ЯКАНЮК,
кандыдат філасофскіх навук.

Сымона Кая з вёскі Княжаведцы Мастоўскага раёна, які ніяк не можа ўцячы ад перажытага — вырабляе магільныя пліты. І Улляну Дрозд, якой сніцца і сніцца загінуўшая сястра, самая малодшая... Шматгалоса заяўляе пра сябе не толькі мінулае, але і сённяшняе, якое захоўвае памяць пра загінуўшых і прагне дакладна ведаць усю праўду пра тагачаснае.

Апошняя па часе работа В. Дашука—цыкл фільмаў «У вайны не жаночы твар» (аўтары сцэнарыя С. Алексіевіч, В. Дашук, аператары Ю. Ялхоў, С. Пятроўскі) складаецца з сямі стужак: «Гэта была не я», «Страляць хацела», «Утро туманное, утро седое...», «Я встретил Вас...» (гэтаму фільму прысуджаны прыз «Сярэбраны голуб» на XXVI Міжнародным фестывалі ў Лейпцыгу), «Калі народзіцца дзяўчынка», «Тады я не плакала», «Міласэрнасць». Фільмы—пра жанчын, якія ў 16 — 18-гадовым узросце ішлі на вайну, пра цяжкасці, якія выпалі на іх плечы і якія яны стараліся не заўважаць, аддаючы напал юнага сэрца аднаму — справе Перамогі.

Цыкл фільмаў «У вайны не жаночы твар» — кінаманалог. Гэта галоўная яго асаблівасць. І, відаць, не выпадкова рэжысёр абраў адзін з найскладаных жанраў дакументальнага кіно. На першы погляд здасца, што гэта ж вельмі проста — пасадзіць перад камерай чалавека і не так ужо і цікава амаль паўгадзіны слухаць яго.

Паглядзеўшы фільмы, упэўніваешся, што гэта не так. Яны трымаюць нас у пастаянным напружанні. Мы неўпрыкмет робімся ўдзельнікамі хвалюючага кінадыялогу. Словы, што гучаць з экрана, адрасаваны непасрэдна нам. Пра самае балючае, незабыўнае расказваюць нам Вольга Амельчанка, Валянціна Чудаева, Тамара Умнягіна, Соф'я Дубнякова, Ніна Вішнеўская. Для ўсяго свету вайна — жахлівае бедства, але для гэтых жанчын яна была часам іх маладосці, лепшай парою ў іх жыцці. Таму і хацелі яны ў той час быць прывабнымі, мілымі, хацелі любіць, праз усё жыццё пранесці свае шчырыя, добрыя пачуцці.

Усё, што мы ведаем пра жанчыну, лепш за ўсё змяшчаецца ў слове «міласэрнасць». Есць і іншыя словы — сястра, жонка, сябар. Самае высокае—Маці. На самай страшнай вайне XX стагоддзя жанчыне давялося быць салдатам. Яна не толькі выратоўвала, перавязвала параненых, але і страляла, падрывала масты, хадзіла ў разведку. Жанчына забівала. Забівала ворага, які паганай нагой таптаў яе зямлю, уварваўся ў яе дом, здзекаваўся з яе дзяцей. Яны яшчэ жывыя—удзельнікі баёў. Але чалавечае жыццё не бясконцае, прадоўжыць яго можа толькі памяць, якая адна перамагае час. Расказы жанчын малююць аблічча вайны—аблічча і сапраўды зусім не жаночае.

У фільмах В. Дашука не ўбачыш грандыёзных панарамных планаў: зусім, здаецца, простыя кадры. Адкрываецца значнасць, глыбіня сэнсу там, дзе павярхоўнае вока не заўважае нічога істотнага. У стужках В. Дашука—фотаздымкі ў рамках, ручнікі, хустка дзяўчынкі-санітаркі — не дэталі побыту, а рэаліі і элементы эпасу, гісторыі. Хранікёр узнімае дэталь да чання вобразнага, хоць праўда паўсядзённая застаецца на экране дакументальнай.

Сапраўдных рэжысёраў не так ужо і многа. Ды ва ўсёй постаці В. Дашука няма і намёку на самаўлюбёнасць «першага майстра». Маладжавы, амаль юнак, шчыры і непасрэдны чалавек, які і думаць не думае пра свае рэжысёрскія вартасці. Ён, гэты чалавек, непрыязнасцю да шуміхі вакол свайго імя і сваёй работы быццам адсоўвае штодзённую мітусню за межы свайго свету. Свету, назва якога — Памяць... Мастак-дакументаліст і служыць ёй, чалавечай Памяці.

Вераніка КОЗЕЛ.

МАСТАК і ЖЫЦЦЁ

Кніга дыктуе...

Узростам многія героі кніг В. Быкава блізкія да сённяшніх дзесяцікласнікаў. Да таго ж і ў наш час могуць узнікаць і ўзнікаюць сітуацыі, якія ставяць чалавека перад неабходнасцю рашучага маральнага выбару. Па словах самога В. Быкава, «адна з галоўных сацыяльных тэорый і праблем чалавечага існавання — тэорыя выбару... Чалавек, магчыма, сам таго не заўважаючы, павінен рабіць выбар у будзённым жыцці амаль штодня». Таму зноў і зноў, вяртаючыся ў гераічнае і трагічнае мінулае, пісьменнік імкнецца «даследаваць не саму вайну... а магчымасці чалавечага духу, якія былі выяўлены на вайне». Расказваючы пра пятнаццацігадовага Віцьку, які саромеецца бацькі-паліцэйскага і памагае партызанам («Круглянскі мост»), пра маленькага перавозчыка праз Нёман Воўку Барматухіна («Пайсці і не вярнуцца»), пра яўрэйскую дзяўчынку Басю, якая не купіла сваё жыццё за кошт чужых пакут («Сотнікаў»), В. Быкаў зноў адкрывае нам, якія цяжкія выпрабаванні наканаваны чалавеку ў свеце «жахлівай неабходнасці» (так назваў у свой час вайну Л. Талстой) — дзецям і дарослым. Катэгарычнасць духоўнага імператыву пісьменніка блізкая наогул юнацкай самасвядомасці. Многія творы В. Быкава, пазбаўленыя надакучлівай дыдактыкі, для юнага чытача — сапраўдная школа выхавання пачуццяў.

Дынамічны, з кідкімі па-мастацку дэталямі побыту, якія пераконваюць сваёй дакументальнасцю, з ярка індывідуальнымі вобразамі, што запамінаюцца назаўсёды, аповесці пісьменніка — найцікавейшы матэрыял для мастака-ілюстратара. Далёка не заўсёды яны дасягаюць таго ўзроўню мастацкай вобразнай выразнасці, якая ўласціва творам пісьменніка, што сёння гучаць на многіх мовах свету. Проза В. Быкава застаецца ў той жа час і яркай з'явай нацыянальнай культуры. І натуральна, што з асаблівым пачуццём працуюць над ілюстрацыямі да аповесцей пісьменніка беларускія мастакі розных пакаленняў. У ліку найбольш значных цыклаў — работы Георгія Паплаўскага, Арлена Кашкурэвіча і Юрыя Герасіменкі. У вайну Г. Паплаўскі і А. Кашкурэвіч былі падлеткамі, равеснікамі быкаўскага хлапчука ў будзённаўцы з «Сотнікава». Таму для кожнага з іх тэма «чалавек і вайна» мае і свой, аўтабіяграфічны аспект.

Г. Паплаўскі праілюстраваў чатыры аповесці В. Быкава, якія нядаўна выйшлі асобнай кнігай (М., «Художественная литература», 1984). Найбольш яркімі атрымаліся ў мастака вобразы яго тагачасных равеснікаў — вучняў Мароза («Абеліск»), Воўкі Барматухіна і Зосі Нарэйка («Пайсці і не вярнуцца»). Сімволіка заключнай ілюстрацыі, зробленай графікам да аповесці «Абеліск», прымушае ўспомніць скульптурную групу, якая адкрывае мемарыяльны комплекс Хатынь: стары з мёртвым хлопчыкам на руках (аўтар С. Селіханаў). Кампазіцыйны цэнтр літаграфіі Г. Паплаўскага — фігура старой жанчыны, якая трымае на каленях паніклае хлапчуковае цела. Успомнім у В. Быкава: «Напаследак ён (Сотнікаў. — **Л. З.**) адшукаў позіркам ніцую сцяблінку хлопчыка ў будзёнаўцы». Помнім і мы тую танклявую постаць хлопчыка гадоў 12-ці з насунутай на галаву старой армейскай будзёнаўкай. Намаляваны Г. Паплаўскім серабрыстым, светлым штрыхом сілуэт хлопчыка нібы супрацьстаіць чорнаму, злавеснаму фону. Пакуты дзяцей — гэта тое, праз што ніколі не могуць пераступіць любімыя героі пісьменніка, бо «ў ваенным свеце В. Быкава дзеці — не толькі ясная і бездакорная чыстая мерка ўсяму, але і выпрабаванне і рашаючае пытанне для чалавека, які ваюе» (І. Дзядкоў).

Мастакі Г. Паплаўскі, А. Кашкурэвіч і Ю. Герасіменка перадаюць напружанасць мастацкага свету В. Быкава праз сутыкненне белага і чорнага. Але калі ў ілюстрацыях Г. Паплаўскага часта гучаць узвышана-рамантычныя інтанацыі, то А. Кашкурэвіч у сваіх малюнках да аповесцей В. Быкава «Пайсці і не вярнуцца» і «Яго батальён» (Мінск, «Мастацкая літаратура», 1979) імкнецца падкрэсліць рэальнасць, якая робіць чалавека жорсткім, суровую няўтульнасць скарэжанага вайной свету. З гэтым, відаць, звязаны выбар мастаком тэхнікі і сама манера выканання ілюстрацый—калючы штрых з акварэльнай размыўкай. Графік часта дае буйным планам твары герояў, імкнучыся паказаць, як стрэсавая сітуацыя прымушае чалавека праявіць прыхаваную да часу сілу характару або скінуць маску, адкрыўшы свой сапраўдны твар. Так, раней стрыманая, паслухмяная Антону Зося (першая ілюстрацыя да аповесці «Пайсці і не вярнуцца»), даведаўшыся пра здрадніцкі намер Галубіна, як бы пераўтвараецца. Мастак пераконвае нас: дзяўчына поўная страшнай рашучасці забіць таго, хто нядаўна здаваўся ёй самым блізкім чалавекам на зямлі, бо няма другога шляху, каб засцерагчы ад здрадніка жыццё дзесяткаў людзей. У свеце «жахлівай неабходнасці», прадыктаванай вайною, сцвярджае графік, рукі старых мацярок, створаныя, каб няньчыць немаўлят, жаць збажыну, ткаць для жыцця, вымушаны «ткаць» смерць. У вядомым афорце А. Кашкурэвіча «Мацярокі» з цыкла «Партызаны» тры старыя жанчыны набіваюць патронамі кулямётныя стужкі, далоні юнай дзяўчыны сціскаюць тапарышча (тэты малюнак мастак паўтарае і на супервокладцы да кнігі).

Маладыя чытачы, асабліва з тых, што ўважліва сочаць за любоўнымі перыпетыямі, заўважаць, што адносіны да дзяўчыны, жанчыны — важнейшая этычная характарыстыка для герояў В. Быкава. Прагматычны, канкрэтна-спажывецкі падыход да «слабога полу» нярэдка становіцца ў пісьменніка як бы першым сігналам маральнай глухаты, няўстойлівасці этычных прынцыпаў той або іншай дзейнай асобы (успомнім Рыбака, які малюе перад Сотнікавым вобраз «агонь-дзеўкі» з хутара, або Антона Галубіна, які прывык зусім пэўным чынам ставіцца да жанчын). Такія людзі непазбежна дэградуюць пад націскам абставін. Гэтую думку аўтара пастараўся падкрэсліць мастак — нічога чалавечага не засталося ў Антоне, які мітусліва паўзе на карачках па снезе (фінальная ілюстрацыя А. Кашкурэвіча да аповесці «Пайсці і не вярнуцца»).

Мабыць, Г. Паплаўскі і А. Кашкурэвіч, працуючы над ілюстрацыямі да аповесцей В. Быкава, выходзілі і з асабістых успамінаў, ад ведання дакументаў эпохі (Г. Паплаўскі ў канцы 60-х гг. таксама вывучаў архіўныя матэрыялы, ствараючы серыю літаграфій «Памяць»). Тым і тлумачыцца сапраўды неабвержная дакладнасць іх ілюстрацый.

Маладыя ж графікі, якія самі не бачылі вайны, нярэдка пераходзяць ад дакументальна-публіцыстычнага ўзроўню да абагульнення і сімвалу. Відавочная пераклічка паміж работай Ю. Герасіменкі над малюнкамі да «Знака бяды» (Мінск. «Мастацкая літаратура», 1984 г.) і цыклам ілюстрацый яго равесніка, маскоўскага мастака Валерыя Смірніцкага (1949—1978) да «Альпійскай балады» В. Быкава. Гэтыя лісты, выкананыя графікам у сярэдзіне 70-х гадоў, дэманстраваліся на 14-ай выстаўцы маскоўскіх мастакоў кнігі і пасмяротнай выстаўцы В. Смірніцкага.

«Знак бяды»—твор, які прыцягвае ўвагу сёння не толькі кніжных ілюстратараў, але і тэатр, кіно. Мастакі яшчэ пачынаюць паглыбляцца ў дыялектычна-складаныя і такія псіхалагічна праўдзівыя характары герояў гэтага быкаўскага даследавання чалавечай душы ў абставінах, што вымагаюць ад кожнага рашучасці, духоўнай адвагі. Таму не буду даваць канчатковых ацэнак першым ілюстрацыям да кнігі. Адзначу, што вопыт А. Кашкурэвіча і Г. Паплаўскага — багаты на асацыятыўны роздум, на пэўныя высновы і каштоўны для далейшага абнаўлення самога падыходу да мастацкага афармлення, да ілюстрацыі прозы Васіля Быкава.

Лола ЗВАНАРОВА-КОНАН.

А. КАШКУРЭВІЧ. «З ілюстрацый да аповесці «Пайсці і не вярнуцца».

Г. ПАПЛАЎСКІ — да аповесці «Сотнікаў».

Ю. ГЕРАСІМЕНКА — да аповесці «Знак бяды».

Фотарэпрадукцыя Ул. КРУКА.

З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Віктар ШНІП

●

А талент ад душы,
Не ад святога духу.
А без душы паэт,
Як музыкант без слуху.

Век пражывеш, як дзень,
А дзень, як век, бясконцы.
Не ўсё, што хваляць,—цуд,
Не ўсё, што свеціць,— сонца.

Вякі пражыве
І зойдзе ў кожну хату,
Не той, хто скажа шмат,
А той, хто скажа праўду.

●

Трывожуся не за сябе,
Зямная ў нас трывога.
Дарогу за сабой вяду,
А не мяне — дарога.

Усходзіць сонца над зямлёй,
Сплылі за ноччу хмары.
Жыць могуць мары без мяне,
Я не магу — без мары.

І сею жыта для людзей,
Ад зла аберагаю.
А жыць інакш я не магу
І права я не маю.

Крыніца

Пясок крыніцу засыпае,
І ад вачэй людскіх хавае
Трава, што за сябе баіцца.
Але жыве, жыве крыніца.

А прыляцеўшыя вароны
Крычаць на дрэвах несціхана:
— Яна нікому непатрэбна,
Ёй забыццё наканавана.

З наканаваным не мірыцца,
І веры ў лепшае — не здрадзіць.
Калі не зберажом крыніцу,
Мы з ёю будучыню страцім.

●

Ад ранку ля паваткі
Пілуе Хведар дровы,
Запыленую шапку
Насунуўшы на бровы.

Заморыцца, пакурыць,
Пагутарыць з сабою.
Глядзіш, ізноў пілуе —
Няма яму спакою.

— Чаго адзін пацееш?
— Зіма не за гарамі, —
Адкажа і асвеціць
Да дна душу вачамі.

І як тут ні ламожаш
Самотнаму суседу.
— Чаму ж не едуць дзеці?
— Як будзе час, прыедуць...

●

Усе любім другіх павучаць
І злуёмся, як нас павучаюць.
Хлопец сее, суседзі глядзяць:
— Сып гусцей каля левага краю,

А цяпер вось зайдзі ад платоў,
Каб быў час, паказаў, як патрэбна...
Ды ад працы, але не ад слоў
Будзе ў хаце святочна і хлебна.

●

Падрастаюць за вёскаю дрэвы.
Лес здаецца зялёнай гарой,
На вяршыні якой — з ранку сонца,
Ну а зоры — вячэрняй парой.

Падрастаюць задумліва дрэвы.
Штось зязюлі не лічаць гады.
— Ну чаму вы касцёр не стушылі?
— Ты не бойся, не будзе бяды.

Падрастае наш лес і радзее.
А ляснік добра ў вёсцы жыве.
Лес зялёны высокай гарою.
Дым паціху з вяршыні плыве.

●

Ідзе жанчына праз жыты.
Жыццё яе — пчала,
Якую дзень прасвечвае.
Жанчына са святла.

У цень паставіла збанок.
Жыве ў збанку вада.
У жыце перапёлку ёй,
Нібы сястру, шкада.

З бярозы юнай да хмурын
Прагнала ругана.
Нібы на сонца, на яе
Глядзела збажына.

Да плугара ў сцюдзёны дзень
Жанчына ў дом прыйшла
І стала цёпла без агню.
Жанчына са святла.

Адам ГЛОБУС

Металургія

На душы ў мяне металалом,
А не камень двух- ці трохпудовы.
Бо мяняю процьму валуноў
На адну шчаслівую падкову.

Божа, божа, што тут гаварыць?
А каму на гэтым свеце лёгка?
Дык няхай, душа мая гарыць,
Брату выплаўляючы палёгку.

Рэзананс

Дзе пыл курэў на аўтастрадзе,
На перакуленым адчаі,
Як на цэментнай балюстрадзе
Сядзела кафельная чайка.

З малакаштоўнага метала
Яе халоднае сардэчка
Амаль рытмічна грукатала
Паміж дарогай і мястэчкам.

Глядзела пудзіла з гароду,
Як за прыватнымі садамі
Жаўцела вежа льнозавода
Над залацістымі стагамі.

Два срэбныя малакавозы
Правуркталі да сталіцы...
Звінелі пудзілавы слёзы,
Бо чайка знікла ў небыліцы.

Паміж сталіцай і мястэчкам,
Паміж кюветам і гародам
Яе латуннае сардэчка
Знайшлі калгасныя льнаводы.

Белдзяржрэклама

Пэндзаль запалкі
Намаляваў на цемры
Руку Дыягена

Не ярка гарыць вітрына.
Струменяцца адлюстраванні.
Тралейбусаў плыткія здані
Бруяцца ультрамарынам.

Акёлы аблокаў з дыкты
Ружовыя, нібы мальвы,
Блішчаць самалётнай эмаллю,
Паснуўшы ў палёце звыклым.

Завіс парашут парасону
Над цэтлікам-парашутыстам,
У небе гандлёвай выстаўкі
Зіхцяць матылі з кардону.

Маўчаць манекены-буды
Нібы зталоны здранцвення,
Над імі шыльда — АДЗЕННЕ
ГАЛАНТАРЭЯ АБУТАК.

Вітаю сваё аблічча
У дранай хіповай куртцы.
Яно папяросу курыць
І лязгае запальнічкай.

Жонка

У сне сустракаеш другога,
А ўдзень ты не помніш яго.
Мяцеш і шаруеш падлогу,
Чакаючы мужа свайго.
Крухмаліш, прасуеш кашулі.
Дзіцяці гатуеш абед,
Намыўшы да бляску каструлі.
Вось так і трымаецца свет.

Вечаровае, будзённае

Зачыненыя гаражы
Самаупэўнена маўчалі,
У царстве вогненнай іржы
Яны алейнасці жадалі.

Гумовакрылыя стрыжы
Самазахоплена пішчалі,
Раскрэслівалі віражы
Над сметніцай і гаражамі.

Рэгіна

У маёй суседкі
Вырасла на столі
Залатая кветка,
Дый згубіла колер.

Абмінулі Рэню
Хлопцы-кавалеры, —
Кветкавы карэнні
Уздыбілі шпалеры,

Пацяжэлі цені,
Расплыліся вокны,
Разышліся сцены
У чарнаце глыбокай...

Мільгнула зорка
У жалобнай слоце.
Уздыхнула горка
Дзеўчына ў самоце.

Не тужы, Рэгіна,
Знойдзецца каханне, —
Чорная вяргіня
Залатою стане.

Марозна.

Фота А. ГЛІНСКАГА

«БРАТЭРСТВА-84»

Выйшаў з друку чарговы нумар літаратурнага зборніка «Братэрства», шмат матэрыялаў якога прысвечана 40-годдзю Вялікай Перамогі і вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Адкрываецца штогоднік вершам П. Панчанкі «Байцу, які першы ступіў на беларускую зямлю». Ён гучыць лейтматывам зборніка. Галоўную тэму працягваюць радкі вядомай паэмы А. Твардоўскага «Васілій Цёркін» у перакладзе А. Каўко. Змешчана нізка вершаў мужнага сына ўзбекскага народа Султана Джуры, які аддаў сваё жыццё за вызваленне Гомельшчыны (пераклад К. Цвіркі). Уступнае слова да вершаў славутага земляка напісаў вядомы ўзбекскі пісьменнік Назармат. Песні ваенных гадоў прыгадваюцца ў вершах М. Матусоўскага, перакладзеных Я. Семяжонам. Са старонак апавядання чувашскага празаіка В. Енеша «Самая маленькая дзяржава» (пераклад І. Курбекі) паўстае вобраз сур'ёзнага, дапытлівага хлапчука, які нават тут, далёка ад лініі фронта, перажыў усе жахі ваеннага ліхалецця. Герояў апавядання вядомага ўкраінскага пісьменніка Б. Харчука «Вяртанне» (пераклад Я. Брыля) таксама не абышоў суровы ваенны лёс. Франтавымі ўспамінамі і любоўю да Радзімы прасякнуты вершы азербайджанскага паэта, які ваяваў на Беларусі, А. Наджафава.

Значнае месца ў раздзеле «Проза і паэзія» займаюць творы паэтаў і празаікаў братніх рэспублік, напісаныя на сучасным матэрыяле. З цікавасцю чытаецца аповесць грузінскага празаіка Гадэрдзішвілі «Вясёлая арэна» (пераклад В. Нікіфаровіча). Яна з'явілася якраз у той час, калі ў рэспубліцы разгарнулася актыўная барацьба з рознымі негатыўнымі з'явамі, з адхіленнямі ад норм сацыялістычнага ладу жыцця, за ўмацаванне дысцыпліны, і вылучаецца актыўнай грамадзянскай пазіцыяй аўтара. У аповесці «Сышліся дарогі», перакладзенай А. Клышкам, малады кіргізскі пісьменнік А. Айтымбетаў, выкрываючы тое, што не адпавядае, а часам і супярэчыць сацыялістычнаму ладу жыцця, выхоўвае ў чытача імкненне да чалавечнасці, дабрыні. Апавяданне А. Шаўкуты пераклаў М. Стральцоў. А. Разанаў знаёміць чытача з цыклам «Балады Кукуціса» літоўскага паэта М. Марцінайціса. Дасціпнасцю, тонкім гумарам і назіральнасцю вылучаюцца «Крышынкі» ўкраінскай пісьменніцы І. Вільдэ — афарызмы, мініавелы, якія пераклалі на беларускую мову А. і У. Васілевіч.

Шырока прадстаўлена ў нумары літаратурнае жыццё братняй Туркменіі — апавяданнямі А. Тагана і А. Хаідава (пераклад А. Жука), вершамі С. Ураева, Б. Араздурдыевай, А. Курбанепесава, А. Амаравай (пераклад Л. Філімонавай). М. Лужанін прапануе чытачу вершы А. Твардоўскага ў сваім перакладзе, С. Панізнік—вершы ўкраінскага паэта і перакладчыка У. Лучука. Максім Танк пераклаў вершаваную казку народнага паэта Дагестана Ю. Хапалаева «Амар і Хумар».

Упершыню на беларускай мове гучаць вершы якуцкага вучонага, паэта, публіцыста і грамадскага дзеяча П. Айунскага (пераклад А. Вольскага). Ленінскай тэме прысвечана апавяданне К. Федзіна «Малюнак з Леніна» (пераклаў М. Навіцкі). Не забыты ў штогодніку і старонкі класічнай паэзіі. Лірычныя вершы А. Пушкіна, Ф. Цютчава, А. Фета, І. Буніна пераклаў У. Данілаў. Падборку вершаў Т. Шаўчэнкі да 170-годдзя з дня яго нараджэння пераклаў Р. Барадулін.

Цікавыя матэрыялы змешчаны і ў астатніх раздзелах штогодніка. Да 60-годдзя народнага пісьменніка Беларусі В. Быкава ў раздзеле «Слова любові» друкуюцца сяброўскія лісты да яго Ч. Айтматава, А. Крывіцкага, Н. Джусойты (пераклад А. Марціновіча). У далёкія і адначасова блізкія гады франтавога сяброўства з П. Панчанкам, А. Куляшовым, П. Броўкам, М. Танкам, К. Крапівою вяртаецца Я. Хелемскі ва «Успамінах над Карскім морам» (пераклад М. Стральцова). Цікавыя звесткі пра вядомага ўкраінскага пісьменніка Героя Савецкага Саюза Ю. Збанацкага знойдзе чытач у артыкуле Р. Няхая «Між Дзясной і Дняпром».

У раздзеле «У лучнасці братняй» М. Няхай дае агляд творчасці паэтаў розных нацыянальнасцей, што ваявалі ці загінулі на беларускай зямлі.

Раздзел «Нашы інтэрв'ю» прапануе гутарку А. Марціновіча з сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў СССР, вядомым даследчыкам сучаснага літаратурнага працэсу Ю. Сураўцавым. Па пытаннях перакладу з артыкулам «Як у поўную раку...» выступае ў альманаху Ю. Канэ.

Н. ШАРАНГОВІЧ.

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

КАЎПАКОВА ПАПАХА

Дырэктар Лоеўскага музея народнай славы Іван Рыгоравіч Ермакоў — чалавек стрыманы і спакойны. Але калі пачынае расказваць, як гадамі збіраў экспанаты, што размешчаны тут, на стэндах, — перайначваецца. У вачах успыхваюць задорныя агеньчыкі, твар маладзее. Сам Іван Рыгоравіч прайшоў баявымі шляхамі да Прагі, грудзі яго ўпрыгожваюць шматлікія ордэны і медалі.

З асаблівым гонарам ён расказвае пра тое, як некалькі гадоў назад прывёз з Масквы ад генерала арміі, двойчы Героя Савецкага Саюза П. І. Батава яго планшэт, карты, на якіх былы камандуючы 65-й арміі наносіў напрамкі будучых удараў цераз Дняпро ў раёне Лоева.

— А гэта вось — папаха Сідара Арцёмавіча Каўпака, — паказвае Ермакоў на выцертую ад часу папаху, што ляжыць на стэндзе.

Шмат дарог прайшла яна са сваім гаспадаром, які пачынаў баявы шлях ад самага Пуціўля на Украіне, а закончыў яго пад Карпатамі.

— Ездзіў я па яе ў Кіеў, калі партызанскі генерал яшчэ быў жывы і працаваў Старшынёй Вярхоўнага Савета Украіны. «Ды бяры, хлопча, — сказаў ён. — Няхай успамінае Лоеў пра наш партызанскі парад сёмага лістапада сорак другога года...».

— Ёсць яшчэ сведкі тых падзей, — дадае Іван Рыгоравіч. — Як надарыцца быць у Міхалёўцы, сустрэнецеся з Аксінняй Пінчук. Яна той парад бачыла. І Каўпак у яе са штабам на кватэры стаяў.

Міхалёўка — вялікая прыгожая вёска — раскінулася сярод лесу. Стогадовыя дубы падступаюць тут да самых сядзібаў. Раней на многіх з іх стаялі вуллі-борці. Цяпер няма. На некаторых дубах увесну задаволена клякочуць буслы, калі вяртаюцца на свае гнёзды з палёту.

Аксіння Ігнатаўна — маленькая, увішная жанчына. Не паварочваецца язык назваць яе бабуляй: постаць тонкая, погляд ясны, з хітрынкай. Вось толькі час няўмольна пабяліў валасы жанчыны ды спярэсціў маршчынамі твар.

...У той дзень Аксіння Ігнатаўна была ў Лоеве — солі надумала разжыцца. Трапіла якраз на свята. Прыйшла на плошчу, а на трыбуне — камандзіры, сцяг чырвоны. Адзін з іх у папасе, прымае той парад. А перад трыбунай праходзяць хлопцы-малойцы — хто з аўтаматам, хто з кулямётам, і стужкі чырвоныя на папахах...

Добрая чутка на лёгкіх крылах ляцела перад партызанскім злучэннем Каўпака. Фашысты, ды розныя «бобікі», як іх з гідлівасцю называлі мясцовыя жыхары, так драпанулі, што апынуліся аж у Хойніках і Брагіне.

— А праз некалькі дзён каўпакоўцы ў Міхалёўцы нашай стаялі. А абозы былі і ў Грамыках і багатай Градзе, — расказвала жанчына. — Сідар Арцёмавіч у гэтай вось хаце— пасля мы яе перабудоўвалі— жыў. Усё хваліў нашу бульбачку. І солі, дзякуй яму, даў. На ўсю Міхалёўку той солі тыдні на два хапіла...

...А над буслянкамі кружаць, кружаць буслы. І шпакі сядзяць, перасвістваюцца проста на тэлеантэнах.

АГНІ ЛЯ ДЗЯРАЖЫЧ

Дняпро тут выгінаецца, робіць шырокую луку. У веснавы разліў вада падбіраецца ледзь не да самых сядзіб дзяражычцаў: у вадзе, на хвалях якой жаўцее ашмоцце пены, палошчуць вецце ніцыя вербы, чайкі кружацца над тым месцам, дзе, як схлыне вада, людзі разбіваюць грады.

Доўгі час Дзяражыцкую васьмігадовую школу ўзначальвала Ганна Акімаўна Арцёменка, чалавек няўрымслівы, творчы. Перад вайною мы з ёю разам заканчвалі Рэчыцкае педвучылішча, вучыліся ў адным класе.

У Дзяражычах Ганна Акімаўна стварыла гурток юных следапытаў. І амаль кожны раз Дзевятага мая, калі мы адзначаем Дзень Перамогі, у вёскі прыязджаюць госці. Прыязджаюць з-пад Арла, Тамбова, з далёкай Грузіі. 1500 байцоў ляжаць у брацкай магіле на высокай кручы ля Дняпра. Імёны многіх з іх выяўлены школьнікамі Дзяражыцкай школы.

— Вось якая ў нас перапіска, — паказвае Ганна Акімаўна тры вялізныя кардонныя скрынкі.—Даводзіцца пісаць — і не на адзін-два адрасы,— пакуль нарэшце з небыцця вырвеш імя чалавека, што біўся тут з ворагам.

У ясны майскі дзень каля мемарыяльнага комплексу, збудаванага на месцы, дзе пахаваны савецкія воіны, школьнікі выстройваюцца на ўрачыстую лінейку. Ярка палымнеюць на грудзях чырвоныя гальштукі. Трапеча, ірвецца ўвысь полымя Вечнага агню, што гарыць на мемарыяле. Непадалёку адсюль — магіла Героя Савецкага Саюза якута Фёдара Папова. Якуты — частыя госці ў Дзяражычах і Бывальках—цэнтры калгаса «Ленінскі сцяг».

— Як сцямнее, — гаворыць Ганна Акімаўна, — Вечны агонь ля Дзяражыч відаць далёка — аж у зарэчных украінскіх вёсках.

Ціха шумяць пад ласкавым ветрыкам вербы. У прырэчных лозах сінее туман. Як толькі першая зорка засвяцілася ў небе, падае голас драч. Старожкую цішыню наваколля парушае толькі раўнамерны рокат матора трактара. А на кручы трапеча-б'ецца, як агністая крыніца, полымя Вечнага агню. І здаецца, што водбліскі яго адсюль, з Дзяражыч, далятаюць аж да самых далёкіх куточкаў зямлі.

ЧОВЕН, ЧОВЕН...

Мілагучны, прывабны жаночы голас узлятае высока-высока і робіцца да жудасці страшнавата, што ён сарвецца, ападзе ўніз. Ды не — яго падхопліваюць дзявочыя галасы, і песня ляціць, усплывае, як дняпроўская чайка, над шырокімі вячэрнімі прасторамі.

Дарога бяжыць, пятляе паміж купчастых лозаў па пясчаных косах Дняпра ад Кашова да Першамайска. Амаль насупраць адсюль, за ракой, агні вялікай вёскі Пярэдзелка — цэнтра саўгаса «Дняпроўскі». А спяваюць жанчыны з Першамайска. Людзі тут галасістыя, любяць песню, вясёлае слоўца, жарт.

...У першых пасляваенных выпусках «Буквара» для першакласнікаў расказвалася пра дзеда Чучвагу з Першамайска. Хлопчыкі і дзяўчынкі па складах чыталі, як дзед дапамагаў савецкім салдатам, калі тыя восенню 1943 года фарсіравалі ў гэтых мясцінах Дняпро. Ад снарадаў узляталі ў паветра бёрны плытоў і часовых пераправаў, усё навокал выла і стагнала ад выбухаў. Тады да камандзіра прыйшоў шчуплаваты дзядок з касмылём барады, у аблавушцы і прапанаваў:

— У мяне ёсцека човен. Давайце буду перавозіць салдат вунь ад той затокі.

Так былы калгасны пастух дзед Чучвага, якому ішоў ужо сямідзесяты год, уключыўся ў свяшчэнную барацьбу з ворагам.

Шмат часу мінула з тых дзён. За адвагу і мужнасць стары Чучвага быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны. У вёску праз некалькі гадоў прыязджаў сцэнарыст Анатоль Вялюгін з кінааператарам Іосіфам Вейняровічам, каб мовай дакументальнага кіно расказаць пра мужны ўчынак старога. Але мінулі гады, і патроху забываліся тыя падзеі.

Калі мне надарылася быць у гэтых мясцінах, я паспрабаваў адшукаць човен старога Чучвагі, на якім ён некалі перавозіў савецкіх байцоў на правы бераг Дняпра.

— Вунь хата, дзе некалі жыў дзед, — паказаў мне белабрысы хлапчук з пасіваным носам. — Толькі там жывуць іншыя людзі.

У хаце жылі далёкія родзічы Чучвагі. Пра човен яны нічога пэўнага сказаць не змаглі, здзіўляліся, чаму гэта пра дзеда ўспомнілі: ён ніколі, бывала, не ўспамінаў пра тое, як перавозіў салдат.

— Калі вам цікава будзе, я магу паказаць, у якім месцы дзед прымыкаў сваю пасудзіну, — падахвоціўся гаспадар хаты — жылісты мужчына ў высокіх гумавых ботах.

Мы выйшлі з двара, прайшлі паміж лазнякоў у напрамку ракі. Жаночыя галасы ля клуба прадаўжалі абуджаць навакольную цішыню.

— Бач, няма ім упынку, — усміхнуўся чалавек. На момант прыпыніўся, прыслухаўся да песні і сказаў: — Нашы даяркі спяваюць. Іх нават у Гомель на тэлебачанне запрашалі.

На беразе Дняпра ў зямлю забіты паржавелы жалезны прэнт. Вада ціха пялёхкала каля яго. Мужчына падышоў да лазовага куста, нешта там доўга абмацваў у вадзе палкай, потым уздыхнуў. Вінавата паглядзеў на мяне:

— Няма дзедавага чоўна. Згніў.

Мы зноў прыслухаліся. У песні расказвалася, як плыў човен, хоць і быў «вады повен», далёка-далёка. Туды, дзе чакаў сваю любую казачэнька. І падумалася, што ў людской памяці застанецца і сціплы дзед Чучвага, які, можа, выратаваў у тую страшную ноч не адно чалавечае жыццё...

Міхась ДАНІЛЕНКА.

Лоеўскі раён.

ВІНШУЕМ

Віктару РАКАВУ ~ 50

Паэту Віктару Ракаву 22 студзеня спаўняецца 50 гадоў. З гэтай нагоды праўленне СП Беларусі накіравала юбіляру прывітальны адрас, у якім гаворыцца:

«Дарагі Віктар Апанасавіч!

Прыміце ад нас, Вашых калег і таварышаў па літаратурнай працы, шчырае вітанне ў дзень Вашага 50-годдзя!

Скончыўшы фізіка-матэматычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута, Вы настаўнічалі на Магілёўшчыне, спачатку ў Целяшоўскай школе, дзе калісьці вучыліся, а потым у Рэчкаўскай сярэдняй школе.

З юных год жыла ў Вашым сэрцы любоў да паэзіі, да роднай літаратуры, што і вызначыла ў далейшым Ваш працоўны і жыццёвы шлях.

Вы перайшлі на працу ў раённую газету «Ударны фронт», у якой загадвалі сельскагаспадарчым аддзелам.

Пасля заканчэння Мінскай вышэйшай партыйнай школы Вы супрацоўнічалі ў рэспубліканскай газеце «Звязда», узначальвалі аддзел публіцыстыкі часопіса «Полымя», дзе зараз працуеце адказным сакратаром.

Свае першыя вершы Вы надрукавалі яшчэ ў студэнцкія гады. У 1968 годзе выйшаў з друку Ваш першы паэтычны зборнік «Вернасць». Потым з'явіліся ў свет Вашы паэтычныя кнігі «Акно ў зялёны сад», «Пазыўныя», «Песня і памяць», «І сноп, і птушка, і я...»

У сваіх творах Вы таленавіта адлюстроўваеце духоўных свет нашага сучасніка, а найперш — прадстаўніка таго пакалення, на долю якога выпала цяжкое, апаленае вайной дзяцінства. Яго лёс трывожным водгуллем адгукаецца ў Вашых варшах, шчырых па інтанацыі і ясных па думцы, вершах, якія не пакідаюць абыякавымі розум і сэрцы чытачоў.

Горача віншуючы Вас з юбілеем, ад усяго сэрца жадаем Вам, дарагі Віктар Апанасавіч, добрага здароўя, вялікага чалавечага шчасця і новых поспехаў у працы і паэзіі!»

Супрацоўнікі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» шчыра далучаюцца да гэтага віншавання.

ГОЛАСАМ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

Стаю ля акна ў галоўным корпусе універсітэта, чакаю, калі адчыніцца бібліятэка. Па калідорах сюды-туды снуюць заклапочаныя студэнты, а непадалёк ад мяне сабраліся ў гурт хлопцы і, не зважаючы на мітусню, горача і ўсхвалявана спрачаюцца аб паэзіі. Гучаць імёны Рыгора Барадуліна, Васіля Зуёнка, Ўладзіміра Паўлава. Прыгледзеўся: высокі дзяцюк у акулярах гартае томік толькі што заснаванага альманаха «Дзень паэзіі» і ўголас, смакуючы кожнае слова, чытае вершы. Сваёй прастатой, праўдзівасцю і непадкупнай шчырасцю чамусьці запомніліся наступныя радкі.

Табе сэрца аддаць не магу:
У дарозе яно мне патрэбна, —
Я у ім родны край берагу,
Яго сонца, і хмары, і неба,
Даль за вёскай, і бэз ля акна,
І пракосы шырокія ў лузе...

Пасля я купіў альманах, знайшоў аўтара гэтага верша — Віктар Ракаў, і з таго часу, а таму ўжо акурат дваццаць гадоў, не прапускаў, бадай, ніводнай яго публікацыі, ніводнай кнігі. Голас паэта сталеў, мужнеў, асабліва не вылучаючыся, але і не губляючыся ў суладным хоры сваіх равеснікаў. Адзін за адным выходзяць паэтычныя зборнікі Віктара Ракава: «Вернасць», «Акно ў зялёны сад», «Пазыўныя», «Песня і памяць». Усё выразней у іх грамадзянскі тэмперамент паэта, якога хвалююць пераемнасць пакаленняў, тэма вайны і міру, гордае прызначэнне чалавека на зямлі.

Ціхай пчалінкай гудзі,
Песня мая, нада мною,
Полем, мяжой верасною,
Садам і лугам вядзі —
Ціхай пчалінкай гудзі.

Голасам роднай зямлі
Буду я вечна гуканы,
Буду навек закаханы
У гукі, што песню ўзнялі —
Песню бацькоўскай зямлі.

Паэзія Віктара Ракава і праўда спакойная, не крыклівая — «ціхай пчалінкай гудзе». Але пачуццё ў вершах наўздзіў глыбокае, скандэнсаванае: «За дабрату заплоцім дабратой». Ціхая песня далёка чуецца. Паэту нічога не трэба прыдумляць. Памяць, як сам ён прызнаецца, «перасыпана жарствой». На долю Віктара Ракава выпала халоднае і галоднае ваеннае дзяцінства. Хлапчук з вёскі Целяшы, што на Магілёўшчыне, на свае вочы бачыў зверствы фашысцкіх катаў, пакуты людзей. Бачыў і запомніў. Таму і верым шчырасці паэта, калі ў паэме «Цукар і соль» ён піша, звяртаючыся да свайго пакалення:

З зямлі,
З руін ты ўставала нялёгка.
Было табе мулка і дрогка
Прокладваць дарогу ў цалін.
У завеях расло ты і ў сцюжах,
І ў дыме кастроў, і ў грамах —
І сёння ў цябе нездарма
І хватка такая, і дужасць,
І спелая мара ў вачах.

Ад першай паэтычнай спробы да сённяшняй паэтычнай сталасці шлях быў, вядома ж, няпросты і пакутлівы. Віктар Ракаў настойліва шукаў сябе, і знайшоў — свой адметны голас, сваё бачанне свету, жыцця. Многае, канечне, дала праца настаўнікам, журналістам — спачатку ў «Звяздзе», а пасля ў часопісе «Полымя». Крытыкі не часта гарталі зборнікі паэта, але ў гэтым ёсць, бадай, і свой станоўчы бок. Прайшоўшы нялёгкія «жыццёвыя універсітэты», Віктар Ракаў застаўся чулым і сціплым чалавекам, і сваёй дабрынёй ён па-ранейшаму шчодра дзеліцца з людзьмі. З-пад усхваляванага пяра з'яўляюцца новыя вершы і паэмы. Чытачоў парадавала, безумоўна, і апошняя па часе падборка паэта, змешчаная ў студзеньскай кніжцы часопіса «Полымя». Шчырыя, праўдзівыя радкі:

Паклон і вітанне таму,
Хто мне ў спадарожніні выпаў
На свеце на гэтым.
Хто ж выбыў —
Хай вечная памяць яму.
Ён нешта зрабіў за свой век,
І мне быў у нечым карысны...
Усіх зразумець
І ўсім існым
Твой доўг
памагчы,
чалавек.

Вось і прыйшлі залатыя юбілеі да іх, пяцідзесяцігадовых. Час падлічваць набыткі, вызначаць новыя гарызонты. У Віктара Ракава, як і ў многіх яго равеснікаў, паэтычная кайстра таксама надзвычай пакоўная і важкая.

Віктар ГАРДЗЕЙ.

ДРУЖБА МАЦАВАЛАСЯ Ў ЗМАГАННІ

Цесныя ўзаемасувязі, плённыя кантакты сёння ў нас з усімі саюзнымі рэспублікамі. З народамі адных пачаліся раней, з другімі — пазней, але асабліва ўмацаваліся ў гады ўсталявання Савецкай улады, калі на тэрыторыі Беларусі за новае жыццё змагаліся прадстаўнікі розных нацый і народнасцей, а беларусы ў сваю чаргу неслі ідэі рэвалюцыі далёка ад роднага дома.

Кантакты з братнім Туркменістанам, які нядаўна адзначыў 60-годдзе сваёй дзяржаўнасці і Кампартыі Туркменістана, у гэтым сэнсе не выключэнне. Менавіта ў гады сумеснай барацьбы з контррэвалюцыяй і басмачаствам, эмісарамі замежных разведак, у агні класавых баёў ішлі поплеч беларусы і туркмены, змагаючыся за агульныя інтарэсы. Беларусы былі і сярод першых ашхабадскіх камісараў.

Пра Сяргея Малібожку, Мікалая Разанава, Барыса Тузіна ў кнізе «Не абрываецца зямная сувязь», якая выйшла ў выдавецтве «Туркменістан» яшчэ ў 1982 годзе, расказаў Мікалай Калінковіч, шмат папрацаваўшы ў архівах, сустракаючыся са сведкамі векапомных падзей. Пра гэты зборнік нарысаў і дакументальных аповесцей «ЛіМ» у свой час пісаў.

Пасля выхаду кнігі М. Калінковіч па-ранейшаму адшукваў звесткі пра тых, хто ўсталёўваў Савецкую ўладу ў Туркменістане, змагаўся з яе ворагамі. І зноў сустрэў прозвішчы нашых землякоў, якія ішлі ў адзіным страі са сваімі братамі-туркменамі. Новыя нарысы і аповесці пісьменніка (нядаўна М. Калінковіч прыняты ў члены Саюза пісьменнікаў СССР) склалі змест кнігі «Імя маё—свабода», якая сёлета выйшла з друку, таксама ў выдавецтве «Туркменістан».

Сярод нарысаў ёсць два, якія расказваюць пра гераічныя лёсы беларусаў, што ў далёкім краі знайшлі сваю другую радзіму, рабілі ўсё для таго, каб людзі гэтай зямлі маглі жыць радасна і шчасліва. Адзін з іх, Юліян Звераў, яшчэ ў час навучання ў духоўнай семінарыі пачаў займацца рэвалюцыйнай работай, а калі быў прызваны ў царскую армію, канчаткова вырашыў, што яго шлях з тымі, хто змагаецца за будучыню.

Нарыс так і называецца — «Выбар Юліяна Зверава». Аўтар знаёміць чытача са сваім героем у той важны момант, калі яму даручаюць адказную справу — Звераў павінен выканаць спецыяльнае баявое заданне: разам з кавалерыйскім палком, які ўзначальвае, трэба знішчыць асноўныя сілы князя Лівена — стаўленіка Юдзеніча. Здзейсніць гэта яму даручыў сам намеснік старшыні ВЧК Іван Ксенафонтавіч Ксенафонтаў.

Расказваючы аб правядзенні баявой аперацыі, М. Калінковіч, каб лепш раскрыць характар Зверава, робіць экскурс, паведамляе пра падзеі, якія папярэднічалі гэтаму, аднаму з асноўных момантаў у жыцці героя. Пісьменніку ўдаецца паказаць Зверава чалавекам цалкам адданым рэвалюцыі, асабіста смелым, сумленным і прынцыповым, які, як кажуць, ворага нутром адчувае. Не выпадкова, што дзякуючы Звераву і яго паплечнікам былі абяшкоджаны варожыя лазутчыкі, што таксама ў немалой ступені садзейнічала паспяховаму і своечасоваму выкананню задання. І гэтаксама не выпадкова Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі, даведаўшыся аб разгроме Лівена, а таксама паспяховай атацы асноўных сіл Юдзеніча, рэкамендаваў Ксенафонтаву: «Полк Зверава перайменаваць у атрад Асобага назначэння і перакінуць для абароны Кіева ад белапалякаў...».

Далейшае жыццё Зверава ўзнаўляецца найбольш праз дакументы тых гадоў: аўтар імкнецца да як мага большай пераканаўчасці. І, вядома ж, шмат гаворыць аб рабоце Зверава ў Ашхабадзе, калі ён узначаліў у маі 1934 года Народны камісарыят унутраных спраў.

Герой другога нарыса «У спісах — навекі» — начальнік пагранічнай заставы Давід Ярашэўскі. Біяграфія яго, праўда, куды больш кароткая. Да 1924 года жыў на тэрыторыі былой Заходняй Беларусі, адкуль быў прызваны ў польскую армію, але не мог абараняць інтарэсы тых, хто закабаліў родны народ. Трапіў у Савецкі Саюз, добраахвотна пайшоў вучыцца ў кавалерыйскую школу, пасля заканчэння якой і служыў на адной з пагранічных застаў.

Як і ў першым нарысе, М. Калінковіч шмат увагі надае дакументам. Прыводзяцца вытрымкі з апошняга ліста Ярашэўскага, пасланага блізкаму яму чалавеку Лідзіі Вашкевіч з Мазыра, запісы з яго блакнота. За скупымі радкамі паўстае воблік чалавека гарачага сэрца і адкрытай душы, сапраўднага патрыёта-інтэрнацыяналіста, які загінуў, абараняючы рубяжы Радзімы. Сёння партрэт Д. Ярашэўскага вісіць у Музеі пагранічных войск у Маскве. І жыве памяць аб героі на зямлі, за якую ён аддаў жыццё.

У аповесці «Супрацьстаянне» сярод іншых персанажаў паказаны Іван Трусевіч, таксама наш зямляк, чалавек гераічнага лёсу.

Кнігу «Імя маё—свабода» М. Калінковіча, як і папярэднюю «Не абрываецца зямная сувязь», успрымаеш як яшчэ адну старонку, якая дапамагае лепш зразумець шмат агульнага ў лёсах двух народаў-братоў—беларускага і туркменскага.

А. БЕРАЗОЎСКІ.

ГАЛАСЫ СЯБРОЎ

Барый НУГУМАНАЎ

Дзень добры!

Ёсць такія святыя словы
Ва ўсіх мовах гэтага свету.
І, сустрэўшыся,
ціснем мы рукі
І гаворым ад сэрца:
— Дзень добры!

Сустракаю я сябра бацькі
І кажу яму гэтыя словы,
Ды рукі ён не падае.
Толькі ціха плячом варушыць
І пустым рукавом варушыць,
І вось так кожны раз,
Больш як чвэртку гадоў
майго веку.
Ды на лёс ён не ў крыўдзе:
— Я то што, я здаровы,
Вось было б толькі ў свеце
спакойна...
Не было б толькі, кажа,
вайны.
І заўжды, як сустрэнуся
з ім я,
Крыкнуць хочацца мне на
ўвесь свет:
— Людзі, людзі, дзень
добры!
Шчасця вам, людзі!
Беражыце рукі для поціску
рук!

Сланечнік

Гэты сланечнік, як толькі
расцвіў,
Аблашчан быў сонцам
гарачым.
Ён толькі бачыў неба адно,
Ён болей нічога не бачыў.

Пара надышла.
Асыпаўся цвет.
Пачаў галаву да зямлі
схіляць ён.
Ён, можа, позна,
але зразумеў:
Зямля яму толькі — маці.

СТАРОННІ ЎСПАМІНАЎ

Дабрыня

Пісьменнікі, чытачы, знаёмыя і блізкія людзі добра ведаюць Алеся Пальчэўскага. Як пісьменніка, так і чалавека. Шмат хто можа сказаць сваё добрае слова і пра яго творы, і пра яго высакароднае жыццё.

Я таксама ў ліку тых, хто ў свой час адчуў чалавечую дабрыню, падтрымку Алеся Восіпавіча. І сёння прыемна ўсведамляць, што ў нас быў літаратар, які ў поўным сэнсе гэтага слова жыў для іншых — для Радзімы, для народа, для літаратуры, а сам для сябе быў ашчадны, бачачы шчасце тады, калі найперш нехта быў шчаслівы. Многім здавалася і здаецца, што гэта зусім натуральная рэч — жыць па законах высокай народнай маралі, але на самай справе не кожны вытрымлівае гэты просты і ў той жа час і самы цяжкі экзамен.

...Успамінаецца жнівень 1973 года. Ехаў я ў цягніку «Барысаў — Мінск» узбуджаны. Нават больш — разгублены. Я надумаўся зрабіць у сваім жыцці рэзкі паварот.

Цягнік імчаўся, я сядзеў і пазіраў на прыціхлыя пад шчодрым сонцам хаты і буйныя яблыкі ў садах, на парыжэлыя ўжо стагі на сенажацях, на камбайны, што адзін за адным хадзілі па жоўтым полі, на задумлівы лес, на гурты шпакоў, якія альбо садзіліся плоймаю, альбо пломаю падхопліваліся і захілялі сабою неба, дык вось, я сядзеў, пазіраў, а ў вушах чулася то жончынае нерашучае: «Глядзі сам, ты гаспадар...», то ўсхваляванае загадчыка райана: «Ты што — кідаеш школу? Назусім? Хочаш: пад самы Барысаў дырэктарам дзесяцігодкі перавяду?»

Так, вырашыў тады: бывай, вёска і школа! Добры дзень, горад! Праўда, такое па-малодому дзёрзкае рашэнне было кінута на вагі лёсу за суткі, але паступова ўсё больш і больш у цягніку пачаў тачыць душу чарвячок сумненняў і боязі: папрацаваў ты ўжо, дружа, пяць гадоў, авалодаў сякімі-такімі педагагічнымі сакрэтамі, маеш на кавалак хлеба, прытулак, пачаў пакрысе саліднець у настаўніцкім свеце, нават ужо трапляць у прэзідыумы раённага маштабу, а там, у Мінску, у літаратурным асяроддзі, што і як будзе? Добра, нават цудоўна, што цябе запрасілі на працу ў аддзел прозы «Полымя», але як ты, аўтар усяго некалькіх надрукаваных апавяданняў, будзеш працаваць побач з такімі вядомымі пісьменнікамі, як Кастусь Кірэенка, Анатоль Вялюгін, Іван Пташнікаў, Барыс Сачанка, Іван Чыгрынаў? Ці здолееш не толькі рэдагаваць творы масцітых, але нават па-людску пагаварыць з імі? Ці зможаш не толькі стаць прафесійным літаратарам, але хоць ацалець на новай для сябе ніве? Што будзе з прапіскаю, жыллём? Як будзе жыць у вёсцы жонка, якая павінна не толькі працаваць у школе, гадаваць малога сына, але і яшчэ падымаць на ногі маю самую малодшую сястру, якую мы пасля смерці маці ўзялі да сябе? Карацей, пытанняў, клопатаў было нямала, як і бывае ў таго, хто пачынае нешта будаваць адзін на новым месцы.

Але свет не без добрых людзей. Кастусь Кірэенка, улічыўшы «сватанне» Івана Пташнікава і Барыса Сачанкі ды заручыўшыся падтрымкаю тагачаснага першага сакратара праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Івана Шамякіна, узяў мяне на працу без прапіскі. Само па сабе зразумела, такое выключэнне было зроблена толькі часова.

Я працаваў, як кажуць, на птушыных правах, ліпеў у сталіцы і настойліва выпрабоўваў усе сродкі, каб стаць законным мінчанінам. Але прайшло амаль паўгода, а сцвердзіцца ў гэтай ролі мне ніяк не ўдавалася. Ні самыя розныя паперы, ні званкі ўплывовых людзей усё не маглі ашчаслівіць мяне. Апошняя мая надзея была на чарговы, але, як я лічыў, вельмі важны ліст, які паслалі бацькам горада за подпісам аднаго з кіраўнікоў Саюза пісьменнікаў. Калі ж прыйшоў халодны адказ, што «няма патрэбы шукаць кадры з боку, бо можна абысціся мясцовымі сіламі», калі пры зачытанні гэтага адказу моцна і па-сатанінску радасна зарагатаў адзін з супрацоўнікаў СП («Ну, малец, табе і пляснулі ў лобі!»), мяне паласнуў адчай. І ад таго «звышразумнага» адказу «з клопатам пра мясцовыя кадры», і ад таго радаснага смеху літаратара, і ад свайго бяссілля: выходзіць, я, вясковец, не патрэбен ні гораду, ні нашым літаратурным органам. Я рашыў: усё, бывай, непрыхільная родная сталіца, літаратурнае асяроддзе, вяртаюся на блізкую сэрцу Барысаўшчыну, дзе знайду сапраўдную падтрымку. Горад не для мяне, падумаў я ў маладой крыўдзе, а для іншых шчасліўцаў — скажам, найперш для спартсменаў, кінематаграфістаў.

На шчасце ці на бяду, мяне ў такім засмучаным стане на лаўцы ў парку імя М. Горкага ўбачыў Уладзімір Дамашэвіч.

Ён, шчыры, спагадлівы, сапраўдны бацька маладых літаратараў, часамі ўжо і завялікі гуманіст, пачаў супакойваць мяне і заклікаць да цярплівасці і самавалодання — вучыў не траціць раўнавагі ад бюракратычнага люду ды кепікаў тых, хто радуецца ад чужых няўдач. Бывае, мудра сказаў Уладзімір Максімавіч, усё мяняецца і ў лепшы бок. Хто адчуў горыч, той рана-позна адчуе і радасць.

Супакоіўшы мяне, ён натхніў на вытрымку і паабяцаў пазваніць мне днямі на работу. Можа, сказаў, не ўсе яшчэ вычарпаны для мяне сродкі, можа, і знойдзецца нейкі адзін, але самы верны выхад.

Назаўтра мы зноў сустрэліся тут, у парку.

— Ёсць надзея для вас, — сказаў Уладзімір Максімавіч. — Хадзем да Алеся Пальчэўскага.

Сказаў вось так нешматслоўна ды загадкава і паёў мяне на вуліцу Чарнышэўскага, а я крочыў побач нібы не сваімі нагамі. Я чытаў творы гэтага пісьменніка — і апавяданні, і аповесці «Шчырасць», «Жнівеньская раніца», «Акно на волю», «Ты не адзін», «Данеўцы — нашы знаёмыя», — але самога Алеся Восіпавіча амаль не ведаў. А ён, падумаў я тады ліхаманкава, мяне зусім не ведае.

Праўда, адзін раз у жыцці, нейкіх хвілін пятнаццаць, мне давялося яшчэ ў студэнцтве пабачыць Алеся Восіпавіча, калі прыносіў на курсе другім дзіцячую казачку ў «Вясёлку». Тады Алесь Восіпавіч сядзеў разам у адным пакоі з Сяргеем Грахоўскім і Васілём Віткам. Дык па іх прапанове я, чырванеючы ды млеючы ад сораму, прамямліў услых тую казачку. За нешта мяне хвалілі, нешта раілі, але больш той казачкі я нікому і не паказаў, бо, дзякуй богу, душою адчуў, што пісаць творы для дзяцей мне не прыйшоў яшчэ час.

Я ўспомніў тую сустрэчу і здзівіўся: Алесь Восіпавіч, канечне, ж, сустракаў сотні такіх, як я, маладых аўтараў, канечне ж, забыў мяне, але няўжо хоча памагчы незнаёмаму чалавеку!? Як і чым?! Ці не суцяшэннем? Але ж я іх маю ўдосталь.

— Не хвалюйцеся,—здаецца, нават не пазіраючы на мяне, зноў адчуў мой стан і супакоіў Дамашэвіч. — Алесь Восіпавіч — цудоўны чалавек. Ён зробіць усё, што можа.

Неўзабаве на наш званок адчыніў дзверы сам Пальчэўскі. Я адразу пазнаў яго і па той сустрэчы, і па здымках: высокі і, для паважанага ўзросту, стройны. Толькі, здаецца, за гэтыя гады ссівелы ды з пакутаю ў вачах. Але пры ўсмешцы гэтае пакутніцтва адразу знікла і позірк напоўніўся цяплом.

— Заходзьце, — запрасіў гаспадар, павітаў нас. — Дык вось які ён, наш герой, — усміхнуўся мне. — Зусім яшчэ малады.

Пасля, запрасіўшы ў сціплы, без дарагіх, шыкоўных рэчаў, але вельмі ўтульны гасціны пакой, ён распытаў, хто я і адкуль, хто мае бацькі і якая мая сям'я, сказаў добрае слова пра мой трыпціх «Настаўнікі». Яму спадабалася ў тых апавя-

Імя башкірскага паэта Барыя Нугуманава добра вядома на яго радзіме. Ён аўтар паэтычных зборнікаў «Белыя світанні», «Сямізор'е», «Званы», «Кастры гараць», шэрагу кніг для дзяцей.

Нарадзіўся паэт у башкірскім сяле Стара Бабічава ў 1939 годзе. Пасля заканчэння сярэдняй школы па камсамольскай путёўцы паехаў на будоўлю. Працаваў цесляром, арматуршчыкам. Потым служыў у Савецкай Арміі. Закончыў Башкірскі дзяржаўны універсітэт і Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве.

Прапаную чытачам «ЛіМа» новыя вершы Б. Нугуманава ў сваім перакладзе.

Казімір КАМЕЯША.

Дарогі

Дарогі, дарогі...
Штодзень, штогод
Мне шчодра іх час
прыбаўляе.
Былыя ў даліне маршчыняцца
дзесь,
А новыя ў горы сягаюць.

Клічуць дарогі зблізку,
здалёк.
Іду я. Прытомы не знаю.
То кронай вітае мяне салавей,
То жаўранкам неба вітае.

Бывае часамі цярністы
мой шлях,
Ды лёгкіх шляхоў ці многа?
І ноша мая ўсё цяжэй
і цяжэй.
А без ношы няма дарогі.

Сэрца

А сэрца, яно —
шматтомнік няйначай,
Гартаеш старонкі яго, і дзіву
даешся —
Столькі тут і пачуццяў,
і мараў.
Як ты носіш іх, чалавек,
і не гнешся?

Там столькі шчасця —
на свет увесь хопіць,
Акіян неспакою і слёз
ручаіны,
Каханне першае,
і смутак першы,
І дзяцінства далёкага
успаміны,
Там ёсць і песня
непраспяваная,
Мая любоў з маёй
нянавісцю.
Толькі няма там месца
спакою,
Спакой у сэрцы
на ўліку не значыцца.

З'яўляюцца новыя думкі,
памкненні.
У сэрцы заўсёды ім хопіць
месца.
Столькі ў сэрцы маім
дабрыні!
Ад ношы такой спіна
не сагнецца!

Сем апор

«Раслі сіротамі
Сямёра дзяцей.
Выраслі ўсе сямёра...»
Сустрэўшы мяне,
прыгадаць хацеў
Хтосьці забытае гора.
Сіратой не завіце мяне,
Прашу,
Не варушыце старога болю.
Была вайна,
Вайна магла
Зрабіць сіратой любога.
Так. Было.
На скрыжаванні сямі
дарог
Семдзесят бед адразу
сышлося.
Ды ўсе мы сцярпелі,
Хто мог, хто не мог,
Бо лёс краіны
быў нашым лёсам.
Жывая Радзіма — жывыя і мы.
Часамі душа заныя.
Палалі маланкі,
Грымелі грамы,
А мы — жывыя.
Мы ведаем хлебу цану.
З мазаля
Жылі мы, без бацькі,
без маці.
Паветра і сонца,
Вада і зямля —
Усё было нашым багаццем.
Сынамі краіны ў краіне
завуць
Сірот.
Мы — сыны ёй, адзінай.
Сямёра сірот,
што шчасліва жывуць,—
Сем верных апор для
Айчыны.

даннях мова і, як сказаў ён, «сталы ўжо жывапіс».

Затым, неяк і самотна, і ў той жа час радасна задумаўшыся, усміхнуўся і пахітаў галавою:

— Усе мы, сялянскія дзеці, вось гэтак ішлі з вёсак у горад, у літаратуру. Праўда, у кожнага былі свае цяжкасці. У каго большыя, у каго меншыя. Не так проста і вам, цяперашнім. Што датычыць асабіста вас, уюнаша, як кажа Міхась Лынькоў, дык пастараюся памагчы. Трэба, каб і ў нашай літаратуры быў Генрых, а то ў нас адны Генадзі... Чуў: цяпер ёсць новы намер дакладна падлічыць, колькі жыхароў у Мінску. Хто працуе тут, хто можа знайсці нават невялікую плошчу — усіх перавядуць у статус мінчан. Вернецца вось з Грузіі мая Тамара Рыгораўна, пагаворым — думаю, мы выкарыстаем тую магчымасць і вы станеце нашым падсуседам.

Праз тыдзень ці два жонка Алеся Восіпавіча, Тамара Рыгораўна, вярнулася з Грузіі, і Алесь Восіпавіч праз У. Дамашэвіча перадаў, што я магу пускаць у ход паперы. З імі я зайшоў з паэтам Яўгенам Хвалеем да начальніка пашпартнага стала, і той праз некалькі хвілін павіншаваў мяне з гараджанствам.

Пасля гэтага мы пачалі часта сустракацца з Пальчэўскімі, то яны нам, то мы ім званілі. Я добра пазнаёміўся і з Тамарай Рыгораўнай, артысткай, пісьменніцай, вельмі абаяльнай жанчынай. Мне давялося ў часопісе «Полымя» падрыхтоўваць да друку аўтабіяграфічную аповесць «Сцежкі», дык Алесь Восіпавіч пад час сустрэч, прагулянак па горадзе, а, бывала, і па парку Чалюскінцаў шмат расказваў мне пра сваё дзяцінства, пра ўзбуджаныя 20-ыя гады, пра свае жыццёвыя адысеі, пра сяброў і непрыяцеляў, пра сваю (і не толькі сваю) літаратурную маладосць, пра першую сям'ю (пра першую жонку і сына, што выракліся яго і не чакалі адтуль, куды закінуў яго лёс), пра Тамару Рыгораўну і яе таксама нялёгкі лёс. Я слухаў і здзіўляўся: колькі бяды, гора, пакут выцерпеў гэты чалавек. Аднак колькі ў яго мужнасці і дабрыні: як ні экзаменавалі, ламалі яго жыццё ды людзі, а ён не пахіснуўся, не зазласнеў і не ачарсцвеў, устояў, перамог нягоды і выпраменьваў дабро. З ім побач не маглі прысутнічаць фальш, зло. Яны былі бяссільныя перад сілаю яго дабрыні. Прыкладна так гаварыў мне і Генадзь Бураўкін, калі мы аднойчы разам зайшлі да Алеся Восіпавіча і Тамары Рыгораўны (я, шчаслівы, выпісаўшыся ад Пальчэўскіх, маючы ўжо ордэр на кватэру, прынёс кветкі, а Бураўкін і Дамашэвіч прыйшлі праведаць старэйшых калег), калі мы пасля добрага пачастунку з беларускай і грузінскай кухні ішлі па начным горадзе, і нам было добра ад цудоўнага вечара, які мы правялі ў Пальчэўскіх.

...Больш чым дзесяць год ужо лічуся пісьменнікам, удзельнічаю ў літаратурным жыцці. Час нібы невялікі, але, божа мой, колькі і якіх страцілі мы цудоўных пісьменнікаў!.. Усе яны ох як трэба былі нашай не беднай, але ўсё яшчэ маладой літаратуры, якой яшчэ столькі наперадзе работы і мужнасці. І «спакойны, сціплы», як пісалі некаторыя крытыкі, талент Алеся Восіпавіча яшчэ спатрэбіўся б нам. Але, на жаль, жыццё дыктуе сваё. 26 красавіка 1979 года, не дажыўшы менш чым год да свайго 75-годдзя, Алесь Восіпавіч пайшоў ад нас назаўсёды, каб спачыць, каб ужо іншыя сцвярджалі неўміручасць жыцця, мужнасць і высакароднасць.

Цяжкое было тое развітанне са старэйшым калегам — жалобны мітынг у Мінску і пахаванне ў роднай вёсцы Алеся Восіпавіча. У Прусінаве адпраўляць свайго земляка выйшлі ўсе вяскоўцы. Яны любілі яго і як чалавека, і як пісьменніка. Ён, да слова, за свой кошт абгарадзіў могілкі ў Прусінаве, падправіў дарогу да шашы, як мог, памагаў родзічам, землякам — усюды і ва ўсім, як гаварылася ўжо, ён жыў найперш для іншых, не мог спакойна і раўнадушна прайсці ля чужой бяды ці нейкага непарадку.

Пазней, калі мяне абралі старшынёй камісіі па творчай спадчыне Алеся Восіпавіча, мы з Тамарай Рыгораўнай пераглядзелі архіў пісьменніка — апублікавалі ў газетах і часопісах яго новыя апавяданні, аповесць «За парогам», падрыхтавалі і правялі ў 1980 годзе вялікі літаратурны вечар, прысвечаны 75-годдзю Алеся Восіпавіча. Калі чаго не зрабілі большага, дык не ўсё было ў нашай моцы...

Кожны год, у дзень нараджэння Алеся Восіпавіча, Тамара Рыгораўна запрашае сяброў, блізкіх Алесю Восіпавічу людзей да сябе і просіць: вас, мае мілыя сябры, ведаў, любіў гаспадар, дык адчувайце сябе, як бы і ён па-ранейшаму жыве з намі, радуецца за дабро, за нечыя поспехі, засмучаецца, калі недзе нешта не так. Мы, сабраўшыся за гасцінным сталом, дзе мірна і хораша суседнічаюць беларускія і грузінскія стравы, адчуваем прысутнасць сардэчнага Алеся Восіпавіча, якому сёлета споўнілася б 80 гадоў. А я нядаўна, калі пісаў першы свой раман «Гаспадар - камень», дык многія чалавечыя якасці Алеся Восіпавіча «перадаў» аднаму з галоўных герояў — настаўніку Алесю Нямкевічу...

...Чытач, канечне, заўважыў, што я тут нямала расказаў і пра сваю, на сённяшні дзень не такую ўжо і страшную адысею. Я рабіў гэта наўмысна. Дзеля новых маладых пісьменнікаў: няхай, дарагія сябры, на пачатку вашага творчага шляху і вам усім трапіцца на жыццёвай дарозе высакародны старэйшы таварыш, які абагрэе вас і словам і справаю, натхніць на жыццё і творчасць. А вы будзьце ў сваю чаргу ўдзячныя таму, хто вас своечасова падтрымаў пад локаць...

Генрых ДАЛІДОВІЧ.

КОНКУРС «ДРУЖБА»

Маладзёжныя часопісы «Маладосць», «Яўніма Гратас» (Літва), «Ліесма» (Латвія) і «Ноорус» (Эстонія) рэгулярна з 1975 года праводзяць міжрэспубліканскі конкурс на лепшыя творы нарыса і публіцыстыкі.

Сёлета конкурс «Дружба» быў прысвечаны 40-годдзю Перамогі над фашысцкай Германіяй і 45-годдзю аднаўлення Савецкай улады ў Літве, Латвіі і Эстоніі. На конкурс паступілі нарысы, эсэ, артыкулы, прысвечаныя гераізму савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пасляваенным ратным подзвігам, сённяшнім працоўным справам нашага старэйшага пакалення і моладзі, разнастайным пытанням камсамольска-маладзёжнага жыцця.

Спачатку журы кожнага часопіса разгледзела творы ў сябе, а пасля выбрала пяць лепшых нарысаў і публіцыстычных артыкулаў і прадставіла іх на міжрэспубліканскі конкурс.

У студзені гэтага года ў Таліне сабралася міжрэспубліканскае журы, куды ўваходзілі па два прадстаўнікі ад кожнага часопіса, і разгледзела ўсе дваццаць работ, што прайшлі першы тур адбору ў рэспубліках.

У выніку абмеркавання і закрытага галасавання галоўная прэмія (500 руб.) была прысуджана беларускаму пісьменніку У. Саламаху за нарыс «Зямныя сімвалы».

Нашы журналісты В. Ткачоў і А. Ярась таксама аказаліся ў ліку тых, хто атрымаў прызы. Іхнія публіцыстычныя творы былі ўдастоены другіх прэмій (па 300 руб.).

Міжрэспубліканскае журы станоўча ацаніла дзесяцігадовую дзейнасць конкурсу «Дружба», што спрыяе прыцягненню лепшых майстроў слова — літаратараў і публіцыстаў — да напісання высокаідэйных і мастацкіх твораў пра савецкі народ і яго гуманістычную місію. Вырашана ў 1986—1987 гадах зноў правесці конкурс і прысвяціць яго 70-годдзю Вялікага Кастрычніка.

Г. СТАУБЦОУСКІ.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯ «ЛіМа»

«ДАЧНЫ БУМ, АБО ХТО ЯК МОЖА»

Пад такой назвай у «Літаратуры і мастацтве» за 28 верасня 1984 г. быў надрукаваны артыкул, у якім узнімаліся праблемы дачнага будаўніцтва. У ім, прынамсі, звярталася ўвага на дрэнную арганізацыю продажу насельніцтву будаўнічых матэрыялаў у сістэме Дзяржснаба БССР, на паборы з кліентаў на Мінскім тарарамонтным прадпрыемстве, нізкія тэмпы і якасць будаўніцтва садовых домікаў у трэстах Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі БССР; у артыкуле гаварылася таксама пра парушэнні ў радзе месц статута садова-дачных кааператываў, выкарыстанне дачнікамі «левага» транспарту, набыццё таксама «левых» будаўнічых матэрыялаў, угнаенняў і г. д.; пра шабашніцтва, якое працвітае па-за ўсякім кантролем.

Намеснік старшыні Дзяржснаба БССР П. Веліч паведаміў рэдакцыі: «Цяжкасці ў забеспячэнні насельніцтва г. Мінска лясными і будаўнічымі матэрыяламі тлумачацца ў асноўным рэзкім павелічэннем попыту на іх у сувязі з развіццём калектыўнага садоўніцтва, а таксама недахопамі ў арганізацыі гандлю трэстам «Белтара».

Артыкул «Дачны бум, або Хто як можа» быў абмеркаваны на адкрытым партыйным сходзе трэста. Зацверджаны мерапрыемствы па паляпшэнні арганізацыі гандлю лясными і будаўнічымі матэрыяламі на Мінскім тарарамонтным прадпрыемстве. За ходам іх выканання ўстаноўлены кантроль.

За дапушчаныя недахопы дырэктар Мінскага тарарамонтнага прадпрыемства А. Каваленка і начальнік аддзела трэста «Белтара» І. Бахановіч строга папярэджаны.

Для ліквідацыі негатыўных з'яў, якія мелі месца пры пагрузцы набытых насельніцтвам тавараў, арганізавана брыгада грузчыкаў і дадаткова ўведзена пасада майстра па пагрузаразгрузачных работах. Пагрузка матэрыялаў будзе праводзіцца пры аплаце насельніцтвам гэтых паслуг па зацверджаных тарыфах праз касу прадпрыемства.

Пытанне паляпшэння гандлю лясными і будаўнічымі матэрыяламі разглядалася ў снежні 1984 г. на пасяджэнні калегіі Дзяржснаба БССР».

П. Веліч паведаміў таксама, што для больш поўнага забеспячэння попыту насельніцтва на будаўнічыя матэрыялы ў 1985 годзе ў параўнанні з папярэднім годам фонды на фанеру будуць павялічаны на 79 працэнтаў, драўляна-стружачныя пліты — на 40, драўляна-валакністыя пліты — у тры разы, аконныя блокі — на 50 працэнтаў, аблiцовачныя пліты — на 16, жалезабетонныя вырабы — на 42,9 працэнты і г. д.

«Газета «Літаратура і мастацтва» ў артыкуле «Дачны бум, або Хто як можа» ўзняла праблему дачнага будаўніцтва і справядліва адзначыла хібы ў яе арганізацыі», — напісаў у рэдакцыю намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі БССР В. Смірноў.

Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі БССР прымае меры па павелічэнні аб'ёмаў работ па будаўніцтве садовых домікаў, павышэнні якасці работ і захаванні тэрмінаў выканання заказаў. У прыватнасці, нарошчваюцца магутнасці па дрэваапрацоўцы камбіната «Мінскпрамбуд», што дасць магчымасць мінскаму трэсту «Будбытрамонт» павялічыць колькасныя і якасныя паказчыкі пры будаўніцтве садовых домікаў у Мінскім раёне.

На жаль, гэтыя два адказы — адзіныя, дзе робіцца спроба больш-менш канкрэтна адказаць на пытанні, закранутыя ў артыкуле. У іншых адказах кідаецца ў вочы спроба, мякка кажучы, адпісацца, скласці з сябе ўсялякую адказнасць. Вось адзін з такіх адказаў — ліст у рэдакцыю начальніка ўпраўлення па будаўніцтве і архітэктуры Мінскага аблвыканкома Я. Кавалеўскага. «Паведамляем, — піша ён, — што па даручэнні аблвыканкома артыкул «Дачны бум, або Хто як можа» разгледжаны. Факты, выкладзеныя ў артыкуле, упраўленню ўжо былі вядомыя, у сувязі з чым прыняты пэўныя меры па ліквідацыі парушэнняў. Так, 22 мая 1984 года ўпраўленнем разам з аблсаўпрофам зроблена праверка ўказаных потым у артыкуле садоўніцкіх таварыстваў, па ўстаноўленых фактах парушэнняў райвыканкомам па прыналежнасці накіраваны пісьмы для прыняцця адпаведных мер...»

З усяго вышэйсказанага, відаць, адпавядае ісціне толькі тое, што аблвыканком даручыў упраўленню адрэагаваць на артыкул. У астатнім канцы з канцамі, проста скажам, не сыходзяцца. Па-першае, калі «факты, выкладзеныя ў артыкуле, упраўленню ўжо былі вядомыя» і па іх прыняты меры, дык чаму нічога не змянілася? Значыць, меры гэтыя аказаліся неэфектыўнымі? Па-другое, тав. Кавалеўскі піша, што яшчэ за паўгода да публікацыі ўпраўленне правярала названыя ў артыкуле садова-дачныя таварыствы. Інжынер упраўлення т. Кузняцоў, які суправаджаў карэспандэнта «ЛіМа» ў яго паездцы па дачных кааператывах, упершыню, па яго словах (а ён менавіта і адказвае ва ўпраўленні за будаўніцтва «дач»), быў у названых у артыкуле таварыствах «Глобус», «Пагоркі», «Купалінка». Толькі адно таварыства «Чырвоны Кастрычнік», што ў Барысаўскім раёне, было праверана ўпраўленнем, пра што і ўспаміналася ў артыкуле.

Рэдакцыя спадзяецца, што кіраўніцтва Мінскага аблвыканкома зробіць неабходную ацэнку таго, як упраўленне кантралюе праектаванне і забудову ўчасткаў садова-дачных таварыстваў.

Не змог задаволіць рэдакцыю і адказ начальніка АБРСУ упраўлення ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкома І. Краўцова, у якім паведамляецца, што «зроблена зверка паступлення грошай у касу Мінскага тарарамонтнага прадпрыемства і іх апрыходванне ў адпаведнасці з дакументамі, прадстаўленымі забудоўшчыкамі. Парушэнняў пры гэтым не выяўлена. Па матэрыялах разбіральніцтва ва ўзбуджэнні крымінальнай справы адмоўлена». Хоць у артыкуле гаворка ішла пра закупкі шабашнікамі дэфіцытных матэрыялаў, за якімі звычайна людзі стаяць у чарзе месяцамі. Праўда, у канцы пісьма паведамляецца, што «Артыкул «Дачны бум...» абмеркаваны ў аддзеле БРСУ УУС Мінаблвыканкома. Прыняты меры да актывізацыі работы супрацоўнікаў гаррайаддзелаў па дадзеным накірунку аператыўна-службовай дзейнасці».

Будзем спадзявацца, што гэта спраўдзіцца.

У чароўнай краіне лялек

Акцёры Аляксандр Казакоў, Любоў Цяўлоўская, Людміла Немагай, Аляксандр Васько і Алена Лугініна з лялькамі — персанажамі «Казкі пра цара Салтана».

Чароўная краіна лялек... Гэта, вядома, лялечны тэатр. У дадзеным выпадку маем на ўвазе Дзяржаўны тэатр лялек БССР, самы галоўны лялечны тэатр нашай рэспублікі. Яму, як вядома, больш за сорак гадоў. Тут працуюць і фантазіруюць даравітыя людзі.

Перш чым гледачы ўбачаць прадстаўленне, мастакі тэатра робяць эскізы лялек і дэкарацый. Зацверджаныя варыянты трапляюць у майстэрні тэатра. Там з дрэва, стружак, кардону, пап'е-машэ, фанеры, дроту і іншых матэрыялаў майстры сваёй справы ствараюць персанажы і дэкарацыі будучага спектакля. Цікава назіраць, як пад умелымі, трапяткімі рукамі нараджаюцца вясёлыя або самотныя твары, як з'яўляюцца і ажываюць рукі і ногі, лапы і хвосцікі, крылы і грывы, надзяваюцца парыкі і касцюмы. Потым усё гэта трапляе да мастакоў — для роспісу лялек і дэкарацый.

Ажываюць лялькі ў руках акцёраў — пачынаюцца рэпетыцыі на сцэне. Артысты ўжо ведаюць свае ролі, але самае галоўнае наперадзе: трэба «зжыцца» з лялькай, навучыцца лёгка маніпуліраваць яе механізмам. Бо многія лялькі адкрываюць і закрываюць рот, вочы, махаюць рукамі, нагамі, а звяры—хвастамі, лапамі. У страшных драконаў з пашчы вырываюцца дым і агонь. А бывае, што адну ляльку вядуць адразу некалькі акцёраў: вось ужо дзе трэба працаваць сінхронна і спрытна!

А дэкарацыі? Горы, рэкі, лясы, хмары, дождж, гром, маланка, казачныя палацы і маленькія хаткі звяркоў. Знікненне і пераўтварэнне, зіма, лета, ноч і раніца—усё падуладнае чараўнікам-лялечнікам!

Ну, а які ж спектакль тут ідзе без спеваў? Да справы далучаецца кампазітар. Песня, напісаная да дзіцячага спектакля, павінна быць падарункам для дзяцей. Калі песню дзеці падхапілі адразу ў час спектакля, хіба гэта не лепшая ўзнагарода паэту і кампазітару!

Такія мелодыі ёсць у спектаклях мінскіх лялечнікаў. З тэатрам супрацоўнічаюць беларускія кампазітары В. Іваноў, У. Прохараў, В. Войцік, В. Помазаў і іншыя.

На афішах тэатра вялікія імёны: А. Пушкін, М. Ляскоў, Я. Гашак, О. Уайльд, У. Маякоўскі, Х.-К. Андэрсен. У рэпертуары спектаклі па п'есах беларускіх драматургаў В. Вольскага, А. Вольскага, Г. Марчука, С. Клімковіч, творы В. Шукшына, І. Штока, В. Карастылёва, С. Пракоф'евай і іншых. «Доктар Айбаліт», «Таямнічы гіпапатам», «Трыццаць восем папугаеў», «Заечая школа», «Дзед і жораў», «Балада пра белую вішню», «Гадзіннік з зязюляй», «Казка пра цара Салтана», «Чароўная лямпа Аладзіна», «Боская камедыя», «Ляўша», «Прыгожая Галатэя», «Да трэціх пеўняў», — шмат можна назваць спектакляў для дзяцей і дарослых. Для юных гледачоў (ад дашкольнікаў да старшакласнікаў) тэатр дае каля чатырохсот спектакляў у год (не толькі ў сябе ў тэатральнай зале, але і на выездзе: у школах, у піянерлагерах, на прадпрыемствах, у вёсках, на гастролях у іншых гарадах краіны), для дарослых — каля васьмідзесяці спектакляў за год.

Арганізатар тэатра, які з першых дзён узначаліў творчы калектыў мінскіх лялечнікаў,—яго галоўны рэжысёр, народны артыст БССР Анатоль Ляляўскі, займаецца і выхаваннем маладой змены акцёраў-лялечнікаў. Не першы год ён —мастацкі кіраўнік курса акцёраў тэатраў лялек у БДТМІ. Многія яго выхаванцы працуюць у лялечных тэатрах Беларусі. Прынамсі, у Мінску—У. Варанкоў, А. Васько, А. Лугініна, Л. Немагай, А. Длузскі, Н. Янкоўская, А. Казакоў... Яны, маладыя, адчуваюць дапамогу і падтрымку старэйшых калег: заслужаных артыстаў рэспублікі У. Уласава, У. Грамовіча, артыстак Н. Пахомавай, В. Пражэевай, Л. Цяўлоўскай, Л. Мікула, артыстаў У. Палякова, Ю. Сарычава, А. Вергунова і інш.

Шмат гадоў працуе ў калектыве галоўны мастак тэатра Аліна Фаміна: сотням забаўных, цікавых, разнастайных па канструкцыі лялек адкрыла яна шлях на сцэну.

Шырэ кола сяброў Дзяржаўнага тэатра лялек БССР. Тыя, хто ўпершыню ў трохгадовым узросце трапіў на спектакль у гэтую залу, тыя, чые шчырыя захопленыя вочы асвятліліся чароўнымі промнямі рампы, каго тэатр паланіў светам дзівосаў, пасеяў у душы добрае насенне, тыя і праз сорак гадоў захавалі захапленне мастацтвам і перадаюць яго сваім дзецям. А заўтра ў гэты чароўны свет увойдуць іх унукі і ўнучкі...

Сотні дзіцячых сэрцаў усхвалявана заб'ецца ў час падарожжа ў чароўны свет, дзе народны герой-волат вызваліць сваю зямлю ад ворага і не дасць у крыўду слабога, дзе дабро абавязкова возьме верх над злом.

А. ВАЙНШТЭЙН.

Фота аўтара.

ПЛЁН САМАБЫТНЫХ МАЙСТРОЎ

Перш за ўсё здзіўляешся фантазіі, смеласці задум і арыгінальнасці ўзораў, форм, вобразаў. Выстаўка прыцягвае ўвагу сваёй жанравай разнастайнасцю, захапляе насычанасцю каларыту, падкупляе дасціпнасцю і ўмельствам.

Тут, у музычна - мастацкім салоне Драгічынскага раённага Дома культуры, сабраны сапраўды багаты плён працы самабытных майстроў аднаго з цікавейшых куткоў беларускага Палесся. Выстаўка работ народных умельцаў прысвячаецца слаўнаму 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

У экспазіцыі — ручнікі, абрусы, посцілкі, дываны, пано, сурвэткі. Тут жа вырабы і сувеніры з самага разнастайнага матэрыялу: дрэва, гліны, паперы, саломкі, металу. Захапляюць багаццем арнаменту, свежасцю нацыянальнага каларыту ручнікі В. Нікітчык і Р. Неўдах з Галоўчыц, М. Дудко з Зарэчкі, Д. Даўгун з Татар'я, В. Фядчук з Гутава, М. Харытанюк з Імяніна, Г. Бедзянюк з Віроў і іншых. Кожны з ручнікоў не падобны на другі.

Здаўна на Палессі ўмелі вышываць шырокія, святочныя абрусы, посцілкі. І сённяшнія майстры М. Кудрыцкая з Вулькі-Сіманавіцкай, Л. Карнейчык з Завялёўя, В. Кіцель з Дзеткавіч, М. Васільчук са Скібіч пераймалі гэтае ўменне ў сваіх бабулек і матуль. Цешаць вока іх абрусы і посцілкі непаўторнасцю ўзораў і фарбаў. І ў кожным прысутнічае нешта ад характараў саміх майстрых.

А вось арыгінальная ваза і кошыкі. Яны выкананы з дапамогай карункапляцення. Работы гэтыя вызначаюцца асаблівым досціпам і багаццем фантазіі. Іх аўтары А. Мацука і Л. Філанюк. Элементы габелена ўдала выкарыстаны ў пано В. Ляўлюк «Дзяўчына з вёскі Імянін». Звяртаюць увагу багатыя арнаментам самаробныя дываны В. Сілюк з Галоўчыц, М. Пракопчык з Сёманаўшчыны. У экспазіцыі мноства сурвэтак і накідак, вышытых гладдзю і «крыжыкам», плеценых карункамі і інш. Ёсць і спробы жывапісу. Гэта работа «У пушчах Палесся» настаўніка з Дзеткавіч М. Дзеркача.

Выстаўка народнага мастацтва — самая багатая і разнастайная з тых, што адбыліся ў раёне за апошнія гады.

А. САВІЦКІ.

НА БЛАКІТНЫМ ЭКРАНЕ

з 21 па 27 студзеня 1985 года

21 студзеня, 18.30
«ЭЦЮДЫ ПРА У. І. ЛЕНІНА».
Выконвае народны артыст РСФСР А. Усцюжанінаў. Перадача 1-я.

22 студзеня, 18.30
«ЭЦЮДЫ ПРА У. І. ЛЕНІНА».
Выконвае народны артыст РСФСР А. Усцюжанінаў. Перадача 2-я.

22 студзеня, 20.30
ДЗЕННІК УСЕСАЮЗНАГА АГЛЯДУ самадзейнай мастацкай творчасці, прысвечанага 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Магілёўская вобласць.

23 студзеня, 20.10
«РОДНАЕ СЛОВА».
Існаванне нацыянальных моў, развіццё нацыянальных культур вельмі часта залежыць ад гістарычных умоў. У чарговым выпуску расказваецца аб тым, што дала нашаму народу, нашай культуры рэвалюцыя 1905 года.
Затым вы ўбачыце кінарэпартаж з 108-й школы горада Мінска пра традыцыйнае свята беларускага буквара.
Вядзе перадачу кандыдат філалагічных навук Янка Саламевіч.

26 студзеня, 11.45
«СЛОВА — ПАЭЗІІ».
Вы пачуеце вершы В. Ракава.

26 студзеня, 14.50.
РАМАНСЫ РУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ выконваюць салісты Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР Н. Руднева і Н. Кастэнка. У праграме творы Глінкі, Чайкоўскага, Рахманінава.
Музычнае суправаджэнне заслужанай артысткі БССР Л. Максімавай.

26 студзеня, 16.35
«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ».

26 студзеня, 17.20
СПЯВАЕ НАРОДНАЯ АРТЫСТКА БССР І. ШЫКУНОВА.
Прагучаць рамансы рускіх і замежных кампазітараў.

26 студзеня, 18.20
«ТВОРЧЫЯ ПАРТРЭТЫ».
Перадача расказвае аб творчасці народнага мастака БССР В. К. Цвірні. У ёй прымаюць удзел паэтэса Т. Бондар, кампазітар Л. Шлег.

26 студзеня, 20.15
ТЭЛЕВІЗІЙНЫ ФЕСТЫВАЛЬ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦІ. «АД РОДНЫХ НІЎ».
Канцэрт-нарыс пра Казловіцкі народны хор калгаса імя Кірава Слуцкага раёна.

26 студзеня, 23.35
«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».
Музычная праграма з удзелам артыстаў латвійскай эстрады.

27 студзеня, 15.30
КАНЦЭРТ. Вы пачуеце арыі з опер Вердзі, Пучыні, Беліні, Джорджанэ ў выкананні народнага артыста БССР З. Бабія.

27 студзеня, 19.45
«ДНІ ВЫПРАБАВАННЯЎ».
Прэм'ера дакументальнага фільма Беларускага тэлебачання.
Стужка расказвае пра інжынерна-навуковы пошук калектыву вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш».

27 студзеня, 20.15
«ГАЛАСЫ ПАМЯЦІ».
Перадача прысвечана Герою Савецкага Саюза Ф. Ф. Дуброўскаму.

У «КНІГАРНІ ПІСЬМЕННІКА»

ДЗЕНЬ ПАЭЗІІ. 1984. Мн., «Мастацкая літаратура», 1984. — 1 р. 50 к.
Э. МЕЖЭЛАЙЦІС. Чалавек. Вершы. Пераклад з літоўскай. Мн., «Мастацкая літаратура», 1984. — 55 к.
А. КОЖЫН. Літаратурная мова Маскоўскай Русі. На рускай мове. М., «Русский язык», 1984. — 70 к.
Р. ТАРМОЛА. Казкі-падказкі. Мн., «Юнацтва», 1984. — 10 к.
М. ЧАРНЯУСКІ. Зоркі-зорачкі. Вершы і казкі. Мн., «Юнацтва», 1984. — 25 к.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 04031 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела мастацтваў — 33-21-53, аддзела арганізацыйна-масавай работы — 33-19-65, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела інфармацыі—33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Віктар КАВАЛЕНКА, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.